Зок-1
12702

УЗВЫШША

6 05/1533

ЧАСОПІСЬ

ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І КРЫТЫКІ
БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦ-
КАГА ЗГУРТАВАНЬНЯ „УЗВЫШША“

Инв. 1953

№ 1

ЧАЦЬВЁРТЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ

Бібліятэка імя Леніна

МЕНСК—1930

З Ь М Е С Т

Стар

Пролетарскім шляхам 3

Пастанова Беларускага Літаратурна-Мастацкага Згуртаваньня „Узвышша“. 9

К. Чорны—Васпаваты чалавек 12

Пятро Глебка—Арка над акіянам 26

Зьмітрок Бядуля—Нязвычайныя гісторыі 51

Сяргей Дарожны—Суботнік, * * * 61

А. Траецкі—Старасельшчына 63

Т. Кляшторны—Сны 79

Крапіва—Конская элегія 87

А. Кастэлянскі—Сёньняшні дзень выяўленчага мастацтва БССР 91

А. Цітоў—Роман Бузько „Чайка“ 97

Галоўлітбел № 1395. Заг. № 1506. У ліку 1000 экз. Гомель, друкарня „Палесдрук“.

Пролетарскім шляхам

Гэтым нумарам часопісь «Узвышша» распачынае чацьвёрты год свайго існаваньня. Разам з тым гэты нумар зьяўляецца ў пэўнай меры пераломным нумарам, што азначае і пералом у працы ўсяго згуртаваньня. Пералом гэты насьпяваў паступова і адбыўся якраз у гэты момант зусім не выпадкова, а ў цеснай сувязі з праявамі нашага грамадзкага жыцьця, з посьпехамі нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Такім чынам, гэты пералом—зьява зусім законамерная, абумоўленая галоўным чынам дзьвюма асноўнымі прычынамі. Першая—гэта той гістарычны этап, на якім знаходзіцца ў сучасны момант пролетарская рэволюцыя на шляху да соцыялізму, і другая—гэта клясавая прырода саміх сяброў згуртаваньня «Узвышша».

З кожным крокам наперад пролетарскай рэволюцыі шэрагі пролетарыяту ўсё павялічваліся, сьвядомасьць іх узрастала, узмацняўся разам з гэтым і наступ на капіталістычныя элемэнты ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцьця. Пад гэтым напорам пролетарскіх сіл адбываліся зьмены і ў розных іншых групах грамадзтва. У той час, калі асноўная маса сялянства, бядняцкая і серадняцкая яго частка, пашла ў саюзе з пролетарыятам і пад яго кіраўніцтвам, кулацкая яго частка паставілася варожа да пролетарыяту, стараючыся ўсялякімі спосабамі перашкаджаць мерапрыемствам савецкай улады на вёсцы. У той час, калі пераважная большасьць інтэлігенцыі, хоць не бяз хістаньняў у першыя гады рэволюцыі, усё-ж пашла ў ногу з пролетарыятам і сумесна працуе на карысьць пролетарскай гаспадаркі і культуры, другая, праўда, нязначная яе частка падалася ва ўнутраную эміграцыю, або яшчэ горш—стала на шлях сьвядомага шкодніцтва на культурным і гаспадарчым фронце.

Клясавае змаганьне, якое ўпарта вядзецца ўва ўсіх галінах грамадзкага жыцьця, з асаблівай гастратой разгарнулася і на фронце культурным. Клясавы вораг, пазбаўлены магчымасьці адкрыта стаць у бойку з пролетарыятам, карыстаецца ўсялякімі спосабамі, усялякімі шырмамі для абароны сваіх інтарэсаў. На фронце ідэолёгічным гэта змаганьне адбываецца ў надзвычайна складаных формах і патрабуе ад будаўнікоў пролетарскай культуры асаблівай увагі, каб сачыць за кожным крокам клясавага ворага, каб сваячасова даць адпор кожнай яго вылазцы.

Амаль усе сябры літ. згуртаваньня Узвышша (за выключэньнем аднаго—Зьмітрака Бядулі, які рашуча парваў з нашаніўскімі традыцыямі і далучыўся да маладога пакаленьня пісьменьнікаў) вышлі на арэну літаратурнай дзейнасьці пасьля Кастрычніка. Якраз Кастрычнікавая рэволюцыя, якая дала шырокія магчымасьці працоўным масам

выяўляць свае здольнасьці ўва ўсіх галінах творчасьці, і выклікала іх да працы ў галіне літаратуры. Пераважная большасьць іх—выхадцы з бядняцкіх і серадняцкіх слаёў сялянства. Гэта акалічнасьць зьявілася прычынаю таго, што ў самым пачатку свае творчасьці, ці ўжо знаходзячыся ў складзе пісьменьніцкай організацыі (Маладняк), ці яшчэ толькі пробуючы свае сілы (маладзейшыя ўзвышаўцы), сучасныя члены згуртаваньня Узвышша адразу сталі на рэволюцыйны шлях. У іх ня было чаго абараняць у мінулым, іх абурала найменшая спроба каго-б там ні было ідэалізаваць мінулае ў параўнаньні з сучасным, у іх ня было і нашаніўскіх традыцый старэйшага пакаленьня пісьменьнікаў з іх ідэаламі «самастойнай, незалежнай» дзяржавы, з іх імкненьнямі больш назад, як наперад, да часоў Вялікага Княства Літоўскага, з іх ідэалізацыяй «залатога веку» ў разьвіцьці беларускай культуры (часы Скарыны). Вось чаму маладое пакаленьне беларускіх пісьменьнікаў рэзка проціпаставіла сябе нашаніўцам у літ. творчасьці як у галіне тэматыкі, так і ў галіне шуканьня новага стылю. Вось чаму і нашаніўцы, у якіх Кастрычнікавай рэволюцыяй была выбіта глеба з-пад ног, на якой яны раней стаялі, павінны былі на нейкі час змоўкнуць, каб заняцца пераацэнкай каштоўнасьцяй і стаць на новыя савецкія рэйкі. Некаторым з іх гэта ўдалося, аб чым сьведчаць іх апошнія творы.

Аднак непролетарскае пахаджэньне ў асноўнай сваёй масе і новага пакаленьня пісьменьнікаў часта давала сябе адчуваць. Нават у найбольш вытрыманых ідэолёгічна гэта пахаджэньне выявілася ў разрыве ідэолёгіі і псыхолёгіі пісьменьніка, якая (псыхолёгія) не магла за кароткі час ператварыцца ў пролетарскую. Конкрэтна гэта выяўлялася ў тым, што творы, пры сваёй ідэолёгічнай вытрыманасьці, хварэлі часамі хадульнасьцю і рыторычнасьцю. Апрача таго, для пісьменьніка мала аднаго рэволюцыйнага настрою. Для таго, каб дасканала орыентавацца ў падзеях грамадзкага жыцьця, каб правільна адлюстраваць у сваіх творах клясавае змаганьне з пункту погляду пролетарыяту і дапамагчы яму сваёю творчасьцю ў гэтым змаганьні, пісьменьніку абавязкова патрэбна цьвёрда засвоіць асновы марксызму і ленінізму, патрэбна выпрацаваць у сябе марксыцкі сьветапогляд. Непролетарскае пахаджэньне шмат якіх пісьменьнікаў абцяжарвала (і абцяжарвае) ім і гэту задачу. Сьветапогляд гэты выпрацоўваецца, можа, ня так хутка, як бы гэтага хацелася, часта не бяз хістаньняў у бок эклектызму і ідэалізму. А ня досыць цьвёрды і акрэсьлены сьветапогляд зьяўляўся прычынаю таго, што пісьменьнік, проці свайго жаданьня, паддаваўся часамі ўплыву тэй ці іншай варожай пролетарыяту ідэолёгіі. Гэтаму ўплыву падпалі паасобныя сябры ўсіх літаратурных організацый. Часамі гэты уплыў заходзіў так далёка, што пісьменьнікі проста скочваліся да нацыянал-дэмократызму і контррэволюцыі, як гэта было, напр., з А. Дударом (ён-жа Глыбоцкі), і абаранялі свае шкодныя пала-жэньні праз публіцыстычныя і мастацкія свае творы.

Сябры згуртаваньня Узвышша, частка з якіх вышла з Маладняка, ня прышоўшы да згоды ў пытаньні аб мэтадах літаратурнай працы, а частка далучылася пасьля, ня сыходзілі з ранейшай рэволюцыйнай позыцыі, але, працуючы ў дробна-буржуазным абкружэньні, у абставінах абвостранага клясавага змаганьня на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва, пад напорам варожых пролетарыяту сіл, Узвышша дапусьціла шэраг політычных памылак, пра якія мы сёньня гаворым у нашай пастанове. Тут ёсьць і памылкі тэорытычнага характару, якія зьяўляюцца вынікам таго, што асноўныя палажэньні марксызму і ленінізму некаторымі членамі згуртаваньня былі яшчэ не да канца прадуманы і засвоены, і памылкі ў мастацкай творчасьці, якія зьяўляюцца вынікам дробна-буржуазнай, сялянскай хісткай псыхолёгіі таго ці іншага пісьменьніка ў момант ператварэньня гэтай псыхолёгіі ў пролетарскую, і якія таму носяць на сабе адзнакі розных уплываў. Тут мы знойдзем, напрыклад, выпукленьне нацыяналістычнага моманту. Наогул ва Узвышшы нацыянал-дэмократызм, як пэўная прадуманая сыстэма, ня меў месца, ня было на яго сьвядомай установкі і ў паасобных членаў згуртаваньня, але асаблівы націск у артыкулах на нацыянальную форму культуры, не ўпамінаючы пра яе пролетарскі зьмест, роспач з прычыны нібы культурнай і матэрыяльнай беднасьці нашай краіны ды іншыя факты сьведчаць аб тым, што для некаторых сяброў існуе небясьпека з часам стаць на шлях нацыянал-дэмократызму. Тут ёсьць і ўпадніцтва, якое адлюстроўвае настроі тых груп дробнай буржуазіі, што ўпалі ў паніку перад грандыёзнай карцінай соцыялістычнага будаўніцтва, перад яго нячуванымі тэмпамі, альбо тых, якія ня вераць у магчымасьці ажыцьцяўленьня ідэалаў пролетарыяту, у яго сілы і здольнасьці.

Шэраг такіх і падобных памылак былі заўважаны самімі сябрамі згуртаваньня, і гаварылася пра іх унутры згуртаваньня, але перад шырокай грамадзкасьцю яны ня былі выкрыты, у друку пра гэтыя памылкі самімі ўзвышаўцамі не гаварылася. Ня выносіліся яны на суд шырокіх мас грамадзтва, папершае, таму, што гэтым памылкам не надавалася таго прынцыповага значэньня, якое яны сапраўды маюць, не заўважалася політычная сутнасьць гэтых памылак, ня ўлічвалася тое, што кожная з гэтых памылак аддаляла Узвышша ад шляху пролетарскай літаратуры. Шырокай самакрытыкі ва Узвышшы ня было яшчэ і з другой прычыны, якая знаходзілася па-за межамі згуртаваньня. Гэтай прычынай было тое, што частка крытыкі, якою сустрэлі часопісь «Узвышша» у самым пачатку яе існаваньня, ня была сапраўды марксыцкай крытыкай. Паходзіла яна ад некаторых членаў організацыі Полымя, напр., Тодара Глыбоцкага, Жылуновіча ды іх прыхільніка М. Байкова, і была чыста групавай тэндэнцыйнай крытыкай. Мэтаваю ўстаноўкаю гэтай крытыкі было ня выправіць сапраўдныя памылкі Узвышша і тым дапамагчы яму ў цяжкой творчай працы яго, а, чаго-б гэта ні каштавала, скомпрамэтаваць усё згуртаваньне Узвышша цал-

кам і тым самым паставіць пад пагрозу самае існаваньне яго. Для гэтага прыгодны былі ўсякія спосабы, усякія мэтады, абы толькі давесьці тое, што трэба было давесьці. Узвышша з свайго боку лічыла (і лічыла, вядома, няправільна), што, калі гаварыць пра свае памылкі публічна, перад грамадзкасьцю, то гэтым будуць аслабляцца позыцыі Узвышша, і што гэта будзе небясьпечна нават для існаваньня арганізазыі. Адгэтуль і крытычныя артыкулы, якія друкаваліся ва «Узвышшы», мелі часамі аднабокі характар, аднабокі ў тым сэнсе, што ў творах членаў свайго згуртаваньня падкрэсьліваліся і выпукляліся толькі дадатныя моманты і, наадварот, пры разглядзе твораў членаў іншых арганізацый падкрэсьліваліся найбольш адмоўныя моманты. Групоўшчына ў нашай літаратурнай крытыцы існуе і да гэтага часу, ад яе не пазбаўлена ні адна з літаратурных арганізацый, і паколькі яна часта больш перашкаджае, як дапамагае стварэньню пролетарскай літаратуры, дык у самы бліжэйшы час трэба павесьці змаганьне з групоўшчынай, пачынаючы з групоўшчыны ў крытыцы свае арганізацыі.

Зробленыя сябрамі Узвышша памылкі і адсутнасьць шырокай самакрытыкі аж да раскрытыкаваньня гэтых памылак у друку зьвярнулі на сябе ўвагу пролетарскай крытыкі, якая паказвала на памылкі Узвышша і зазначала на небясьпеку, якая праз гэта пагражае ўсяму згуртаваньню.

У Узвышшы, апрача памылак, былі, вядома, і дасягненьні. За тры гады свайго існаваньня Узвышша дало цэлы шэраг выдатных мастацкіх твораў, блізкіх пролетарыяту. Гэтых твораў было куды больш. як твораў памылковых, але зробленыя памылкі ў нашых умовах былі настолькі значныя, што яны засланялі сабою дасягненьні Узвышша. Вось чаму крытыка, не ўспамінаючы нават пра дадатныя творы, увесь час зазначала на памылкі Узвышша, на небясьпеку ад іх для самой арганізацыі і шкоднасьць для грамадзкасьці. Дзякуючы гэтаму ў некаторай часткі грамадзтва стварылася ўражаньне, што згуртаваньне Узвышша зьяўляецца цалкам нездаровым.

Такім чынам, стварыліся тыя ненормальныя ўмовы, пры якіх займацца творчай працай сябрам Узвышша было вельмі цяжка.

А тым часам на парадак дня соцыялістычнага будаўніцтва сталі такія пытаньні, якія асабліва абвастрылі клясавае змаганьне. Тыя тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, якія вызначаны пяцігадовым плянам і якія жыцьцё яшчэ перагнала, паказалі ўсім варожым пролетарыяту сілам, што яны дажываюць апошнія дні. Набліжэньне іх пагібелі асабліва ўзьняло актыўнасьць у змаганьні супроць наступу пролетарыяту. Вядома, што пры такіх умовах ад пісьменьніка патрабуецца асаблівая выразнасьць яго клясавай лініі. Тут ужо мала толькі спачуваць мераприемствам савецкай улады, тут трэба адкрыта і рашуча сказаць, з кім ты і куды ідзеш; калі з пролетарыятам, дык стаць у яго шэрагі і шляхам свае творчасьці актыўна змагацца з ворагамі пролетарыяту.

Гэтыя нашы памылкі падхаплялiся варожымі элемэнтамі і выкарыстоўваліся супроць соцыялістычнага будаўніцтва, пролетарскай культуры і літаратуры.

У момант абвастрэньня клясавага змаганьня, калі рашучы наступ соцыялістычнага будаўніцтва выклікае актывізацыю клясава-варожых сіл і на фронце ідэолёгічным (актывізацыя нацыянал-дэмократаў, як дапаможнікаў польскага фашызму і беларускіх нацыянал-фашыстых, якія рыхтуюць напад на СССР, а ў першую чаргу на БССР, як на форпост СССР)—Узвышша, прааналізаваўшы свой шлях і выявіўшы з дапамогай пролетарскай крытыкі свае памылкі і іхныя карэньні, рашуча асуджае зробленыя памылкі і аддасьць усе сілы, каб узмацніць рады змаганьнікаў за пролетарскую літаратуру, дапамагаючы сваёй зброяй мастацкага слова справе соцыялістычнага будаўніцтва, справе наступу соцыялістычных элемэнтаў на ўсім фронце гэтага будаўніцтва, а разам з гэтым і справе змаганьня за гегемонію пролетарскай літаратуры пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

Выходзячы з гэтага, Узвышша будзе няўхільна выкрываць усіх тых, хто не жадае прымаць удзелу ў соцыялістычным будаўніцтве, і будзе ўпарта змагацца з усімі тымі, хто праводзіць і абараняе шкодныя погляды як унутры згуртаваньня, так і па-за межамі яго.

Адначасна Узвышша лічыць, што ў інтарэсах далейшага пасьпяховага разьвіцьця пролетарскай літаратуры ва ўмовах рэконструкцыйнага пэрыоду патрэбна поўная консолідацыя пролетарскіх сіл літаратуры і крытыкі.

Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаваньне «Узвышша».

12/1—1930 г.

Кузьма Чорны

Васпаваты чалавек

I

Жанчына сышла з трамваю.

Пасьля ўжо Явіч успомніў, што ў тую хвіліну ён бачыў яе ля трамваю. Цяпер гэтая постаць засталася ў вачох, але мінула сьвядомасьць. Дзесьці прапала ў натоўпе, і Явіч, ня думаючы пра яе, ішоў далей.

Звыклы шум яшчэ стаяў у галаве ад вялікага сходу, увачху яшчэ стаялі высокія сьцены, задымленыя пры столі, чорная з жаўтаватым водлівам машынная аліва на жалезных прэнтах і калёсах. Твары блізкіх людзей, уедлівы дзеля памяці твар новага чалавека –новага кіраўніка грамадзка-культурнай работай.

Усё гэта кожнадзённае, блізкае, яшчэ ня вышла з воч, думак і адчуваньняў, пакуль Явіч узышоў на той самы трамвай, з якога зьлезла жанчына і пакуль ехаў праз увесь даўжэзны вулічны рэйс. Пасьля, на драўляной гарадзкой ускраіне, дзе два каміны заводзікаў ледзь дымілі ў неба, дзе ўжо ішла з поля ветравая сьвежасьць, сплывала ўражаньне .

Падыходзіў вечар і трэба было сьпяшацца.

Явіч быў яшчэ гадзін пяць дома, была гаворка пра гэты ад'езд, пра нездароўе маленькай дачушкі, пра блізкую вясну... Пасьля быў ад'езд. Лёгка было і радасна. Анэта наказвала пісаць, а ён гаварыў заўтра-ж зноў выпісаць доктара да малое.

А на вагзале зноў! Жанчына стаяла ля білетнае касы.

Вось цяпер Явіч і ўспомніў, як надвечар, ідучы з разьвітальнага сходу, пакінуўшы за сабою на тры месяцы звыклы штодзённы шум заводу, убачыў гэтую жанчыну, калі яна сыходзіла з трамваю. Цяпер яна як бы ўкалола яго думкі чымсьці далёкім і ўедлівым. Хто гэта? Калі гэта і дзе было штосьці такое, што гэтак трывожыць цяпер? З чым гэта ўсё зьвязана?

Цягнік прыпыняўся на станцыях на дзьве ці на тры хвіліны, толькі пад дзень ужо на вялікай станцыі стаяў ён хвілін дваццаць. Тады Явіч вышаў у буфэт і зноў убачыў яе. Яна несла з буфэту на столік шклянку моцнай гарбаты. Явіч у буфэт не пайшоў, а стаяў колькі хвілін ля дзьвярэй, гледзячы на яе твар. Адзета яна была звыкла дзеля яго. Гэтак адзяецца Анэта. Падрапаная за доўгі час скураная жыкетка на футры, чорны шаль, гаматно накручаны на галаву і шыю. Яна здавалася задумёнаю, доўга мяшала лыжачкаю гарбату, гледзячы кудысьці ўніз навылёт шклянкі. Што гэта ў гэтым твары? Твар як бы да таго пра штосьці гаворыць, што аж пакутная трывога апаноўвае

чалавекам! І гэтая напорнасьць думкі, жаданьне ўспомніць перавыша-ла ўсё—санлівасьць змрочнага вагону, рух кустоў за вокнамі, сьві-таньне ў далекім ад роднага гораду полі. Нейкая гармонія складалася ў чалавеку. Жаданьне ўспомніць, жанчына, гэтае поле з рухавымі гаямі і хмызьнякамі, з ўзгоркамі і лагчынамі—зьлівалася ў адно, выростала і рабілася вялікім і важнейшым ад усяго.

Явіч успомніў, што на некалькі момантаў падобнае было з ім, калі колькі дзён таму на завод зяьвіўся новы кіраўнік грамадзка-культурнаю часткаю. Спаткаўшыся першы раз тут, яны ад нечака-насьці падаліся на крок назад адзін ад аднаго, пасьля той, крыху зьбянтэжыўшыся, працягнуў руку:

— Ты тут? Працуеш? Даўно ты тут?

— Дзе тут?

— Ну, тут, у гэтым горадзе, на гэтым заводзе?

— З самага канца вайны.

— А-га... А я, бачыш, да вас. З другое акругі перакінулі...

Пасьля таго яны яшчэ сказалі колькі слоў. Гаварыць ім было ня-спрытна, яны тут-жа разьвіталіся. І кожны дзень, спатыкаючыся на працы, віталіся, рабілі выгляд, што кожны вельмі заняты, на гаворку няма часу. Гэта нават пачало рабіцца ўжо звыклым, хоць ненармаль-ным. І мучыла Явіча.

Але спаткаўшыся з ім, Явіч не ўспамінаў. Чалавек быў гэтакі знаёмы, гэтак яго Явіч ведаў, што разам з ім адразу-ж цэлыя фанта-смагорыі адмысловага сьвету паўсталі ў ім. Тое, што было, што мінула і што засталося навек.

Хмурны дзень у чыстым полі. Восень. Меркнуць лясы. Вісіць смуга над зямлей. Неба—поўна самоты і цішыні. Яно споўзвае ў даля-чынь. Праз яго цэдзяцца ясноты далёкага сонца. А лясы! Яны пакале-чаныя і змагаюцца з сьмерцю. Выкарчаваныя парахавымі і дынаміта-вымі ўзрывамі, дрэвы корчацца над сваімі ямамі. Лясы застаюцца ў страшэнным калецтве паволі залечваць свае раны. А зямля! Скрываў-леная, здрасованая, яна маўчыць. Але мо' ўсяго дзень прайшоў ад вялікага штурму, а ўжо відаць: яшчэ колькі дзён і кроў пачне заро-стаць травою.

Каля лесу курацца галавешкі ад мужычых хат. Нават панскія палацы за лесам падрапаны, нават сьцяна адна ў іх ушчэнт рассыпа-лася. І тут, у гэтым разбураньні! Яму ня важна што ён увесь у зямлі, у закарэлых дзіравых лахманох. Ён ня ведае, што твару ў яго няма, а ёсьць пакута, а ў гэтай пакуце гараць два агні. Яны аглядаюць даро-гу і даўно ўжо (сьвет зжываў сябе, і вякі праходзілі туту хвіліну) спа-нялела ў іх усялякая думка пра сьмерць. У крывавай траве кіпіць ужо жыцьцё, ужо сокі зямлі зноў твораць расцьвітаньне. У гэтай жудаснай

цішы чалавек жыве! Ён чуе адно тупое тузаньне болі ў плячы і адзін у гэтым ціхім утрапеньні паўзе. Чалавек поўз, адпачываў, шукаў дарогі. Плячо не давала яму ўзьняцца на ногі. Пасьля яго напаткалі людзі—свае ці чужыя—але ён быў рад ім. Можа гэта і сьмерць, бо так туманіцца пачала галава і—дзіўна!—разам з тым такая яснасьць думкі. Прагнасьць жа жыць фарбавала ў ружовыя колеры калецтва зямлі і самотнасьць неба.

Сапраўды кроў зарасла травою і па ёй ляглі даўно ўжо рэйкі для новага экспрэсу гісторыі. Цяпер гэта мінулы сьвет, а тады думкі ня былі гэтакія ясныя, як цяпер пра гэта.

Ішла ноч. Абясьсілены чалавек, лежачы на прыемным холадзе зямлі, заўважыў над сабою васпаваты твар.

— Няжывы,—сказаў ён сам сабе ціха,—вочы расплюшчаны і ашклянелі.

І засьвістаў чалавек ціха, сьвістаў дзеля разрыўкі, дзеля нейкае свае ўпэўненасьці. Толькі вочы ў неспакоі бегалі па зямлі, па траве, купаліся ў далячыні зямнога спустошаньня. Сьвіст яго быў адмысловы, ціхі, сухі, кароткі.

Вось калі новы чалавек зьявіўся на завод і падаў Явічу руку, калі яны пазналі адзін аднаго—як адзін ляжаў на зямлі, а другі стаяў над ім—Явіч успомніў гэты сьвіст тае хвіліны. Васпаваты твар праходзіць рыса застыласьці. Ужо ўночы, калі на небе радасна гарэлі зоры і ажылі ночныя птушкі, Явіч прачнуўся. Плячо ныла, боль сьцішылася. Явіч першы раз, пасьля ўчарашняе параненасьці, узвалокся на ногі. Ціхутка, роўна льга было йсьці. І ён пашоў па тэй зямлі, якая праз усе стагодзьдзі залечвала ўсё свае раны ад сутычак народаў, па якой праяжджалі імпэратары на белых конях, прымаючы хвалу: «Віват імпэратар!». Шмат сьлядоў загладзіла зямля на сабе. Салдаты якое імпэрыі не клялі гэтую гэтакую далёкую ад радзімы зямлю, па якой гэтак цяжка йсьці і выцягаць з яе свае цяжкія салдацкія боты?!

Разьбітыя гарматамі панскія палацы бялелі за лесам як здань. Дым з пажарышча слаўся нізка над зямлёю—датлявалі мужычыя хаты. Наводдалек-ж ад пажарышча, на пакалечаным узьлеску, захавалася штосьці цэлае: у белым змроку стаяла чалавечая ўтульнасьць. «Нікога там няма»—думаў Явіч і слабець пачаў за брамаю. Але на ганак ён узышоў. Прысесьці яму было цяжка. Ноч была глыбокая і цішыня навокал была жудасная.

Як стаяў прыпершыся здаровым плячом да вушака, здалося яму, што дзесьці гавораць. Гэта была радасьць—чалавечы голас.

Пасьля ён успамінаў, што як прачнуўся ён—была раніца, было сонца і навокал жыцьцё. Хтосьці дзесьці выразна гаварыў і пасьля зноў той самы!

— Вас моцна ранілі,—сказаў чалавек, увайходзячы ў цёмную клець.

Твар у яго быў гэтакі знаёмы—гэта-ж ён учора нагінаўся над Явічам у полі.

— Я вас бачыў учора на полі,—гаварыў усё чалавек.

— Што тут робіцца?

— Як? Дзе?

— Дзе фронт, дзе палякі, дзе нашы?

— Я думаў, што вы няжывы, калі глядзеў на вас учора,—сказаў чалавек з жорсткім спакоем.

Губы яго толькі зьлёгку задрыжалі.

— Слухайце...

— Ах, вы пра фронт?.. Нашы адступілі, мы на польскай тэрыторыі.

Явіч узьняў галаву, кінуўся назад—страшна ад гэтага руху тузанулася боль у плячо.

— Чаго вы,—страшна ўсьміхнуўся чалавек,—вы баіцеся?.. Вы хіба комуністы? Гаварэце сьмела ўсё, мяне можаце не баяцца: я такі-ж самы, як і вы, палонны, толькі я здаровы, а вы паранены.

Явіч успомніў: учора на полі ён быў у дрэнным чырвонаармейскім шыняльцу. Шынялец быў распораны ўнізе па ўсіх швох, вывалены ў зямлі. Цяпер паверх чырвонаармейскага абмундыраваньня, зношанага ў паходах, на ім быў пацёрты аксамітавы фрэнч.

— Вам цяжка гаварыць, ці вы ня хочаце? Тут пуста, але я думаю, зараз тут зьявяцца людзі. Можа варочацца ўцекачы пачнуць, хто астаўся жывы. Пэўна, улада хутка явіцца... Вы баіцеся?

— Мне страшна рана баліць.

— Явяцца людзі і палечаць... Вы з якой часьці?

— Дзе мы знаходзімся?.. Тут гэта бой быў?

— Тут самы цэнтр быў бою. На шмат верст толькі, мусіць, і засталіся два гэтыя хутарцы... Дык што вы думаеце цяпер рабіць?

— Явіч нічога не казаў.

— Самае важнае—ня бойцеся. Мы на тэй тэрыторыі, дзе большая сіла. Я думаю, што фронт ужо далёка: нічога нідзе ня чуваць. Польская артылерыя яшчэ ўчора мінула гэтае месца, далёка ўжо, мусіць, увагнала ўпярод. Бальшавікі пашлі назад. Вам няпрыемна?

І памаўчаўшы:

— Хоць прыемна хоць не, але нічога ня зробіш. Ня ўдалося, відаць. Я не стратэг, але думаю, што палякі цяпер выгралі. А там—і ўнутры Расіі—непарадкі. Голад і холад яшчэ большыя будуць.

— Ну, дык што?

— Я і сам ня ведаю, што. Я застаўся з бою, змучыўся я.

Ён чуць зьбянтэжыўся з сваіх слоў, здалося Явічу,—нават пачырванеў крыху.

-- Мяне кантузіла, прысыпала зямлёю,—паправіўся ён.

Але зьбянтэжанасьць яго была яшчэ колькі хвілін. Ён задуменна пастаяў крыху над Явічам, пасьля засьвістаў знаёмым ужо Явічу сьвістамі, ні слова ня кажучы, выйшаў. Явіч застаўся ляжаць адзін на саломе. „Хто мяне палажыў сюды?“—думаў ён. Нейкі страх быў у яго ад таго, што васпаваты чалавек можа зноў прыйсьці сюды. Яго мучыў голад, яму страшна хацелася піць, яму хацелася быць цяпер на сонцы, у спакоі, у пэўнасьці. Страшна балела плячо. „Мусіць, так зайдуся ад раны і голаду“,—думаў ён.

Васпаваты чалавек зноў прышоў. Ён прынёс у салдацкім кацялку есьці.

— Я тут як за гаспадара якога,—усьміхнуўся ён.

— Тут нікога няма з гаспадароў?

— Ёсьць тут...

— Хто... Гаспадарская сям'я засталася?

— Ежце,—сказаў васпаваты чалавек.

Явіч папрасіў вады, і той прынёс. Ён карміў і паіў Явіча. Явіч аслабеў, сілкуючыся.

Явіч зноў пакутаваў у гарачцы і няпрытомнасьці. За дзень ён колькі разоў прыходзіў да памяці. А паўдні сонца, праз малюсенькае вакенца, засьвяціла яму ў твар. Трывога яго й боль узьняліся больш. Надвечар у клець увайшла жанчына.

— Гэта вы?.. слухайце... гэта вы мяне палажылі тут?

— Я, з вашым таварышам.

— З якім?

— А ён-жа даглядае вас тут.

— Таварыш?..

— Але...

— Вы гаспадыня?

— Цяпер як-бы гаспадыня. Адна я тут.

Явіч гаварыў з пакутаю, але ён шукаў пэўнасьці.

— Гэта ваш хутар?

Жанчына адказала не адразу. Яна маўчала, плакала, глядзела Явічу рану. Гаварыла нясьмела, недаверліва, але Явіч адразу пачуў яе забітасьць, жудаснасьць тут, страх, сіроцтва, шуканьне жывога чалавека.

„Яна адна. На багатым хутары ў далёкага дзядзькі яна была як за наймічку. Бацька забіты яшчэ на ранейшай імпэрыялістычнай вайне. Маці даўно памёрла. І нічога пасьля рамесьніка бацькі не засталося. Багатага дзядзьку-хутаранца, тутэйшага гаспадара, пазаўчора гарматны набой зьмяшаў з зямлёю“.

— Вунь там, за грушаю, ня ўсьпеў у пограб ускочыць,—паказала яна праз вузенькае вакенца.—Ён не хацеў хутара кідаць, чакаў, што навала пройдзе, і дабро ўпільнуе.

Яна плакала ціха і доўга:

— Божа мой, божа, я адна.

Яна была маладая.

— Можа, я памру,—сказаў Явіч,—дык я прашу вас: дастаньце ў мяне з кішэні ў канвэрце ліст, там мой адрас дадому. Калі ўсё мінецца, хоць праз колькі год, напішаце, як і дзе я памёр.

— Я няпісьменная,—сказала яна.

Цёмная і забітая была гэтая дзяўчына.

Дапамога прышла нечакана. Назаўтра зямля навокал пачала ажыўляцца. Варочаліся людзі. На хутар прыгналі раненых палонных, мо‘ нават з гэтага самага поля. У хаце, сенцах і клеці зрабіўся шпіталь палонных. Васпаваты чалавек з паўдня пахадзіў на хутары, пасьля зьнік.

Б 01/1533

— Вашага таварыша забралі,—сказала дзяўчына Явічу.—Пагналі ў горад, дзе ўсе палонныя, каторыя здаровыя.

— Якога таварыша?

Явіч чуў сябе лепш. Павязкі ляжалі на ране. Боль утаймавалася. Кулю доктар дастаў.

— А ён-жа ўсё казаў, што вы яго таварыш, што вы разам служылі, што вы ведаеце добра адзін аднаго.

Явіч нічога не адказаў.

Але праз колькі часу, дзён, мо‘, праз два, васпаваты чалавек зьявіўся назад на хутар.

— Пусьцілі на работу, пад нагляд,—сказаў ён.

І ўзрадаваўся:

— Фронт далёка!

Ён колькі разоў спачатку падыходзіў да Явіча, пасьля пакінуў. Знаёмства спынілася.

Колькі палонных памёрла. Явіч ачуньваў. Васпаваты чалавек пачынаў хадзіць па хутары як гаспадар. Явіч пачаў зауважаць: яны гаспадарылі разам з гаспадыняю, кудысьці ён пачаў езьдзіць, і гаспадыня больш не падыходзіла да Явіча.

Але аднойчы чалавек выказаў страшэнны непакой. Явіч чуў, як ён пасьвіставў ходзячы, прыглядаўся да людзей. Ён як бы пачуў што трывожнае. У той-жа дзень зноў загулі першыя гарматы.

— Фронт ідзе,—радасна зашапталі палонныя.

Але наступныя дні больш ня радавалі іх. Фронт ці спыніўся, ці адышоў назад зноў. Васпаваты чалавек паспакайнеў.

Гэта было тады, калі фронт трымаўся блізка, але невядома было, куды ён пойдзе.

Явіч быў у змове; палонныя рыхтаваліся ўцякаць. Васпаваты, нядаўны чырвонаармеец, быў у іх на хутары гаспадаром, і гэты гаспадар падслухаў і выкрыў змову. Явіча пагналі з хутара разам з усімі. Тады ён ачуньваў добра, і думкі пра ўцекі не пакідалі яго. Але

ўсё адбылося само сабою. Калі фронт рушыў зноў у глыб тэрыторыі, што была пад палякамі, палонных ня ўсьпелі адвесьці. Быў прарыў фронту, быў пярэпалах. І зноў Явіч пайшоў ваяваць. Тады ён яшчэ раз спаткаўся з васпаватым чалавекам. Ён зноў быў у чырвонаармейскім шыняльцу і, калі фармавалі нядаўных палонных у роту, загаварыў з Явічам:

— А я думаў—палякі верх бяруць. Памятаеце, як я вас кармiў параненага.

— Памятаю.

— Я не стратэг. Я тады казаў сам.

— Каб вы былі стратэгам, вы ня выкрылі-б змовы.

Чалавек пабялеў:

— Не, ня я. Што мне з таго было-б? Вы падумайце.

Аднак, палонныя заўважылі нядаўнага гаспадара з хутару. Явічу пасьля пісалі некаторыя з іх, што папалі ў адну часьць з васпаватым, што яго будуць судзіць. Да яго прыяжджала разьвітацца жонка—дзяўчына з хутару, плакала, нудзела,—так пісалі Явічу.

II.

Явіч цяпер ня мог спаць у вагоне. Мучыла яго страшэнная ўзбуджанасьць: чаму гэта незнаёмая і разам з тым гэтакая знаёмая жанчына вярнула яго думкі да васпаватага чалавека? Гэта яна з таго далёкага часу, з таго жудаснага поля, з таго хутару?!

Явіч некалькі пралётаў стаяў усё ля вакна, чакаючы вялікае станцыі, а на ёй вышаў шукаць жанчыны. Ён зноў нашоў яе на станцыі.

Цяпер ён бачыў—гэта яна. Ён адразу пайшоў да яе. Ад яе зірку павеяла на яго тым далёкім.

— Вы родам з...

Ён назваў тую мясцовасьць.

Твар яе гэтак дзіўна стаў ясным:

— Хто вы? Як-жа вы ведаеце?

— Значыцца, вы адтуль?

Яна зьдзівілася, захвалявалася, разглядала яго.

— У мяне было плячо ранена, як вы адны былі засталіся там. Вашага дзядзьку тады...

Яна маўчала, шырока раскрыўшы вочы.

— Я тады прасіў вас, калі памру, напісаць пра мяне маім...

— Штосьці ўспамінаецца мне,—сказала яна.—Я тады ліст ваш ўзяла дзеля адрасу, а сама пісаць ня ўмела... Так вы пасьля таго і зьніклі былі.

Яна хвалявалася, чагосьці трывожылася:

— Якая сустрэча!.. Ліст той ваш захаваўся ў мяне, дзесьці ляжыць дома.

— Дзе-ж ваш дом цяпер?

— У N.

— Я непадалёку буду там, тры месяцы...

Яна хоць і гаварыла спакойна:

— Дык заедзьце да мяне, вось вам я напішу свой адрас цяпер,— але Явіч бачыў: яна толькі стараецца разагнаць сваю трывогу і не ўдаецца ёй.

— Вы едзеце адтуль, адкуль і я... Я цяпер прыпамінаю, як днём бачыў вас ля трамваю, тады ўжо я хацеў пазнаць вас...

— Я была там.

Ідучы ўжо ў вагон поплеч з ім, яна дзіўна ўсьміхнулася:

— Я да мужа езьдзіла.

Пасьля паправілася яшчэ з больш дзіўнаю ўсьмешкаю:

— Да былога мужа... Калі так, можа, і яго ўспамінаеце. Васпаватага свайго таварыша помніце?

— Вы і тады на хутары называлі яго мне маім таварышам.

— А хіба не?

— Не. Я толькі першы раз ўбачыў яго, лежачы на зямлі, як ён хадзіў па полі.

— Шукаў хутару?—засьмяялася яна.

Явіч не распытваў пра ўсё. Толькі чуў ён, што можа цяпер сьмела запытаць:

— Яго-ж судзілі тады.

— Не.

— А мне пісалі.

— Апраўдалі. Ніхто не давёў выразна. Недаведзенае абвінавачваньне!

Цяжкая, як зямля, навала думак, зусім новых, заварушылася ў Явіча. Жанчыне ён не сказаў, што зноў сустрэўся з васпаватым чалавекам.

Тры тыдні Явіч ня ведаў адпачынку.

Цягнік тады прыйшоў быў да апошняе яго станцыі апаўдні. Жанчына ехала далей яшчэ, да наступнага паўстанку. Явіч падыйшоў да вакна яе разьвітацца. Яна чакала там яго задумённым зіркам сваім.

Была глуш. Явіч ехаў яшчэ вёрст сорак коньмі.

— Вы-ж заедзеце?—сказала на разьвітаньні жанчына.

— Хіба ніяк ня трапіцца.

Колькі часу яшчэ Явіч упарта, супроць волі свае, думаў пра дзіўнае спатканьне сёньня, пра дзіўныя нечаканасьці ў гэтыя дні. Але неўзабаве ня гэтакімі вострымі сталі адчуваньні ўсяго гэтага.

Глуш жыла.

Былі тут новыя знаёмствы. Явічу здавалася, што гэта ўсё старыя яго знаёмыя, блізкія людзі. За тры тыдні ён аб'ехаў шмат вёсак,

напісаў колькі лістоў дадому, прыходзілі да яго адтуль лісты, ён пасьвяжэў за гэты час, ускалыхнуўся. Ён чуў на сабе радасныя подыхі блізкае вясны ў палёх. Веяла тут на яго далёкім маленствам, калі ён гадаваўся сярод гэтакіх прастораў. Штосьці будзілася ў ім няяснае, далёкае і блізкае, адчуваньні сваіх дзіцячых дзён; усё, што драмала недзе глыбока ў ім.

Але гэта былі хвіліны.

Больш за ўсё было радаснага кіпучага клопату, новых сустрэч, гаворак.

Першыя гэтыя тры тыдні ён больш трох дзён не заседжваўся ў адным месцы. Спаткаўся раз быў з сваімі таварышамі, з свайго-ж заводу. Была як бы ненаўмысная гаворка пра новага васпаватага кіраўніка на заводзе, але ўсё-ж цяпер было не да гэтага.

У канцы трэцяга тыдню Явіч напісаў знаёмай жанчыне пару слоў пра тое, што мусіць неўзабаве давядзецца яму быць там. Ён чакаў гэтае сустрэчы, чулася яму, што ўсё гэта павінна нешта высьветліць, давесьці да пэўнасьці нават тыя трывогі, тую, можа, як ён сам называў, хваравітасьць, сьляды якое палажылі на яго ўсе гэтыя крывавыя жудасьці парахавога дыму, крывавага поля, мёртвае адзіноты спустошанае зямлі. Была там ня толькі параненасьць у плячо, мог быць там зранены ўвесь чалавек—і думкі і сэрца. Гэта каб чалавек быў мякчэйшым.

У самым страшным агні быў тады заўсёды Явіч.

Праяжджаючы, Явіч спыніўся на тым паўстанку—таварны цягнік стаяў на пераезьдзе. Явіч зьлез з саней, прайшоўся паўз вагоны.

Зіма дажывала апошнія дні свае. Навокал было поле, сьнег макрэў, хоць бялеў яшчэ скрозь, не зачэплены сонцам. Дыхала прастора воляю, ветраваю сьвежасьцю. Сінеў лес на ўзгорку, далягляд навісаў тонкаю празрыстасьцю.

Явіч, ходзячы паўз вагоны, чуў лёгкасьць, прыемнасьць ад гэтага кароткага адпачынку пасьля няўпыннай дзейнасьці.

Шмат было на паўстанку людзей. Явіч за гэты час меў тут ужо шмат знаёмых і прыглядаўся, каб спаткаць дзе знаёмы твар. Ён думаў спаткаць тут каго-небудзь з тых шматлікіх знаёмых, знаёмства з якімі было хвіліннае, дзе-небудзь на сходзе, калі на яго насядаюць сталыя сабе людзі з баязьліваю, але моцнаю, хітраватаю ўсьмешкаю на губах, праз якую сьвіціцца нянавісьць — скажа раптам слова хто-небудзь, дагэтуль, здаецца, спакойны, маўклівы дзесьці ў кутку сваім. Спагадны бляск вачэй акіне Явіча, і чалавек падыдзе бліжэй. От ён скажа другое слова, загаворыць яшчэ, а там не адзін голас чуваць. Таварышы, што сядзяць з Явічам за сталом, радасна глянуць на Явіча, як бы хочучы паведаміць яму тое, што ён ужо з уцехаю бачыць:

— Нашы пачынаюць.

Твараў гэтакіх шмат у Явічавай памяці. Пры спатканьні хто-небудзь з гэтых людзей часам падыдзе сказаць пару так сабе нявінных

слоў, блізкіх і Явічу. Часам так чалавек пройдзе, спаткаўшыся, але гляне ветліва. Шмат гэтых твараў зьлілося перад Явічам у штосьці добрае, што радуе, і дзеля чаго варта турбавацца, ня спаць, часта ня мець спакою ў радаснай дзейнасьці.

Але нікога на паўстанку знаёмага ня бачыў Явіч.

Поезд пашоў, і ён ужо хацеў садзіцца ў сані, ехаць далей, як раптам прыгорбленая крыху постаць зацікавіла яго. Ня было ў ёй нічога нязвычайнага, проста высокі чалавек у бравэрцы, пацягненай вышмальцаваным кортам.

Хто гэта? На якім з сходаў, гэтых бурных сялянскіх паводак, быў гэты чалавек?

Твар яго ўбачыў Явіч у профіль.

Твар быў востры, не малады, нэрвовы.

Явіч рушыў ужо ў дарогу, як чалавек прывітальным махам рукі спыніў яго. Явіч папрасіў свайго фурманшчыка пачакаць чалавека.

Той працягнуў Явічу руку:

— Я вас пазнаў.

— Я вас дзесьці бачыў, усё думаю, дзе.

— А на тым тыдні ў...

Ён назваў вёску

— ...Сход я праводзіў, і вы пасьля прыехалі.

Явіч пазнаў яго. Настаўнік адтуль, куды цяпер едзе ён!

— Пехатою іду, як бачыце.

— Адкуль?

— Справы ўсё. А вы куды?

— Садзецеся разам са мною.

— Я-то сяду, але думаў, дагоніць мяне наша сельсавецкая працаўніца. Я яе чакаў на паўстанку, адбылі пашоў... нагоніць, думаю.

Колькі хвілін маўчалі.

— Яна ў нас дзіўная.

— Хто?

— А от што я гаварыў, сельсаветчыца.

— Явіча цюкнула. Ён стаў распытваць.

Яна самая!

— Яна адна жыве?

— З сынам, год дзесяць хлапцу.

— Даўно яна ў вас?

— Колькі год ужо

— А муж яе?

Явіч запытаўся незнарок.

— Прыехала яна сюды адна была, з хлапчуком. Страшэнна змучаная была... гады тады галодныя былі. Забітая была, цёмная... Муж у войску — гаварыла.

— А пасьля?

Явіча зноў агортала дзіўная трывога.

— А пасьля і ён прыяжджаў, толькі не армеец быў.

— Ён быў і армейцам, я ведаю.

— Вы ведаеце, яго?

— Яго.

— Сапраўды ён армеец быў?

— Быў.

— Вы добра ведаеце?

— Я з ім спаткаўся на вайне быў.

— А пра яе?...

— І пра яе.

— Што?

— І яна адтуль.

— Адкуль?

— З вайны.

— Як?

— От толькі цяпер і я сам пачынаю разумець, здагадвацца, чаму гэтак рабіў ён.

— Як жа яна, з вайны, вы кажаце?..

— На багатым хутары яна адна засталася была...

— Так, так.

— Гаспадар не ўсьцярогся і згінуў, а яна, далёкая сваячка, засталася на польскай тэрыторыі адна за поўную гаспадыню.

— Далёкая сваячка, за парабчанку была, раптам робіцца за гаспадыню.

— Выходзіць так.

— І хутар заставаўся ёй у спадчыну.

— Здаецца, так.

— Вы, як кажуць, льляце сьвятло на гэтую справу.

— А ён тут як прыяжджаў сюды?

— Да яе.

— Але?

— Як муж... але...

— Ненадоўга, вы хочаце сказаць.

— Ненадоўга.

— А як-жа ўсё адбылося?

— За штосьці яго меліся судзіць, справа нейкая была за ім, пакуль яна цягнулася, работы ня меў, ня было дзе дзецца, дык...

— Па тэй справе яго даўно, тады-ж яшчэ, апраўдалі, не даведзена было, я чуў.

— Гэта так, але пасьля пачалі нанава, мусіць, матар'ял новы быў.

— А гэта не яна падавала новы той матар'ял?

— Яна-ж калі прыехала сюды, вестак пра яго ніякіх ня мела, анічога ня ведала. Ён прыехаў неспадзявана, як яна пачала ўжо чалавекам рабіцца. Я гавару „чалавекам“ у пэўным сэнсе.

— Разумею.

— Як яна ўжо даслужвала за парабчанку апошнія, можна сказаць, дні.

— Але-ж ён, як-жа мог ведаць пра гэта?

— А ён адразу не зьявіўся. Гэта дык я ўжо ведаю. Ён пааціраўся так раней у гэтай мясцовасьці.

— А як жа ён знайшоў яе тут?

— Знайшоў-жа нейк, шукаць, відаць, што яму трэба, умее, цяпер гэта ясна ўсё становіцца.

— Значыцца, і другі раз з справы ён чыстым вышаў?

— Выходзіць, што так.

— Доўга-ж ён тут быў?

— Не. Мала пабыў тут.

— Што-ж, разышліся яны цяпер зусім?

— А пэўна-ж.

— А я, тыдняў тры таму, ехаў з ёю разам у цягніку, дык яна гаварыла, што ад яго едзе. Можа жартавала?

— А мусіць такі ад яго.

— Як-жа так?

— Ну, ня зусім ад яго, але адтуль. Яна нядаўна з жаночага зьезду вярнулася. Ну, пэўна ён, калі ведаў, пастараўся бачыцца з ёю. Ён цяпер ніжэй травы, мусіць, перад ёю.

— Чаму?

— Яна справу пачала цяпер сама.

— Сямейную, іхнюю?

— Усё-ж тую, кажуць.

— Трэйці раз?

— Але.

— Вы гэтую справу ведаеце?

— Не.

— А я-ж ведаю.

Явіч расказаў пра змову палонных.

— ...На польскай тэрыторыі ён мог застацца ненаўмысьля, хоць усё гэта наводзіць на пэўныя думкі. Але як убачыў, што льга сабе добрую аселасьць зрабіць, што гэтакі залаты выпадак, дык—усё тут ляснула.

— Вы яго, цікава, ведалі да таго спатканьня?

— Ля хутару, на полі?

— Але.

— Не.

— Гэта я да таго пытаю, што ён, здаецца мне, павінен быў-бы здавацца з выгляду калі ня вельмі заядлым рэволюцыянэрам, дык прынамсі, як такія самі кажуць, так сказаць, лёяльным. „Гэта надзейная шырма дзеля некаторых“.

— Так, спатыкаў і я гэтакіх.

— Адзін час, ён у нас, як жыў яшчэ тут, вельмі прамоўцам вытрыманым выдаваўся быць.

— Пачынаў актыўнічаць?..

— Але... Гэтакаму сьмяцьцю ўсё адно ў які бок ісьці, каго хочаш і што хочаш прадаваць, абы цана добрая была. Адкуль мацнейшы вецер падзьме, у той бок ён і падаецца. Гэта ня тое што—несьвядомасьць чалавечая. Не. Тут пэўная якраз і ёсьць сьвядомасьць. Рэволюцыйная актыўнасьць гэтакага чалавека малую цану мае. Тую самую справу, да якое гэтакі актыўнік заклікае ўсіх, ён ува ўсякі зручны выпадак прадасьць. Гэта не раўня хоць-бы сабе інталігенту ці селяніну, што хістаецца, пакуль да канца дойдзе, пакуль стане дзейным. Той у большасьці будзе цьвёрдым, бо ён дайшоў да гэгага, перамогшы самога сябе. А гэты які быў, гэтакі-ж застаўся. Ён адным махам прыняў тое і заўсёды прыймае, што нават часта спрадвеку чужое яму Ён дзе хочаш будзе табе і кім хочаш будзе заўсёды, абы добра было яму аднаму.

— Да лепшага жыцьця імкнецца,—усьміхнуўся Явіч.

— Але.

Настаўнік змоўк.

— Дык яна ў вас сельсаветчыца?

— Самая выдатная ў нас тут працаўніца. Што-ж, парабкоўскае гора ведае.

Так прагаварылі да канца дарогі.

Перад імі зачарнела вёска.

Явіч убачыў яе толькі назаўтра. Як старога знаёмага, што ведае якуюсьці таемнасьць у яе жыцьці, спаткала, яна яго.

—Учора прыехалі?—зьдзівілася яна,—дзе начавалі?

— У настаўніка.

Явіч убачыў яе сына.

— У твары ёсьць штосьці бацькаўскае. Праўда?—усьміхнулася яна.

— Ёсьць.

— Спадчыннасьці ня будзе!

Яна зноў усьміхнулася.

— Я ў гэтым пэўна.

Явіч зьдзівіўся перамене ў ёй. Ня тое, што яна можа й зашмат пастарэла за гэтыя год дзесяць, а зусім ўся іншая стала.

Яна сама гаварыла:

— Дзесяць год гэтыя—вялікімі гадамі былі для мяне. Я жыла, перажывала ўсё, уведвала ўсё, расла, вучылася...

„Зрабіць сабе сваё гняздо, жыць, баронячы сябе ад усяго. Вайна—няшчасьце, навала, ад якое няхай сабе хто хоча умірае, а хто здолее—выратуецца, топячы другіх сабе подобных“...

— Вось ён, ня толькі ратаваўся, але й зарабіць на гэтым намагаўся. Вайна занесла яго ў добрую мясьціну... А я верыла яму ўва ўсім... Гэтак і я тады думала і жыла, пакуль не дайшла ўсяго...

Зноў яна ўсьміхнулася, успомніўшы:

— Таварыш ваш!. помніце, год дзесять таму на хутары, пасьля бою?

І памаўчаўшы:

— Гэта-ж ня тое толькі, што тады з змоваю палонных. Я ведаю пазьнейшае: звольніў са службы свайго былога таварыша, што ведаў яшчэ нейкія яго справы. пасьля і яшчэ... Я сама цяпер усю справу узьняла нанова, няхай усё зьбіраецца ў адно і як ён са мною абышоўся! Я з нявольніцы стала чалавекам.

Явічу ня было калі заседжвацца тут. У той-жа дзень ён выехаў.

III.

Кроў на зямлі даўно пазарастала травою і ўраджаямі. З часоў апошняе вайны праз колькі летаў ужо цьвілі тут засевы, дзе калісьці (згубіцца ў тумане вякоў!) імпэратары прымалі „віват", дзе Явіч прайходзіў з вінтоўкаю, дзе й васпаваты чалавек хадзіў, стрыгучы вачыма прасторы ..

Прытаміўшыся, варочаўся Явіч з вёскі, з свае грамадзкае работы, з свае трохмесячнае камандыроўкі.

Перад гэтым ён атрымаў ад таварыша ліст.

„...Першая брыгада з вёскі ўжо вярнулася. Чакаем вас... На тым тыдні паставілі і пусьцілі новую машыну... Вытворчасьць у нас за гэтыя месяцы павялічылася... Зайходзіў я да тваіх... Яшчэ—кіраўнік ударнае брыгады цяпер у нас"... (было напісана прозьвішча васпаватага чалавека).

Перад ад'ездам Явіч адпісаў.

„...Я паздаравеў, праветрыўся, хоць і стаміўся. Папрацаваў здорава!.. Хадзіў, можна сказаць, на хвалях маладое вясковае ўзьнятасьці. Калгасны рух бушуе як мора ў навальніцу..."

Далей пісау ён пра васпаватага чалавака.

Як прыехаў Явіч, брыгадаю кіраваў ужо яго таварыш. Таго на заводзе ўжо ня было.

Пятро Глебка

Арка над акіянам

I. Крыху гісторыі і географіі

Шумелі стагоднія пушчы, лясы
над багнай балот багуністых.
Вазёры у пышных абоймах лазы
вянком выглядалі квяцістым.

Ажына і лотаць і дзікі чарот
разносілі водар навокал.
Зьвярыныя сьцежкі у нетрах балот,
у твані губляліся вохкай.

Ніколі ня быў чалавечы там сьлед,
і толькі паданьні гавораць:
— Калі дзяцюку станавілася зьле,
ішоў утапіць сваё гора...

Напоены водарам дзікай красы,
паветрам вазёр халажавых,
былі тыя пушчы-балоты лясы,
як бы самастойнай дзяржавай.

І вось нечакана спрадвечны спакой
парушаным стаўся у момант:
у вёску прыгожаю раньняй вясной
зьявіліся два незнаёмых.

Адзін быў высокі, як гора, худы,—
адзнака што зносіў і ліха і кепствы,—
Чарнявай чупрыны скудлачаны дым
на брыль узьвіваўся з-пад кепкі.

У постаці гэнай адчулі красу
і сілу лясоў беларускіх:
чало упрыгожыў адценьнямі сум,
а радасьць гуляла на вуснах.

У сьмелых абрысах шырокіх брывей
лягла назаўсёды упартасьць;
суседзі казалі—„такі чалавек—
нашчадак далёкае Спарты“.

Кагалам шукалі спартанскіх манер,
у жылах—крыві каляровай,

ды толькі дарэмна—ён быў інжынэр,
Антон Аляксандраў Яновіч.

Другі незнаёмы—маленькі зусім,
прычэсаны гладка да глянсу;
на носе пэнснэ залатое насіў,
наогул выглядаваў франтам.

Зіялі лякеркі, як шкло, на нагах,
зіхцеў пазлацонасьцю гальштук;
быу ветліў з усімі, як толькі ільга,
і асабліва з начальствам.

Калі запытае пра што інжынэр—
лагодны адказ:—калі ласка!
і голаў нахіліць, як можна, ніжэй,
да сэрца прыціснуўшы ляску.

Гукне вокамгненна старшому аўто,
малодшага ўзяўшы пад руку,
спытае пра жонку, пахваліць пальто,
раскажа, што пішуць у друку.

Выконаваў сьціпла загады усе,
да сьмерці гатоў быў старацца.
Ён быў інжынэру і блізкі сусед
і першы намесьнік у працы.

Чамусьці усё-ж ня любіў інжынэр
ні мовы яго сакавітай,
ні тонкіх, да прыкрасьці тонкіх манер
і толькі хваліў працавітасьць.

Затое ў мяшчанскім знаёмым кругу
хвалілі яго бяз прычыны:
— Які ён прыветлівы, добры наш друг!..
— Які далікатны Яцына!..

(Ласкавы чытач мой, Яцыну заўваж:
ён будзе таксама гэроем,
хоць можа да густу ня прыдзецца вам,
разбурыць суладнасьць настрою).

Сяляне аднолькава стрэлі гасьцей,
агледзелі стрэўшы уважна:
— Вось гэны—каторы апранен чысьцей,
напэўна, начальнік больш важны.

Яновіч спытаў у іх:—Дзе сельсавет?
— А вось, калі трэба—пакажам—

і грузны, высокі, як дуб, чалавек
пашоў з інжынэрамі разам.

Вярнуўшыся доўга расказваў усім,
як толькі ільга, гіронічна:
— Балота надумалі тут асушыць,
а з торпу рабіць электрычнасьць.

Сьмяяліся з выдумкі гэтай усе:
— Нічога ня будзе з работы...
— Няхай сабе трацяць дабро пакрысе,
а нам вось—абы заработак.

II. Як можна аплянаваць балота

Хто ня бачыў палескіх паводак вясной,
той ніколі прыгожай ня знаў панарамы:
Чайкі, плаўна махаючы белым вяслом,
не дасягнуць сыйсьціся ніяк з берагамі.

Берагі адыходзяць, паводка расьце,
паляшук у святочным кужэльным адзеньні
яшчэ ўранку чакае на выспу гасьцей,
але толькі увечару, бачыць, сустрэне.

І прабудзе нямала на высьпе той госьць,
як-бы дзе ў чужаземным, далёкім палоне,
пакуль хвалі ўцешаць няўтольную злосьць
і павольна сыходзіць пачнуць з абалоны.

Як спрадвеку, таксама і ў гэту вясну
паглядалі сяляне ў бязьмежнае мора:
— Можа друга пазнаюць свайго па вяслу,
можа з сынам каханым убачацца скора.

Але ціха вакол, і, куды ты ні глянь—
ні каханага сына, ні любага друга:
балаты і вазёры—суздром акіян,
адзінокая чайка плыве валацугай...

Дваццаць пяць весьляроў апусьцілі вясло,
ловяць пальцамі тонкі цень багавіньня;
яны зьмералі шыр непраходных балот,
адплываюць павольна цяпер на спачынак.

І калі даплылі ўжо да цьвёрдай зямлі,—
люстравалася пушча ў празрыстасьці хваляў,
і здалося, стаяць пад вадой караблі,
што затоплены некалі ў часе навалы.

Гэты вобраз красы, як дабытак вякоў,
кінуў кліч паўставаць на змаганьне ізноўку.
Схвалявалася бурна гарачая кроў,
і Яновіч падаў весьляром дыспаноўку:

— Покуль паводка йдзе, прасьціраючы шлях,
трэба зьмераць глыбінь гэтых нетраў дзівосных,
бо пасьля недаступнаю стане зямля, —
налягайце мацней, мараходы, на вёслы.

Разыходзяцца кругі,
замыкаюцца кругі,
пырскі крохкія, як шкло,
узьмятаюць пад вяслом!

Устурбованыя хвалі
чайку плаўна залюлялі,
адыходзіць яна ў даль,
замыкаецца вада.

А вясна узьлёты песьціць:
— Засьпявайце, хлопцы, песьню,
хай усплёскамі ад слоў
выгінаецца вясло.

Разыходзяцца кругі,
замыкаюцца кругі...
Падхапіў вясёлы хор
стройны песенны акорд:

Песьня: Вышай, таварыш, вясло!—
чайка імчыць да ясноты.
Толькі зімой і вясной
нас ня пужае балота:

Павадкі сіняй шляхі
не беражэ перашкода;
белай раўніны сьнягі
так жа вядуць да ясноты.

Лета і восені дні
нас падняволяць стыхіі.
Гэй-жа наперад, чаўны,
коні мае залатыя!

Вышай, таварыш, вясло!
чайка імчыць да ясноты.
Толькі зімой і вясной
мы непакорны балоту!

III. Што было і што будзе

Які заблытаны хаос,
а мо‘ гіронія прыроды:
налева скрозь, вазёры скрозь
і непраходныя балоты.

На ўсход-жа сонца ад балот
пяскі рассыпчата жаўцеюць;
працята смагай навылёт
зямлі спустошанае цела.

Узгоркі зіяньбілі уздым,
прасьцерлі гладкія далоні,
і чарадою да вады
зьбягаюць чорныя адхоны.

Уткнуўшы нізкія ілбы
у камяністы цьвёрды бераг,
спадаюць стромаю, як-бы
свае раты на воду шчэраць.

Як толькі-ж хваля набяжыць—
ваду рачную смокчуць смагла:
ніяк ня могуць атушыць
сваёй няўтольнай вечна смагі.

У гэты край—пустэльны сад,
вітаць вясновыя заранкі,
свае проэкты расказаць,
хадзіў Яновіч на гулянку.

На стромкім беразе ракі
стаяў ён доўга у задуме;
шумелі крыльлем ветракі,
як неўтаймованыя думы.

Тут і лятункі расьцьвілі
мігценьнем пышным каляровым
пра лёс натруджанай зямлі...
Але раскажа лепш Яновіч.

Яновіч: Краіна вечная туманаў,
лясоў шумлівых і лазы,
яшчэ ня скончаны паўстаньні—
ты чуеш, клічуць галасы!

— У вёску горад шле сыгналы:
пара ісьці ў апошні бой,
паўстаць узьюшанай навалай
супроць звычайнасьці старой.

— Ў адказ на шчырае вітаньне
запульсавала бурна кроў,
ідуць на новае змаганьне
сыны учорашніх рабоў.

— Я чую, любая краіна,
я чую гэную хаду:
цяжкія крокі індустрыі
да перамогі нас вядуць.

— Наперакор ліхой стыхіі,
на гэтай згруджанай жарсьцьве,
узьняўшы вежы залатыя,
прыгожы горад расьцьвіце.

— Узьляжа ён красой чыгункай
на плечы згорбленыя гор,
і прабягуць тунелі вуліц,
умітусь выснуюць узор.

— Уранку высьцелецца густа
ад новых фабрык чорны дым,
і расьцьвітуць, заместа пушчы,
зялёнакосыя сады.

— Я веру ў гэтыя лятункі,
загацім долі нашай гаць...
Імкнецца вораг злосны тунна,—
ды мы ня станем удыгаць.

— Ад наканованае заспы
тварцы ўздымаюцца на кліч.
Я першы высыплю тут наспу—
хаос у стройнасьці злучыць,

— Замкнём развой навал у шлюзы
і ажыве электрастан...
Ён будзе сымболем саюзу
тварцоў—рабочых і сялян.

IV. Праца пачалася вокамгненна

Начавалі зоры на узьлесьсі,
устурбованых насьнілі сноў:
пад нагамі нечымі у лесе
чулі ў ночы шэлест верасоў.

Даняла трывога галасамі
задумённасьць вечную зарніц:
— Можа хочуць людзі над лясамі
запаліць уласныя агні?!

Неспакойна досьвітку чакалі,
каб даведацца якіх прычын,
але сон закрыў навекі шалем
і пашлі зарніцы на спачын.

Прыпыніўся месяц на адкосах
і абліччам, нават, пацямнеў:
прыглядаўся доўга на дзівосы,
ды ня мог нічога зразумець.

Выдавалася, што белы мошаст
на пяскох пажоўклых пабялеў;
нязьлічоныя мільёны мошак
аж кішаць у скошанай траве.

— От наладзілі-ж паганы вэрлах,
зьнепакоілі высокі мой пасад—
пасьмяяўся месяц ціхі зьверху
і пашоў паволі у свой сад.

Толькі сонца выведала тайнў,
на пустэчу глянуўшы здалёк:
на пляцы электрастану
будаваўся новы гарадок.

Узрасьлі будынкі вокамгненна
(разьвінуўся утрапёны лёс),
быццам волат, сьціснуўшы у жменю,
іх сюды аднекуль перанёс.

На пяскох здратованых сьлядамі,
як узгоркі, высяцца шатры...
Воблік створанай зямлі вякамі
рух людзкі за ноч ператварыў.

І мільёны грабароў і цесьляў
на работу сталі ад цямна:
— трэба воту дадзеную зьдзейсьніць,
трэба край да радасьці узьняць!

Загудзелі нетры і алёсы,
зашумелі пушчы і лясы...
Там ня трэ‘ прынуклівых упросаў,
дзе так шмат і шчасьця і красы!

Кліча сэрца, сэрца на дагонкі,
каб хутчэй дапяць за рубікон,
адклікаецца на іх гамонку
маладая кроў будаўнікоў:

Грабары: Цьвёрдай, працоўнай рукой
рэжам глыбока каналы:
хай адплывае з вадой
доля ашчадная—скнара.

— Будзем мы лепшай глядзець,
будзем тварыць яе дбайна;
працу цяжкую людзей
хутка падменяць комбайны.

Муляры: Выведзем выш камяніц
вышай ад самых узьлётаў.
Будуць гудкамі званіць
фабрыкі нашы, заводы...

— Як падарунак вясьне,
без макулінкі завады,
будзе цьвятліва ясьнець
намі здабытая радасьць!

Рабочыя чыгункі: Праз балаты, лазьнякі
высьцелем крохкія рэйкі;
будуць іграць цягнікі
на галасістых жалейках.

— Лёгкай хадою экспрэс,
будзе прыходзіць у госьці...
Згіне і выцьвіце спрэс
жальба з вачэй маладосьці.

Усе: Долі прыгожай зару
мы прывітаема заўтра.
Не навярэджвае рук
радаснай працы упартасьць.

— Творцы даюць пачуцьцё
новаму стылю ў сучасьсі.
Мы пераможам усё
для чалавечага шчасьця.

— Будзем дняваць, начаваць,
а не пакінем работы:
строгі зарок—будаваць
новыя сьвету ясноты!

V. Першыя весьнікі непарадку

На ўзгорку кантора
і поруч-жа склад;
са складу ў кантору
нясуць даклад.

Вытворцаў нарада—
рабочы кантроль
паслаў дэлегатаў
у ліку трох.

Крутыя усходы
на трэйці паверх
усходзяць, сыходзяць
то ўніз, то ўверх.

Здаецца, гайдаюць
арэлі натоўп:
увыш узьмятаюць,
зьлятаюць на дол.

Кантору для справы
разьбілі на дзьве;
налева, направа
натоўп ідзе.

Рабочыя-проста:
— Няхай разьбярэ
учынкі прахвоста
сам інжынэр.

У чуласьці крохкай
званок празьвінеў,
некалькі крокаў
і—габінэт.

Дубовыя дзьверы,
стрывожаны скрып...
І вось к інжынэру
ўвайшлі грабары.

Першы рабочы: Мы проста са складу
сюды ў габінэт...

Другі рабочы: Прышлі вось з дакладам
да вас, інжынэр...

Трэйці рабочы: Мы хочам, каб новы
парадак стварыць...

Яновіч: Я слухаць гатовы—
сядайце, сябры!

Першы рабочы: Адна толькі днёўка—
і вораг налёг:
прапала рыдлёўка
і восем шуфлёў.

Другі рабочы: Прасілі адразу
на склад загадаць...
Яцына адказу
дагэтуль ня даў.

Трэйці рабочы: Цяпер бяз начыньня
гуляе арцель ..
Такога злачынства
ніхто не цярпеў!

Яновіч: На сорак адсоткаў
вінуйце ня нас:
на ўсё трэба сродкі
таксама і час.

Першы рабочы: Мінуў цэлы тыдзень—
чарпалкі няма...
Калі-ж яна прыдзе?
Як будзе зіма?!

Другі рабочы: Няма чаго болей
марнець і чакаць:
падайце нам новы
на працу чарпак.

Трэйці рабочы: Ня зробім за лета
інакш магістралі,
даўно мы пра гэта
Яцыну казалі.

— Казалі?—сур'ёзна
зьдзівіўся Яновіч,
нахмурыўшы грозна
шырокія бровы.

Яновіч: Мы будзем старацца
як толькі ільга,
і стане на працу
праз тыдзень чарпак.
— Мы знойдзем прычынных
у гэтай віне...
Паклічце Яцыну
ка мне ў габінэт.

VI. Новы проэкт

Як толькі людзі за парог,—
не зачыніліся і дзьверы,—
ізноўку чорнае пяро
гафтуе белую паперу.

Адно ўжо лінія лягла,
абрысаваўшы стройны сэктар,
а колькі іх каля стала
чаргі чакае да проэкту.

І кемным вокам інжынэр
іх у конструкцыі пляну е:
то адкідае, то бярэ,
адну мяняе на другую.

Мінулі думы дзённы шум,
у творчым выраі лунаюць,—
трывога чулую душу
нагімі пальцамі кранае.

І скруха мутная гняце
што раз глыбей, вастрэй і горай:
— Ты кінуў творчай працы дзень,
заняўся вышукам тэорый!

Яновіч: Які скандал!.. Якая жудзь!...
У чым маёй віны прычына?
Няўжо за ўзьлёты дзейных дум
мяне вінуюць у злачыне?

— Я толькі радасьці хацеў,
увесь аддаўся парыванням...
Мой дух высока узьляцеў
у творчых домыслах, шуканьнях . . .

— Перада мной жывы проэкт
лятункі ўзьвіхраныя чэрцяць;
як той удумлівы поэт
ствараю пляны кроўю сэрца.

— Калі-ж да творчасьці туга
проэкт істотаю атуліць—
вясёлкі новае дуга
краямі стане на паўкулях.

— Цераз шумлівы акіян
узьнімем створчатую арку;
сусьвет рабочых і сялян
зьнітуе лёт часіны шпаркай.

— Па электрычных правадох,
як віхар хуткія, трамваі
хадзіцьмуць бегма над вадой,
імклівым лётам сваім вабіць.

— Над аркай пройдуць цягнікі,
пад аркай пройдуць параходы...
І скрозь агні... суздром-агні,
як сонца новага усходу.

— Высокай аркі вышыня,
прасьцяг узрочысты, бяскрайні,
вады марское глыбіня—
раскрыюць людзям свае тайны.

— Над акіянам медны звон
даваць ме грозныя сыгналы;
пакорыць наш, людзкі, закон
шалёна-морскія навалы.

— Вясёлы дзень і злую ноч
стаяць ме арка на дазоры,
як сымболь нашых перамог,
як сымболь радасьці бяз гора.

— Няўжо-ж за гэны вынік дум
мяне вінуюць у злачыне?!
Які скандал!.. Якая жудзь!..
Няхай ідзе хутчэй Яцына!..

VII. Гутарка Яновіча з Яцынам

Яцына выгладзіў свой чуб,
наваксаваў свае лякеркі
і усьміхнуўся краем губ,
самога ўбачыўшы ў люстэрку.

Відаць, што выгляд і убор
здаволіў густы кавалера:
ён вышаў горда ў калідор,
накіраваўся к інжынэру.

Хадой, якой ідуць у сьне,
якою ходзяць падхалімы,
ён увайшоў у габінэт,
нат' і ня піснуўшы дзьвярмі.

Лагодны кінуўшы пагляд,
застыў у паслухмяным стане . . .
Ну, хлопец—чысты мармаляд,
здаецца, зараз і растане.

Пяшчотным голасам вынег,
зацяўшы дух варожы туга:
— Вы, здэцца, клікалі мяне,—
я ўвесь гатовы на паслугі!

Яновіч: Ага! . . . Яцына? . . . Добры дзень!
Сядайце тут вось, калі ласка . .
Ну, як-жа праца ў нас ідзе?..
Нідзе ніякае апаскі?

Яцына: Ды што вы? Як-жа можна так?!
Нашто-ж памочнік інжынэру,
нашто-ж дзесяцкіх цэлы штат,
рахункаводаў і кур'ераў?!

Яновіч: Вось гэны ваш хвалёны штат
мяне найболей непакоіць . . .
Вы не заходзілі на склад?—
Там штось неладнае такое.

Яцына: Антон 'Ляксандрыч!.. Божа мой!..
Хто мог няпраўды напрарочыць?
Магу клясьціся галавой,
што гэта нехта ад рабочых . . .

Яновіч: Ня сьмейце, нават, гаварыць,
пакіньце вашыя дабары:
адны прышлі жыцьцё тварыць—
другія хочуць разбазарыць.

— І вось сягоньня уначы
на складзе зроблена пакража . . .
Каму даручаны ключы?!.
Каму даверана паклажа?!

— Ніяк ня можна уявіць,
што ня было удзелу штату . .

Яцына: — Антон 'Ляксандрыч!..
Яновіч: — Кіньце вы!..
Як найхутчэй дазнаць растрату!

Яцына: Я заўтра-ж дам на ўсё адказ,
ужо у гэтым—будзьце пэўны,
мне няпрыемна толькі вас
трывожыць дробязьзю надзеннай.

Яновіч: Я такжа верны будаўнік . .
Гараць агнём мае пачуцьці—
ці-ж далі права нашы дні
ад усяго мне адкаснуцца?

Яцына: А геніяльны ваш проэкт,
хіба ня тое-ж будаваньне?..
Ці хутка ён убачыць сьвет?—
Я даў-бы колькі меркаваньняў
Наконт таго, каб збыць . . .

Яновіч:— — Даўно
жыву лятункамі будовы
і вось сягонячы адно
закончыў першую палову.

Яцына: Вітаю вас! Прыемна чуць . . .
Яновіч: Я вельмі дзякую за шчырасьць!
Яцына: У вольны час я ўсё-ж хачу
пагаварыць ‘шчэ болей шчыра.
— І мо‘ тады, як з цесьцем зяць,
наладзім мы шыкарны гандаль . . .
Яновіч: Пра што вы хочаце сказаць,
у чым аснова пропаганды?..

Яцына: Я раскажу у вольны час,
пакуль—дазвольце разьвітацца,
прашу за ўсё мне прабачаць,
да пабачэньня зноў!..
Яновіч: — Бывайце!..

VIII. Вораг ізноў непакоіць

Расьцьвітала вясна, красавалі лясы
у вянкох зеляніны купчастай;
на прасторах вясны пад шатрамі красы
гадавалася доля і шчасьце.

Ад відна-да відна, ад цямна-да цямна,
не змаўкала у нетрах работа;
роўным рытмам хады уздыхала зямля
і шумелі лясы і балоты.

А калі раніцой на палетку у рад
стала першая трактар-колёна—
на спаборніцтва кліч ад рабочых брыгад
пакаціўся на поле адхонам.

І мацней і шпарчэй бунтавалася кроў,
сэрцы біліся ўзгодненым тактам;
нясупынна ішла валка цёмных дуброў,
каб да радасьці вымасьціць тракты.

А як вечар настаў, дагарэў і ачах—
разышлася нядобрая дзейка
і на дзесяць гадзін сэкратар назначаў
пасяджэньне партыйнай ячэйкі.

Лёгкім крокам вясны надыходзіла ноч,
ахінала крылом незнаёмым;

цені гонкія дрэў шалясьцелі ля ног,
спавівалі нэрвовай утомай.
Даўкі водар красы з багуністых амшар
напаіў утаймованым шалам,
і замоўклі лясы і палеткаў абшар,
і работа на ноч замаўкала.

Толькі ў клюбе расьлі ўсё мацней галасы,
разгараліся шумныя спрэчкі:
цяжка гневу агні у грудзёх пагасіць
так, як гаснуць пад ветрамі сьвечкі.

Але дзень ужо зноў у вакно бразгатаў,
заклікаў да імкліваcьці новай—
і патухлі агні, слова ўзяў сэкратар
для заключнай высноўнай прамовы.

Сэкратар ячэйкі: Дарагія таварышы!.. Струджаны лёс
нас паклікаў усіх на вялікую працу.
Мы кляліся краіне узмоцніць узрост,
дык і будзем нязьменна яго дабівацца.

— Але вораг ня ўрымсьціцца покуль жывы,
не пакіне да сьмерці рабіць перашкоды . . .
Досыць прыкладаў чулі сягонячы вы
пра завадную дзейнасьць у нас на работах.

— Хтосьці часта у змроку наведавае склад,
хтосьці ўночы блукае, як здань, ля машыны . . .
Я спачатку казаў, як рабіў свой даклад,
што ня сьпіцца найбольш інжынэру Яцыну.

— Ці ня ў гэным зацяжным бяссоньні віна
прычына гулянак трывожна-нясьмелых...
каб галоўныя часткі ў машыне адняць—
трэба мець і навуку, і спрыт, і умеласьць.

— Акрамя машыніста дагэтуль ніхто
незнаёмы з дэталямі новай машыны,—
вось чаму навальніцай кляновых лістоў
падазронасьць апала над імем Яцыны.

— Пазладзейску ён жвавы, на ўсё дабіўны:
адначасна на любасьць і воражасьць здатны.
Як-жа дзейнасьць яго назаўсёды спыніць,
як-жа першую спробу зрабіць і астатняй?!

— Мы паклічам грамадзкасьць, як грозных ваяк,
на вялікую бойку пачуцьцяў—на мітынг:
дзе узгоднена сэрцы пульсуюць у такт—
там дазнаем фальшывыя пульсы у рытмах.

— Станем зорка і пільна за працай сачыць,
загартуем цьвярдзей у змаганьні упартасьць;
не даверым Яцыну ад складу ключы,
ля машыны паставім надзейную варту.

— А калі атрымаем навочны даказ,
гнеў працоўных узьвіхрыць маланкамі буру—
хай ня жджэ тады літасьці вораг ад нас:
дасьць праўдзівую кару яму дыктатура.

IX. Праз некалькі дзён

Мінала ноч, а дзень на зьмену
выходзіў рупнаю хадой,
і праца сьціплая нязьменна
ішла балотамі удоўж.

Яна сьляды свае паклала:
праз багну, гліну і пяскі
прайшлі глыбокія каналы
ад цёмнай пушчы да ракі.

Істужкі рэек залацістых
віліся стройна аж да гор;
высока зложаны у сьцірты,
пятрэў на сонцы чорны торп.

Ад рыштаваньняў тонкіх сьпіцы
спляліся, быццам дзіўны цень:
высокай гордай камяніцы
стаялі стромы грузных сьцен.

На сьценах накрыж сталі кроквы,
як верны доказ без заган,
што праца йдзе напружным крокам,
расьце штодзень электрастан.

Узрост кагосьці зьнепакоіў,
наклікаў хтосьці перашкод:
дазнаць варожыя настроі
прышлі рабочыя на сход.

І грозны гоман дыша гневам:
— дакончыць ворага пара!..
— Мы гэту сволач кормім хлебам,
а трэба сьмерцю пакараць!

Галасы: Паклікаць зараз інжынэра—
няхай адказ рабочым дасьць,
якія ўжыты былі меры,
каб не псавалі нашу снасьць?!

Рабочы: Чакай адказу!
Другі рабочы: Сам Яцына
прыймаў, напэўна, тут удзел...
Трэці рабочы: Ня мы-ж вялі разбор машыны,
а нехта з вучаных людзей.

Грамада: У гэнай шкодзе—іх аснова!..
-- Давай на шыбеніцу ўсіх!
Галасы: Цішэй!..
...Яновіч просіць слова...

Грамада: Няхай адкажа, д'яблаў сын!..
Галасы: ...Спынеце гоман!..
...Хай гаворыць!..
...Пакіньце гутаркі..
...Цішэй!..
У вочы сыплюцца дакорам
агні разьяраных вачэй.

Але Яновіч вышаў сьмела
і на трыбуне скамянеў...
узмах рукі нэрвова-белай—
і стала ціха, як ў сьне.

Яновіч: Мне горна за вашыя словы:
ці-ж я адшчапенец які?!
Вы знаеце ўсе, што Яновіч
таксама з рабочай сям'і.

— За кожнае каліва шчасьця,
здабытае вашай рукой,
Гатоў я загінуць, прапасьці,
Як верны сучаснасьці вой...

Галасы: ...Ён праўду гаворыць...
.. Дарэмна
Спагналі зьвярыную злосьць...
...Ён з нашай дарогі ня зьверне...
...Ён з намі, як сябар і госьць...

Яновіч: За што-ж вінаваціце ў здрадзе?!
— Вялікая наша віна,
што мы ў згуртаваным суладзьдзі
ня ўмеем злачынцаў дазнаць.

— Дазнаем затое у працы,
хто крывіць парадак і лад...
Дык будзем-жа дружна старацца!
Я выдам Яцыну загад...

Галасы: ...Яцына найбольшы злачынца...
...Ці-ж ён тут удзелу ня браў...
...Вядома даўно, што Яцыну
ня шкода працоўных дабра...

Яновіч: Зусім беспадстаўныя весьці:
Яцына мой блізкі зямляк,
у працы штодзённай, сумеснай...
Голас: Склалі па шкодніцтву плян?!
Другі голас: Відаць, пад апеку ня дарам
бярэ выхаванца свайго!
Грамада: Даволі нам слухаць дабары—
мінуўся семнаццаты год!

Яновіч: Таварышы, любыя!..
Грамада: Годзе!
Яновіч: Дазвольце!..
Галасы: ...Ня трэба!..
..Кажы!..
...Пакінь свае песьні заводзіць...
...Вы разам гайстрылі нажы...

Сэкрэтар ячэйкі: Спынеце, таварышы, лямант,
Суцішце узбураны гнеў:
Яновіч імя не заплямiў,
а толькі змагацца ня ўмеў.

У гэтым і наша памылка:
Яцына аблытаў, як мог:
у вочы дарыў нас ухмылкай,
а зачы навостраваў нож.

— Конкрэтных няма яшчэ даных,
замежны-ж падхоплены ліст,
па зьместу зусім беззаганны,
гаворыць пра сувязь з былым.

— Высновай з гаворак інтымных
Яцыну ільга дакараць:
калі і ня быў сам актыўным,
то ўсё-ж, як відаць, патураў.

— Яновічу зараз-жа трэба
расьсьледаваць гэта, дазнаць,
каб дольнікаў справы ганебнай
сурова маглі пакараць.

— Па каліву, дробнаму зерню
праверым работу і дні!..
Вы чуеце?..

Грамада: Правільна!.. Верна!..
На ворага ўсе як адзін!

Яновіч: Што чую?.. Якія навіны!
Чаго-ж на каго наракаць?—
Чакаў я ўсяго ад Яцыны,
а здрады ніяк не чакаў.

Галасы (цішком): Яновіч зьбянтэжаны... ...Шкода—
суладнасьць разбурылі дум...

Яновіч: — Адкіньце наводшыб пяшчоты,
Гартуйце сурова свой дух!
— Знайду яшчэ сілы ударнай
скрышыць перашкоды жыцьцём.

Грамада: Вітаем тваю мы упартасьць
і самі на помач ідзём

X. Яцына, які ён ёсьць

Нахмурыўшы да болю грозна бровы,
і затаіўшы гнеў у сэрцы шчыльна—
хадой знэрвованай прайшоў Яновіч
у габінэт спакойнага Яцыны.
Агні вачэй зацеплілі варожасьць:
прызнаў адзін другога супаратам,
але Яцына ветлівы як можна
яшчэ надзей ня страціў. Далікатна
падаўшы мяккае патрону крэсла,—
зашчабятаў з трывогай захаванай:
— А можа тут нявыгадна і цесна,
тады прашу—сядайце на дыване!

Яновіч: — Пакіньце Вы дакучныя забегі,
цярпеў я досыць ваша падхалімства:
умееце на задніх лапках бегаць,
але сягоньня гэта будзе лішнім.

Яцына: — Прашу, колега, толькі без абразы!..

Яновіч: — Калі вы нажылі натуру лёрда?—
Мне помніцца, спачатку бязуразна
цярпелі вы у нашай мове цьвёрдасьць.

Яцына: — На ўсё свой час і час за нас парука:
Вы прымеце маю таксама веру...

Яновіч: — Гуляць у хованкі з дарослымі—дакука:
сьмялей разгортвайце свае паперы!

Яцына: — Даўно хацеў вас выклікаць на шчырасьць,
але трывога замыкала вусны—

ці не пара нам вылецець у вырай
куды-нібудзь за межы—з Беларусі?

Яновіч: — Ах, вось!.. Я вашы пляны разумею...
Яцына: — магу пераказаць і растлумачыць.
Яновіч: — Якую-ж мэту ваша праца мела
і ваш удзел адданы і гарачы?

Яцына: — Чакаў я ўсё дагэтуль перамены:
душу і сэрца ўкладваў у руіны,
каб з іх стварыць навекі неадменны
парадак—лад загубленай краіны.
— Каб так, як робіцца ў сям'і паліпаў,
усё, што зрушана і зрабавана,
ізноўку аднавіць у працы сьціплай
і здаць таму, ў каго яна забрана.
— Я жыў адзінай думай і надзеяй
што дасягненьні вашы мы падлічым,
што ажывуць, разгорнуцца падзеі ..
І вось насіў я маску на абліччы.

Яновіч: — Але цяпер...—А што цяпер такое?
Яцына: — Надзеі гаснуць, думы аблятаюць
і кожны крок наперад—непакоіць...
Яновіч: Скажы, чаго табе не далягае?
Яцына: — Не захапляўся я ідэямі братэрства:
задачы кожнаму напісаны ад роду:
адным прызначаны пакуты й кепствы,
другім і хлеб, і слава ад народу.
— Скажыце мне, дык па якому праву
павінен здаць ня толькі прывілеі,
й гонар мой, маю пашану, славу,
скажыце мне, бо я не разумею!
Я не хачу быць лёкаем беспраўным
натоўпу нейкага, дзе „мне—нічога",
а „нам—усё"!..

Яновіч: —Гаворыш вельмі слаўна!..
— Якую-ж выбраў ты сабе дарогу?
Яцына: — Я... вырашыў... пакуль хапае сілы,
змагацца з ворагам... з пролетар'ятам!..
Я з вамі гавару, Яновіч, шчыра,
ня думайце, што гэта сон вар'ята.

Яновіч: — Арыштаваць вас трэба за варожасьць!
Яцына: — А хто варожасьць гэную пасьведчыць?—
Трымаўся я дагэтуль асьцярожна
і ваш данос палічаць недарэчным.

Яновіч: — Я сёньня-ж вызвалю цябе ад працы...
Яцына: — Ня вы паставілі—спытайце ў трэсьце.
Яновіч: — Якая подласьць другам прыкідацца...
Яцына: — Пакінем сварку гэную урэшце:

— павінны мы прыйсьці да нейкай згоды.
Паслухайце, Яновіч, раз уважна:
у вас над аркай скончана работа,
а гэта мне— і вам ня менеў—важна.

— Што зробяць тут з такім выдатным тварам?—
Вас абсьмяюць на урачыстых кпінах:
Вам сто прамоў вітальных нагавораць,
а плян усё-ж ня зьдзейсьненым загіне.

— Як другу, даць хачу дзьве прапановы:
адна—пакіньце ўсё, мы пойдзем разам
туды, дзе грунт культур, дзе іх аснова,
там знойдзеце свой лёс, сваю украсу.

— Там зразумеюць вас і вашу здольнасьць,
там мы ня будзем лёкаямі толькі,
а кожны з нас, як правамоцны дольнік,
належную адрэжа шчасьця столку.

— Ну, як вы мысьліце?

Яновіч: — Кажэце казкі:
Ня маю сілы пашчапаць вам голаў,
парэзаць скуру белую на паскі
за мой народ, што там галодны й голы—

— Я ведаю той лёс і перагасу.

Яцына: Тады падам другую прапанову,
калі ня хочаце за межы разам...
Прадайце мне праэкт і плян будовы!

— Мы узьвядом над акіянам арку,
а тут яна загіне вечнай марай...

Яновіч: — Ня сьмейце гаварыць! Ад сілы харкну
і заплюю глянцованую хару.

Яцына: — Ніяк з табой ладу знайсьці ня можна:
жабрак зусім, а раскідае грошы;
ты будзеш каяцца, ды будзе позна:
яшчэ паглядзім, хто з нас пераможа.

Яновіч: — А пераможа той, каго мільёны,
чый пульс крыві ў адзіным б'ецца рытме!—

Сарваўся з мейсца, быццам утрапёны;
узмах!—наводшыб бразнуўшы дзьвярымі.

Яцына: — Антон Ляксандрыч!.. Слухайце!.. Яновіч! .
загаласілі дзьверы ў калідоры,
забразгаталі пошчакам дубовым
і загайсала рэха па канторы.

XI. Яновіч дома

Сьцелецца пыл над сялом,
быццам-бы цёмны туман;
вецер цалуе крылом
белыя грудзі хмар.

Сонца на захадзе глянь—
косы павісьлі удоўж;
засхаю вее зямля—
будзе, напэўна, дождж.

Вось ад таго грабары
жвава шпурляюць глей,
рупяцца больш муляры,
кеглі зьвіняць званчэй.

Толькі Яновіч адзін
кінуў рабочы свой дзень:
смутак душу астудзіу—
дзе-ж яго шпурыць, дзець?

Можа у вір утапіць—
горкаю стане вада;
кінуць на сьцежку у пыл—
дык узрасьце бяда.

Як-жа куды яго дзець,
каб не знайшоў а-ніхто?—
Сумны Яновіч ідзе,
вочы сьвідруюць дол.

Вось і драўляны ўжо дом,—
стройны, высокі фасад...
Трое дзяцей пад акном
садзяць маленькі сад.

Крокі пачуўшы, бягуць
радасьць сваю расказаць,
сьмех асыпаецца з губ,
быццам з травы раса.

Сьціснулі колам жывым,
ярка зьвіняць галасы:
— Ну, адгадай-жа, аб чым
будзем цябе прасіць!

Яновіч утомлена садзіцца на ганку,
каб выслухаць просьбы, каб гора суняць:
— Купі мне, татуля, маленькую ляльку! .
— Купі мне, саколік, жывога каня!..

— А мне, мой харошы, купі лепей трактар—
люблю я прасторы бяскрайнія ніў:
як стану вялікім, каханы мой татка,
пайду й запішуся тады ў колектыў.

Разьвеялі дзеці утому і смутак,
гаворкай ласкавай да працы завуць;
ізноў утрапёныня кружацца думы,
шчапаюць, нітуюць ізноў галаву:

— У імя наступных нашчадкаў комуны,
ня сьмей адступіць а-ні кроку назад:
ты чуў і ў гаворках рабочых чыгункі
і ў просьбах дзіцячых—няўхільны загад!

Яновіч.: — На вір цёмнасіні ідзі, мая жальба,
гартуйся ў змаганьні, зьбянтэжаны дух!..
Куплю, мае дзеці, і трактар, і ляльку,
бяжэце, гуляйце... я ў хату пайду.

Зацьвіў і адцьвіў над балотамі вечар.
і ноч падышла па халоднай зямлі,
Яновіч, ссутуліўшы вузкія плечы,
канчае кароткі і экстрэны ліст:

..„Варожасьць Яцыны, амаль што, дазнана,
чакаю загаду, што далей рабіць.
Наконт выкананьня намечаных плянаў—
дваістай гаворкі ня можа і быць“.

Рашуча пастаўлена цьвёрдая кропка,
як быццам хістаньняў—зусім ня было...
Схіляецца голаў ніжэй на ўзлакотках
і сон ахінае маўклівым крылом.

XII. Змова

Ня сьпіцца Яцыну, утульны пакой
трывогі ніяк не разгоніць,
а вецер шуміць і шуміць над ракой
і хмары за хмарамі гоніць.

Яны аблажылі увесь небакрай,
далёка у засьціле чорнай
жывыя маланкі намітусь гараць
і коцяцца рокаты грому.

Яцына: — Якая нэрвовая, вострая дрож!..
Чаго там баяцца што будзе?—
ў цяжкую хвіліну навостраны нож
разрэжа заблытаны вузел.

— Няма у злбойсьцьве злачынства ніяк—
адкрыты гуляюць дзьве масьці,
калі перамогу дастану не я,
дык значыцца, ворагу шчасьце.

— Чаму гэта толькі дагэтуль няма
супольнікаў верных і чынных?—
Хутчэй-бы разьвеяць загадкі туман
і вырашыць: жыць ці загінуць?

Старожка Яцына глядзіць у вакно,
заходзіцца сэрца ў трывозе:
навокала хмурая, чорная ноч,—
нікога нідзе на дарозе.

Ізноўку руплівай, пасьпешнай хадой
Яцына знэрвована крочыць,
і доўгія цені растуць аж пад столь
а з імі—іх зубы і вочы.

Здаецца імкнуцца за шыю абняць,
зацісnуць у клямарах костак...
Яцына: — Няўжо ў гэтым вобразе—сіла мая?—
Такая агідная постаць!

Каб здань адкаснулася—песьню вядзе,
і бровы нахмурыўшы строга,
ізноў да вакна устурбованы йдзе,
упарта глядзіць на дарогу.

Ні цені у чорнай смузе ня відно,
маўкліва у цемені крохкай,
апоўначы толькі пад нізкім акном
пачуліся ціхія крокі.

Яцына нячутна падбег да вакна,
заморгалі радасна вейкі;
шырокую раму уверх прыпадняў,
паклікаў цішком чалавека.

— Пралазьце!.. Цішэй толькі...
Незнаёмы: (*пралазячы*)—Нават скандал
— Ніхто не пачуе, ня убачыць...
Яцына: — Чаму гэтак позна зьявіліся, Фальц,
насьцігла якая няўдача?

Фальц: — Ня мог-жа я коняй у вёсцы узяць,
прышлося ісьці аж на хутар.
Яцына: — Я думаю трэба... пара пачынаць,
бо стане зарэць ужо хутка.

Фальц: — Ноч цёмная, коні паблізу стаяць,
дамчаць да мяжы за хвіліну.
Яцына: — Вяроўку ўзялі?
Фальц: — Навошта пытаць?—
Ёсьць нават піла і драбіны.

Яцына: — Я дзякую вельмі!
Фальц: — Пакіньце сабе
падзяку для модных салёнаў:
не за падзяку сюды я прыбег
аж з-за мяжы, як шалёны.

— Зьбірайцеся!.. Дайце сюды мне нажы!
Яцына: — Мне страшна!..
Фальц: — Хаця не заплачце!
Яцына: — І сэрца балюча—трывожна дрыжыць!
Што станецца тутака з бацькам?

Фальц: — Пакіньце вы хныкаць!.. Сабралі усё?—
Ня трэ‘ забывацца нічога...
Гатовы?—ў дарогу!
Яцына: — Ісьці, то ідзём,
але ня зусім у дарогу.

Схіснуўся ад лямпы за вокнамі бляск,
і цемень лягла на экране;
зашастала глуха сухая зямля,
і бразнула ціхенька рама.

(*Канец будзе*)

З. Бядуля

Нязвычайныя гісторыі

Чорная барада

... А ўдзень кованыя жалезам полазы дарогу глянцуюць.

Зьвіняць санкі па шкляных рэйках ружова-сонечнага сьнегу, шліфуюцца, плывуць у іскравую белую далячыню. Конi пярыны сьнегавых пер'яў растрасаюць, кідаюць белыя воблачкі ў санкі, у твар, у вочы.

... Наперад!

Абапал дарогі—канавы. Улетку спусьцілі сюды з забалочаных лугоў глыбокія рудаўкі. А мароз тоўстую кару ільду выраСьціў на канавах. І ўдзень дзеці доўгія мілі мераюць туды і сюды па лёдзе, сьлізгаюцца на дрыўляных канькох-самаробках. Зычныя галасы—вясёласьць і імкненьне. У вачох—аганькі, блакітныя, зялёныя, чорныя. Снапы іскраў на чырвонашчокім марозе.

... Гэ-э-эй!

* * *

Цяпер ноч дрэмле каля сьцен на пухкіх сівых аўчынах. А вецер—лютаўскі, асрыбраны—ня сьпіць, зачосвае заімшэлыя стрэхі. Драпяне салому, зашастае ў мяккіх лапцёх па сялянскім даху і крыкне ў застылае поле—у адзіноту марозьлівай шэрані. Забомкае вецер асьвірам па студні і паймчыцца.

... Дзе ён? Дзе ён?

Мігацяцца вакенцы. Палоскі сьвятла цягнуцца ад вачэй ратайскіх хатак на вясковую вуліцу. У ружовасьці сьнегу адцяняюцца адціскі конскіх падкоў і пячаткі жывёлін.

Ня сьпіць Сымон Канцавы. Пасьля сходу сон не бярэ.

... Як яно будзе? Што яно будзе?

Трывожнымі вачыма ён упёрся ў аганёк лямпы—і думае, думае: Шмат ворагаў у ваколіцы, у гэтай-жа вёсцы...

Удзень, перад тым, як пайсьці на сход, ён пагаліўся адломкам касы, адвостраным у каваля на тачыле. Галіўся і парэзаў твар. Яшчэ цяпер ня можа кроў стрымаць. Ён рваў газэту і прыкладваў да параненых месц кавалкі паперы. Людзі жартавалі з яго. А болей усіх—краснабай Грыгор з хутару.

— Глядзеце, суседзі,—гаварыў Грыгор,—Сымон да твару пластыры прыкладвае з „Беларускай Вёскі". Вось чытайце: „Ра-ску-лача-ем". Раскуд-раскуд-раскудравая мая—сьпяваў ён пры гэтым.

Голасам гадзюкі зашыпеў Сымону на вуха:

— Яшчэ ня тое станецца, калі будзеш падбухторваць на камунію. Парэжам цябе на кавалкі і сабакам кінем.

Сымон хацеў крыкнуць сходу, але стрымаўся: ўсёроўна Грыгора не баіцца.

Гарачы быў сход, ажна цяпер горача Сымону.

Дзеці сьпяць. А жонка ляжыць на ложку і плача, лае яго. Праз некалькі дзён трэба будзе аддаць карову ў агульны хлеў.

Жонка пайшла карову даіць і доўга бавілася ў хлеве. Сымон выскачыў паглядзець, што яна там робіць, ажно абыймае карову, цалуе ў вільготную морду, маткай роднай заве, міленькай, бедненькай.

Нешта засмактала ў грудзёх Сымона, але ён зазлаваўся на самога сябе, абазваў жонку „дурной бабай", ледзь адарваў яе ад каровы і павёў у хату.

— Хто за ёю там глядзець будзе, за нашай Рабулькай? А бяжы кожны раз са збанком па малако. Ласка будзе, калі дадуць. А я ўжо болей не гаспадыня.

Ня можа супакоіцца Сымоніха.

Калі трохі высахнуць вочы, яна падымаецца з ложку, кідаецца кулакамі на мужа і не сваім голасам крычыць:

— Выпішыся, праклятый чорт, з камуны! Ня дам каровы! Я выгадавала яе! Ня дам!

Сымон падыходзіць блізка да жонкі. Глядзіць ёй у вочы і маўчыць. Двух маленькіх Сымончыкаў бачыць ён у яе павялічаных, цемных зрэньках. Сымончыкі драбней гарошынак, аднак на тварыках белыя кропачкі—кавалкі паперы, прыклееныя да парэзаных шчок.

— Што ты вылупіў на мяне бельмы? дзівіцца Сымоніха. Яе голас робіцца лагаднейшым, расьцягнута выгаворвае яна словы:

— А я думала гадаваць цялушку ад Рабулькі. Наста падрасьце-пасаг трэба рыхтаваць. Ну і бацька ты! Камунія пасагу Насьце ня дасьць.

— Маўчы!—крычыць Сымон ахрыплым голасам. Пасьля сходу ён заўсёды голас траціць.—Маўчы! Цябе Грыгор напужаў? Ты яму паверыла, што вясною палякі прыдуць, што пан Замашынскі вернецца? Глупства ўсё гэта. Грыгор—падкулачнік, сволач, толькі языком гладка меле. А пасаг Насьце ня трэба будзе. Яна ўмее працаваць, вучыцца будзе—вось табе і пасаг!

Зноў кроў паказалася на парэзаным твары Сымона. Жонка ціха ўсхліпвае.

Шэры кот сядзіць на стале, натапоршчыў рэдкія вусы і дзівіцца на гаспадароў.

— Прапала жытка мая!—лемантуе гаспадыня.

На яе вачох водблеск лямпы. Сымону здаецца, што яе вочы чужыя і празрыстыя.

— Грыгор разумнейшы за цябе,—кажа яна прымірэнчым тонам.—Ён не запісаўся. А за табою, бач, многія ў колектыў пайшлі. Яшчэ паб'юць цябе. Грыгор не багацейшы за цябе, а вось не палез.

— Пабачым яшчэ, які розум у Грыгора. Яго багатыя настроілі Самі баяцца, дык яго ражном выставілі.

Заняўкаў кот. Саскочыў са стала і кінуўся на печ.

Ноч была цёмна-сіняя. Такога-ж колеру вокны Сымонавай хаты блішчэлі—успацелыя, люстраныя.

Сымон падышоў да вакна. Пабачыў у шкле свой твар, як у люстэрку.

На вуліцы пачуліся крокі.

... Хто-ж гэта ходзіць паначы?

У Сымона трохі сэрца ёкнула. Ён зірнуў у кут. Там тырчэла ў шчыліне сьцяны новая сякера.

Нехта падышоў да вакна цёмным ценем. Ціха забарабаніў у шыбу. Сымон угледзеў бледную руку, адшарахнуўся ад вакна і не сваім голасам крыкнуў:

— Хто ідзе?

Дзеці прачнуліся.

Падышла спалоханая жонка.

За вакном ціхі голас:

— Пусьцеце пагрэцца. Ня бойцеся...

— Хто ты?—запытаўся Сымон і зноў зірнуў на сякеру.

— Падарожнік. Зьбіўся з дарогі. Мне на Менск.

Сымон прыціснуўся лобам да халоднай шыбы, затуліўся рукамі ад сьвятла лямпы і ўгледзеў чалавека з чорнай барадой. Вочы падарожніка былі ў цені, але іхні чорны бляск як бы пранізваў вакно.

Нешта знаёмае здавалася Сымону ў голасе незнаёмага.

— Пусьці, хаджаін, пагрэцца, прасіў незнаёмы літасьлівым жабрацкім голасам.

...Не. Гэта мне здалося. Ня той голас,—падумаў Сымон.

— Ня пускай!—сказала Сымоніха.—Ліха яго знае, што гэта за чалавек.

— Што? Чалавека ў хату ня пусьціш? Якая ты дабрасэрная да кароўкі і благая да людзей... Што ён мне зробіць? І ў мяне рукі, ды не абы якія.

Чалавек унёс у душную хату сьвежасьць марозьлівай ночы Ён быў абветраны, абтрушаны сьнегам, нібы мукою. Хукаў на рукі, грэўся каля печы.

Потым доўга маліўся на пусты кут, на тое незакуранае на сьцяне месца, дзе раней віселі абразы. Пільна прыглядаўся да пустога кута, нібы нешта надзвычайна цікавае бачыў там, чаго хатнія ўгледзець не маглі. Сум малітвы сьвяціўся ў яго цёмных вачох.

Паміж волі і Сымон зацікаўлена зірнуў на кут, нібы ў першы раз. Са шчылінаў высоўваліся на сьвятло клапы. Яны поўзалі па сьцяне, як жывое ільняное семя.

— Чаго ты молішся клапам?—ня вытрымаў Сымон.

Чалавек не адвярнуў ад кута набожных вачэй і мармытнуў у сваю чорную бараду:

— Тут некалькі дзесяткаў гадоў сьвяты абраз хрыста-збавіцеля вісеў. Гэтае месца сьвятое.

— Га-га-га!—зарагатаў Сымон здаровым сытым сьмехам. Замест вачэй у яго блішчэлі адны вузенькія шчылінкі ў густых зморшчынах.

Чалавек яшчэ з большым захапленьнем стаў на калені і яшчэ шчырэй пачаў шаптаць. Смага чулася ў яго шэптах, нібы ў гарачы дзень на сенакосе халодную ваду піў. Але ў яго рухах была нейкая няпэўнасьць, нязвыкласьць да малітваў і як-бы схаваная палахлівасьць.

Сымон глядзеў на яго з недавер'ем і кінуў адным вокам на сякеру:

...Доўга моліцца чалавек. Якія грахі замольвае?

А той вочы ў гару закаціў—пэўна, ня бачыць ні кута, ні клапоў, а толькі закураную столь.. Яго набожныя, натхнёныя вочы мабыць і столі ня бачаць, а яркае, сонечнае, блакітнае неба, з якога сам „сьвяты дух" да яго спускаецца на воблачных пухоўках...

У гэты час Сымоніха ціха і хутка, каб „сьвяты" чалавек не заўважыў, апранулася і, як зачарованая, ня спускала з яго вачэй. Сьлёзы цяклі па яе твары. Гэта былі не ранейшыя сьлёзы злосьці і крыўды на Сымона, а надзвычайнай чульлівасьці, спакоры і нейкай дзівоснай сумнай радасьці.

Цень малельніка застыў разам з ім на падлозе нярухомай, нявідочнай жывёлінай. Здаецца, даўно тут чалавек моліцца і так ён будзе стаяць да апошніх хвілін свайго жыцьця.

Перад Сымоніхай гэта быў не чалавек, а бог, перакінуты ў чалавека. Яна ня вытрымала, апусьцілася на калені і давай на кут з клапамі шаптаць сваё вывучанае з малых гадоў „мёйца-сына".

Сымон глядзеў на гэта зьбянтэжаны, з расчыненым ротам, з асалавелымі ад нечаканасьці вачыма.

Такая напружанасьць гэтых трох чалавек цягнулася мо' хвіліны дзьве, пакуль Сымоніха не схапіла руку падарожніка, гучна цмокнула ў яе і залемантавала:

— Ратуй, божы чалавек!

У яе голасе і вачох было нешта такое нявольніцкае, роспачнае, ад чаго падарожнік уздрыгнуўся і падняўся на ногі.

— Што ты робіш?!—крыкнуў Сымон ахрыплым голасам.

— Маўчы, гаспадар!—навучальна і строга прагаварыў падарожнік.—Няхай супакоіцца ў бозе душа яе.

У голасе падарожніка адчувалася ненатуральнасьць і цяжкасьць, нібы гарох трымаў у роце і разжоўваў разам са словамі. Зноў у чужым і незнаёмым голасе Сымон адчуў знаёмыя ноткі.

Падарожнік зьняў торбу з плеч і сеў на лаву. Часта і як-бы асьцярожна гладзіў доўгую чорную бараду. З робленай павагай ківаў галавою.

— Хто ты і адкуль ідзеш? — запытаўся Сымон.

— Можа есьці хочаш, сьвяты чалавек? Пэўна галодны?

У словах Сымоніхі была рахманасьць і замілаваньне.

— Я іду здалёку. Я—манах. Як зьнішчылі ў Кіеве манастыр, дык я так па людзях і валакуся. Дзе днюю, там не начую. Вячэраў у суседняй вёсцы. Есьці не хачу. Дзякую.

Голас яго расслаблены—пакрыўджанага, нешчасьлівага чалавека.

Кот цёрся каля яго ног і ціха мурлыкаў. Ён нагнуўся і пагладзіў ката.

Сымоніха падкруціла ўверх кнот лямпы.

— Мне вочы баляць ад такога сьвятла,—сказаў падарожнік, зажмурыў вочы і пагаспадарску спусьціў кнот ад лямпы.

Сымон угледзеў у яго вачох хітры бляск.

... Што гэта за чалавек?

Падарожнік увесь час адварочваў ад яго твар.

— Чаму гэта ты, гаспадар, сьвятыя абразы зьняў са сьцяны?

— Навошта яны мне, калі ў бога ня веру!

— Чаму ня верыш?

— Бо ніколі яго ня бачыў. Яго няма!

— А ў камуну верыш?

— Веру.

— Бачыў яе?

— Бачу, як яна робіцца. Разам з іншымі будую. Веру ў сілу сваіх рук.

Падарожнік засьмяяўся.

— Ты-б, гаспадар, хоць Леніна патрэт павесіў у пустым куце.

Сымон зазлаваўся.

— Як?! патрэт Леніна разам з клапамі?! Ленін аздобіць мой кут, калі ён будзе сьветлы і чысты ў новым калгасным будынку!

— Так. Ленін быў добры чалавек,—сказаў падарожнік.—Каб ён цяпер жыў, дык не дазволіў-бы так людзей мучыць, кіямі ў камунію заганяць?

— Ніхто не заганяе кіямі. Хто ня хоча, той ня йдзе. А Ленін аб камуне кнігі пісаў.

— Пісаў! Ты бачыў, як ён пісаў? Гэта ты, калі пісьменны, можаш напісаць, і сказаць, што Ленін напісаў.

Пасьля ранейшых малітваў голас падарожніка быў праз меру будзённы і звычайны. Сымоніха глядзела на яго зусім іншымі вачыма.

— А чаму па тутэйшых вёсках сабакі такія адкормленыя? Валочацца па дарозе тлустыя, аж брыдка на іх глядзець.

— Гэта багатыры кароў сваіх рэжуць, каб у калектывы не забіралі. І коняй скуралупам прадаюць.

— Яны з гора ды з бяды так робяць. А там у калектывах ды камуніях каровы і коні непатрэбны—на ўсё машыны будуць. Машыны даіць будуць, на машынах араць будуць і езьдзіць.

Злы сьмяшок чуўся ў голасе падарожніка.

— Кінь аб гэтым гаварыць і няма чаго сьмяяцца,—зазлаваўся Сымон.—Навошта табе, божаму чалавеку, у такія справы ўмешвацца?

— У паншчыну вас заганяюць! Вось што я скажу—загарачыўся падарожнік.

Яго голас загучэў знаёмым басам.

Сымон падскочыў да яго і з імпэтам схапіў падарожніка за бараду. Яна засталася ў яго жмені, нібы пучок чорнага сіўца.

— Ай!—застагнаў падарожнік.— Без вазаліны ня можна было зрываць—баліць...

Два ворагі ўрэзаліся адзін у ваднаго вачыма, нібы вострымі нажамі.

— Дык вось ты які фокусьнік, Грыгор! Гэта-ж табе ў кіятрах граць трэба! Чаму-ж ты ў камсамолькім драмгуртку не запісаўся?

І—Бац!

— Гэта табе, Грыгорка, за твой кіятар!

Бац у другі раз.

Пяць пальцаў белыя ў чырвані твару засталіся ў Грыгора на аднэй шчацэ, тры—на другой.

— Ідзі, жонка, цалуй у руку багамольнаму чалавеку!

Маўчыць Сымоніха сьцяўшы губы. Дзеці плачуць.

Грыгор дрыжыць. Вочы—воўчыя. Ляскае зубамі.

— Дзе-ж багацейшыя дзенуцца?—замаліўся дрыжачым голасам Грыгор. Яны-ж цяпер самыя бедныя, самыя няшчасныя. Навошта зьдзекваццa над іх?

— Не бядуй па іх, Грыгорка!

— У цябе, Сымон, літасьці да іх няма,—захліпваўся Грыгор і асьцярожна здымаў з голенага твару шматкі валасоў, якія засталіся ад прыклеенай барады.

— Глядзі ты! Аб літасьці загаварыў! А дзе-ж гэта літасьць была раней да нас, да бедных? Багатыры цябе падкупілі, падкулачнік ты свалотны! Мала мы бедныя карак гнулі за багатых? Я табе зараз пакажу літасьць, багамольнік ты! Жонка! Вяроўку цягні!

Хацеў вырвацца Грыгор, але моцныя рукі былі ў Сымона.

Сымоніха ўстрывожаная, але сьмелая і з нейкай лёгкасьцю ў руках прыцягнула вяроўку, каб вязаць Грыгора.

* * *

Ноч лютаўская дрэмле каля сьцен на сьнежных аўчынах. Вецер зачосвае заімшалыя стрэхі.

Бандыцкі абрэз

Грыгора павялі ў горад. Барада ляжала ў міліцыйскім портфэлі. Малодшы брат Грыгора, Антон, скрыгатаў зубамі ад злосьці.

— Калі нам няма жыцьця, дык няхай і гэтаму гаду Сымону ня будзе. Не пабачыць ён камунію. Калі Грыгор пажартаваў, дык ён гэта ўсур'ёз прыняў?! Няхай будзе сур'ёз за сур'ёз!

Выбраў Антон цёмную ночку--бяз месяца і зор. Вецер скаголіў над вёскай, прышоў грэцца з халоднага бору. Над полем пытляваўся дробны, як белы пылок, сьнег.

У гэту ноч Антон туліўся каля сьцен, пайшоў на сваё гумно. З-пад страхі выцягнуў бандыцкі абрэз часоў Балаховіча. Абрэз быў вычышчаны, агледжаны, вымазаны алеем яшчэ некалькі дзён таму назад: ... А мо' спатрэбіцца..

Гладкі, халодны „струмант" перакокваў лёгка з рукі ў руку. Ня дрыжэлі Антонавы рукі. Толькі зубы зашчаміў ён так моцна, ажна долатам сталёвым не расчэпіш. А ў вачох—жоўтаватыя воўчыя аганькі. Яны сьвідравалі ночны цемень і злосныя бліскі кідалі ў бок хаткі Сымона Канцавога—аматара калгаснага, гаваруна нялюбага.

... Эх!

* * *

І ўспомніў Антон:

Жуда гуляла па мястэчку. Дваццаць чалавек вярхом. Вакяніцы былі зачынены ў сьветлы сонечны дзень. На вуліцах ніводнага чалавека. Спачатку прабівалі кулямі акяніцы. Потым падпалілі мястэчка. А пасьля--крыкі людзей, ад чаго нешта расло ў грудзёх дзікае і радаснае...

— За што ты мяне б'еш?

Стары яўрэй з акрываўленай галавою глядзеў на яго зусім не спалоханы, але ў яго выцьвілых вачох стаяла запытаньне. Калола Антона гэтае запытаньне, нібы накаленая да чырвані шпілька.

— Бо ты—жыд, а сын твой комуністы.

— Няма у мяне сыноў.

— Брат твой.

— Няма ў мяне братоў.

— Унук твой.

— Няма ў мяне ўну...

Стары ня скончыў. Лоўкі быў абрэз...

* * *

Краўся па чужых загуменьнях Антон. Ішоў так ціха, што нават самога сябе не адчуваў. Вось нібы ён соўваецца ўва сьне, нібы вецер носіць яго, як сьнежную пылінку.

Ішоў асьцярожна, павольна. Кожны крок—вялікае вандраваньне. Сам ён—цень, нячутная лёгкая здань. На Сымонавым гумне запахла сьвежым сенам.

А хаты вясковыя, хлявы і гумны—небясьпечныя. За кожным вуглом можа хто цікуе. Можа хто сьцеражэ...

... Няма чаго баяцца...

Вочы ў Антона вострыя, як у коршуна. Калі што, дык здалёку ўгледзіць. Абрэз у руках, ня спудлуе. У выпадку чаго, дык... і заўсёды адным махам у грудзі або ў лоб. Ого, ён стралок першага гатунку! Ён—майстар!

Але тут думкі яго накіраваліся ў іншы бок:

... Можна і бяз стрэльбы лоўкую работу рабіць.

Ён добра памятае...

* * *

Тады гэта нават баба рабіла. Ліхая была баба—высокая, худая, з ільдзяным бляскам у сьветлых вачох. Губы—тонкія і бледныя Калі сьцісквала іх, здавалася, што ў яе зусім роту няма. А гэта было так нязвычна, што нават Антон адчуваў сябе хлапчуком пры ёй. Голас яна мела вельмі лагодны і ціхі. Але калі гаварыла, дык у яе вачох запальваліся чырвоныя, тоненькія, як валасочкі, жылкі.

Ня ведае Антон, хто яна і адкуль прышла ў мястэчка.

— Чаго табе тут?—пытаўся ў яе.

— Біць жыдзянят.

— За што?

— Бо яны нехрысьці...

Калі Антон падышоў да аднэй хаты, дык знайшоў ля вугла голенькае дзіцё з разьбітаю галоўкаю.

— А ня страшна?

— Як гэта ты?

— Я за ножкі і галоўкай аб вугал.

— Яны-ж нехрысьці...

* * *

Вось і кажы, што без абрэзу абыходзіцца нельга!

Сьвятлютка сьвецяць маленькія вакенцы Сымонавай хаты. Міту-сяцца за шклом людзкія постаці

Антону сам „бог-гасподзь“ памагае. Нікога ня сустрэў. Сіні сьнег ня скрыпіць пад нагамі на Сымонавым гародзе. Супроць вакна—кусты.

Тут і сеў Антон.

Наставіў кароткую рульку абрэза ў вакно. Доўга цэліўся. Жмурыў левае вока: браў Сымона на мушку. Хацеў трапіць у лоб. Няхай людзі ня скажуць, што няўдалы быў стралок.

А ў гэты час:

. . . . . .

... адно вам скажу, таварыш Сысоеў, што калгас у нас будзе адзін з лепшых.

Голас Сымона быў упэўнены. Хрыпоткі ня было. На стале дымілася яечня. Збан малака стаяў. На белым абрусе ляжалі тоўстыя лусты хлеба.

— Ежце, таварыш Сысоеў!—гасьцінна прасіла Сымоніха.

— Маладзец баба!—хваліў яе Сымон.—Вот так! Таварыш Сысоеў дапаможа нам арга...

. . . . . .

І злосьць брала Антона, што Сымон ні на хвілінку спакойна ня ўседзіць. Круць-верць галавою ва ўсе бакі.

Гутаркі праз вакно ня чуваць. І няпрыемна Антону:

...Вось чалавек адчыняе і зачыняе губы, моршчыць лоб, бліскае вачыма, махае рукамі, а слоў яго не разьбярэш. Чалавек увесь акутаны сваімі словамі, гаворыць, здаецца, усім целам. А слоў ня чуеш... Праз вакно толькі працэджваецца заглушаны гуд чалавечых галасоў:

Гум-гум-гум-гум.

Зусім ня страшна Антону. Сталь абрэза нагрэлася ў яго руцэ. Сымон у хаце ля вакна здаецца яму вельмі далёкім ад гэтых кустоў. Вось адсунуўся на некалькі міль. Зусім ня страшна.

Антон павольна прытуліў гарачы лоб да ценькай галінкі. Пылінкі сьнегу пасыпаліся яму на расьніцы—халодненькія і драбнюткія, нібы вішнёвы цьвет. Так прыемна...

...Не! цяпер няма як, бо разам з Сымонам прастрэліць і яго маленькую дачушку, якая села яму на каленкі. Антон чэсны. Малая не вінавата ..

А ў гэты час:

. . . . . .

...Агатка! Як будзе называцца колгас?

Так пытаецца ў дзяўчынкі тав. Сысоеў.

— Чыйвоны Кастычнік!

— Маладзец! На цукерку!

Дзяўчынка бярэ цукерку і разам з паперкай кладзе ў рот.

— Кажы „дзякуй“ дзядзю!—сварыцца на малую матка.

Малая выймае з роту цукерку і кідае на маму.

— Кажы „дзякуй“!

— Не хацу!

Злуецца мама. Злуецца і Агатка.

Сымон рагоча:

— У каго-ж гэта ўдалася яна такая ўнартая? Га-га-га!

— Распусьціў ты яе, Сымон,—злуецца Сымоніха.

У таварыша Сысоева бліскучыя акуляры на носе.

— Дзядзя, дай!—просіць Агатка.

„Дзядзя“ здымае з носу акуляры і насоўвае на носік Агаткі.

Тут ужо і Сымоніха рагоча.

. . . . . .

З нецярплівасьцю чакае Антон

..А-а-а-ж нарэшцэ! Сымон адзін пры стале. Незнаёмы спацыруе па хаце. Агатка пайшла спаць. Сымон нібы глядзіць Антону ў самыя вочы. Наставіў лоб пад прыцэл, як бы гаворыць: „на, страляй“!

...Ды ён ня бачыць мяне з вакна. Во зараз Сымон схваціцца рукою за лоб і павольна апусьціцца на падлогу... Во зараз Сымоніха загалосіць дзікім голасам, завые на ўсю ваколіцу... Праз колькі хвілін зьбяжыцца сюды ўся вёска... Я ўцяку полем. Паеду куды-небудзь. Тут усёроўна жыцьця няма...

Думкі мігацяцца ў мазгох Антона, нібы іскры.

А ў гэты час:

. . . . . .

— Сьпі, Агатачка... сьпі дачушачка... Дзядзя табе прывязе з гораду Леніна!

— Маенечкага, маенечкага..—просіць Агатка.

— Як-жа! Маленечкага!—супакойвае матка. Напявае бяз слоў:

— А-а, а-а, а-а-а!

. . . . . .

Стрэл грунуў хрыпла. У той-жа міг па ўсёй вёсцы забрахалі сабакі.

Куля трапіла якраз у шырокую прызбу Сымонавай хаты, бо нехта таргануў так моцна Антона, што абрэз з рук выпаў.

— А-а-а! Гэта ты Антон? А я сабе стаю і думаю: хто-ж гэта пад кустом ля чужой хаты засеў, як той цецярук? Ну, добра, што я трапіў, а ня ты! Ды не сьпяшы так суседзе! Ты-ж тут мабыць зьмёрз. Хадзем у хату!

Антон ня мог вырвацца з моцных рук.

Над полем пытляваўся дробны, сьнежны пылок.

Сяргей Дарожны

* * *

Журавы над вёскай, журавы,
Адлятаюць некуды, курлычуць...
Болей звабнасьцю густой травы
Сенажаці не касу паклічуць.

Ня гуляць ёй больш у моры траў,
Досыць ёй ужо тае патолі...
Пакладуць яе на белы трам
Зломкам спадчыны пад нашай столяй.

Больш ня стане на узьмежку конь,
Нам ня хопіць яго конскай сілы.
Будзе трактар нам араць аблонь
І касіцьмуць сенажаць касілкі.

Па асеньняму шумяць вятры,
На зруйнованыя, межы рынуць.
Будзем мы сваё жыцьцё тварыць
Ў песьнях радасьці і творчым рытме.

Працай згоднаю машын і рук,
Нашай дужасьцю і спорнай працай
Стрэнем новага жыцьця зару
Песьняй радасьці сустрэнем, братцы!

Суботнік

Дзень прышоў, ваканіцы адкрыў...
Паглядзеў:—трэба-ж гэтак спазьніцца!
Пагасілі даўно ліхтары,
Назаметалі нават сьвятліцы.

Стала гэтак іскрыста наўкол.
— Як-жа так?—ня уцяміць старому...
Над зямлёю ў магутнасьці кол
Нашай дужасьці шырыцца гоман.

Пужым ён паўстае і расьце,
Тчэ дратоў індустрыйныя кросны
Там, дзе буйна хвалюецца стэп,
Дзе гамоняць бяссонныя сосны.

Ён глядзіць, душыць згадка яго,
Дзівіць сьмелых намераў жыцьцё...
Гэта-ж кожнага тэмпу разгон
Дыша вернасьцю нам перш за ўсё.

Трэба так—і адданасьць расьце,
Звоняць волаты новае сілы,
Там, дзе буйна хвалюецца стэп,
Дзе пад восень туман гэткі сіні.

Кожны дзень наш, як тысяча год
Ў громе, ў стукаце—чуеш, плянэта?!
Сёньня мы абвяшчаем паход
Найвялікшыя зьдзейсьніць заветы.

Мазыршчына, 1930 г.

А. Траецкі

Старасельшчына

(Аповесьць)

I

Між лесу, як нара,—істужкаю дарога. Над дарогаю шумяць вольхі, ды вербы схіляюць ніц пасмы, у вечным смутку сваім. Паабапал дарогі густы парасьнік, пранізаны звонкімі посьвістамі птушак. І над усім над гэтым: пах здаровае раніцы, ледзь чутны шэлест ветру.

Антось заўзята крочыць па дарозе. Пад нагамі лапісты дыван ценяў. Тонкая, вышэй сярэдняга росту постаць крыху разгойдваецца на бакі, калі ступае. Пашмуляныя локці ў таўстоўцы і чорная латка на шэрых нагавіцах ад хуткасьці ягонага руху надаюць крыху сьмешны выгляд чалавеку. Не зважаючы на гэта, бялявы завостраны твар прасьвечвае якоюсь нахтнёнасьцю і энэргіяй імклівасьці.

— Скончана навука. Цяцер пара разгарнуць сябе ва ўсю шырыню.

З агнямі ў вачох гаворыць сам сабе Антось і цьвёрда ўраскідку ступае аблезлымі пашарпанымі чаравікамі.

— Мне дваццаць з гакам... На парозе жыцьця... Трэба скарыстаць яго добра... Аддам сябе, сваю сілу. Не, мяне нішто ня супыніць. Знаю: будуць перашкоды, незадаволеньні, супярэчнасьці. Усё гэта знаю і ўсё зламлю, перамагу.

І чым шпарчэй ён крочыў, тым крылацей рабіліся думкі, і кожная рыска белага завостранага твару прасьвечвала энэргіяй.

Успамінаў ён апошні разьвітальны вечар... Успамінаў сваю гарачую прамову на гэтым вечары, дзе пакляўся не адступаць і вечна ісьці наперад. Успамінаў ён тыя кніжкі, што чытаў цэлымі начамі і потым доўга-доўга, усхвалёваны хадзіў па сваім цесным пакоі.

— Я скаціна буду, калі, уразумеўшы ясна карыснасьць перабудовы жыцьця, ня спрыяцьму гэтай перабудове.

— Эх, вёска, мая родная! Усё-ж тыя шэрыя хаткі, усё-ж тыя прысады—клён ды ліпы шумяць. І гэтаксама напэўна пад клёнамі ды на прызбах зьбіраецца вечарамі моладзь.

— Праклён табе, Антось, калі ты не дапаможаш ператварэньню гэтай вёскі ў іншую.

— Не чалавек ты, Антось, тады!

І вось перад Антосем перспэктывы. Канца і краю няма ім. Адзін за адным паўстаюць жывыя малюнкі ўжо нібы пройдзенага шляху... У Антося колектыў. Антось шырока разгарнуў працу... Вось, ён ужо

едзе па крэдыт, атрымлівае грошы: мо‘ пяць, мо‘ дзесяць, мо‘ пятнаццаць, а мо‘ ?! Э, ды што, у яго напэўна паёў тысяч на сто з гакам будзе, эгэ, а тады, брат, пашло: трактар, малатарню, жняркі, а там: клюб, радыё... бібліотэка, газэты... вось яно дзе сапраўднае жыцьцё будзе; вось ён дзе народзіцца сапраўдны чалавек.

Так ад самага вагзалу імчыцца Антось на крыльлях сьветляных дум сваіх. Як прыгожыя кветкі, усьцілаюць яны дарогу, па якой так размашыста чаўкаюць падраныя, аблезлыя чаравікі. І чорная латка спрытна мільгае на сівых пашарпаных нагавіцах.

Эгэ, ды што-ж тут! Няхай хоць раз узьляцяць чалавечыя мары на гэтым улоньні прыроды. Няхай акрылацяць дух жывымі малюнкамі зямнога хараства. Любіць Антось у адзіноце памарыць пра сваю бяскрайную будучыну... Можа гэта таму, што яму толькі яшэ дваццаць з невялічкім гакам, а можа такім ужо ад самага нараджэньня чалавек вышаў на шырокі сьвет.

З гіронічнаю ўсьмешкаю на завостраным белым твары азіраўся назад, нібы баючыся, каб часамі хто не падслухаў яго думку. Скрозь ціхі шолах лесу прарэзваліся звонкія посьвісты птушак ды цені маўкліва поўзалі пад нагамі на дарозе.

II

Вярсты дзьве ад заду за Антосем па тых-жа сьлядох, губляючы лёскат па лесе, пылела хурманка. Узаду, у саломе, сярод розных куфэрачкаў ды клункаў падгойдваўся шэры капялюш. Уперадку, сагнуўшыся, местачковец Шэвель панукваў свайго чарнаватага каштана.

— Ну, ну, нё-о, нё-о.

Ня то паганяў каня ён, ня то так проста цягнуў нарасьпеў, каб не заснуць.

Капялюш сярдзіта паварочваўся, а на закацістым белым ілбе пад капялюшом выступалі чырвоныя плямы.

— Ды колькі-ж дзён ты думаеш мяне везьці?

— Ну, нё-о!

Шэвель варушыўся, шморгаў за ляйчыну. Конь, пачуўшы непакой гаспадара, уважліва аглядаўся назад, але мусіць тут-жа прыходзіў да выніку, што баяцца няма чаго, разоў тры ступаў шырэй, а потым зноў трос сваім тоўстым жыватом, ледзь-ледзь кратаючы калёсы.

— Фу, ня конь, а нейкая рапуха!

Мікола Падбельскі сярдзіта скамандваў суняць і зьлез з возу. Паправіў гальштук, абабіў парушынкі з гарнітура.

Калі ішоў, крыху папаўнелая стройная постаць яго валюхалася на бакі. Жоўтыя чаравікі ледзь-ледзь парыпвалі ў такт хадзе.

— Чорт, надало з гэтаю рапухаю паехаць. Тры дні будзеш цягнуцца.

Але хутка навакольная прырода разьвеяла злосны настрой Падбельскага. Скінуў капялюш і ўзмахам хустачкі выцер свой закацісты белы лоб. Разгладзіў пярсьцёнкі кароткіх бялявых валасоў.

Прысутнасьць невялічкага згорбленага Шэвеля сярод гэтае нямое прыроды ўзбуджала ў Падбельскім жаданьне паказаць сябе сур'езным і важным. Ён добра ведаў, што Шэвель яго лічыць напэўна яшчэ вышэйшым, чым ў сапраўднасьці ён быў, і гэта як бы прымушала яго трымаць свой аўторытэт і захаваць ілюзію ў Шэвеля непарушнаю.

Па дарозе ён адарваў некалькі красак і, як адукаваны прыродазнаўца, кожнаму экзэмпляру даваў назву па латыні, пры чым словы яго выказваліся так акруглена і цьвёрда, што Шэвель, хоць і ня знаючы іх сэнсу, мог ясна пачуць кожнае з іх.

Калі ехалі паўз луг, Мікола раптам спыніўся. На яго твары зьявілася сьпярша гіронічная ўсьмешка, але ён тут-жа ўзмахнуў галавою і ўжо з сур'ёзнаю мінаю зьвярнуўся да Шэвеля:

— Дастань мне вось тыя дзьве жоўтыя краскі за канаваю!

Шэвель пасьцяпаў плячамі, выскачыў з драбін, падбег да балота.

— Паўрубля!—нібы між іншым кінуў Падбельскі.

Растрапаўшы полы, Шэвель сігануў на купіну, потым на другую. А вось і каля канавы, ледзь відзён з травы.

— Ну, тут уляціць.

Падбельскі заплюшчыў вочы і стаў прыслухоўвацца, ці хутка шабоўсьне вада.

Шэвель памацаў пугаўём грунту, прыгнуўся і скочыў. Калі Мікола расплюшчыў вочы, дык дзьве жоўтыя краскі ўжо набліжаліся да канавы.

— Чорт, сьпікулянцішка,—сухім выйдзе!

Шэвелю яшчэ дзьве купіны—і на бераг. Памацаў пугаўем, размахнуў поламі і... паўз купіну, распластаўся на гразі. Краскі яшчэ матуляліся зьверху над травою, але тут у Шэвеля задрыжэла рука і ён жмокнуў іх у самую рэдкую гразь.

У Міколы выступілі чырвоныя плямы на белым закацістым ілбе, ён суха адрыўчата засьмяяўся і шагнуў далей. У гэтым сьмеху было і адчуваньне сілы свайго ўплыву на людзей, і самазакаханасьць і яшчэ стыхія захованае злосьці і агіды.

— Ую-юй, ох-хо-хо...

Атрэпаўся на беразе Шэвель.

— Так і быць—паўрубель за табою.

Ідучы далей, Падбельскі падводзіў да стройнае клясыфікацыі ўсе расьліны, якія можна было заўважыць на лузе. Потым ён нават перайшоў да проэктаваньня хэмічных формул розных квасаў ды соляй, якія патрэбны былі для жыцьця тае ці іншае расьліны. Тонкасьць і дасканаласьць ведаў узбудзіла на яго твары ветлівую ўсьмешку. Павольна гойдаючы стройную фігуру, адмерваў роўныя крокі.

III

Ужо два гады, як вёска Старасельцы шумела шматгалоснымі сходамі. Што вечар, калі змрок шарэў над хатамі і апошняя худая карова Арцёма-бабыля, паціху крадучыся ўсплаты, нарэшце знаходзіла свой двор—адзін за другім паказваліся на апусьцелай вуліцы сяляне. У гэты час дзед Ахрэм даўно ужо курыў люльку каля свайго двара. на сынавым бярвеньні.

— На сход, на сход!

Гукаў хто-небудзь ад самага канца сяла.

Вузлаватыя, каранастыя постаці ў кажухох, у сьвітках, паціху, не сьпяшаючы, калыхаліся да бярвеньняў.

— Здароў, дзеду!

— Здаровенькі былі!

— Як маемся дзеду?

— Ат, то скокам, то бокам.

Змрок шчыльней адступаў вакол натоўпу, і ўжо ня відаць было паасобных фігур. Чутны былі толькі розныя галасы. Далёка, у папла-вох, дзе ракою плылі шэрыя туманы, гэтыя галасы зьліваліся ў адно гучнае водгульле і разам з туманамі плылі ў шыр паплавоў, у пра-сторы ціхіх разлогаў. Насустрач ім з паплавоў пацягвала на вёску пахам ночнай сьвежасьці травы і кветак.

— Хлопцы, чакай! Дайце мне выказаць. Я езьдзіў і знаю.

— Ды, што ты знаеш!

— Якая карысьць, што езьдзіў!

— Я адно прашу, не перашкаджай.

— Дык цішэй, годзі!

Скрозь ціхі шопат, які сям-там яшчэ чуваць быў, клінам урэзва-ліся словы.

— Я вам адно гавару, што калі, скажам, вы выбралі мяне хада-талем, значыць, усё гэта я споўніў і знаю...

— То-то, усе багата знаем, ды нічога ня робім.

— Адно не перашкаджай. Пры справе, хлопцы, не забывайце, трэба хадзіць асьцярожна і бачыць усё навылёт. Часамі творыцца адно, а думаецца другое. Калі я, скажам, прышоў да гэтага самага, хоць-бы і каморніка, кажу яму: так і так, наша справа ляжыць другі год. Трэба, кажу, парадак. Які, кажа, вам парадак? Чакайце, як будзе фонд запасны—прырэжам. Пры справе гавару, мы паказалі, як і дзе можна ўзяць зямлі... яле я, браткі, бачу, што тут нешта ня та-ак.

— Э, добра кажаш—рука руку мые.

— Падбельскі, кажуць, сам мяркуе аддаць.

— Гэтаму не пярэліўкі. Ён таксама справу вядзе.

Вось Зьміцер тут нешта заблытаў!

— Як-жа: з жонкаю падзяліўся, кажа дзьве сям'і.

— Знаем мы гэтыя падзелы.

— Хлопцы, даволі. Не траплі дарма языкоў—справу мы выведзем.

Калі разыходзіліся па хатах, кожны думаў пра сваю ўласную гаспадарку, пра тое, якое надвор'е будзе заўтра і якую работу трэба будзе прыкончыць альбо распачаць. Потым думалі яшчэ і пра тое, як бы гэта і сапраўды вылузацца з абцугоў сяла. За доўгія гады жыцьця абрыдла ўжо тарэнтацца па вузкіх і далёкіх загонах. Пагубілі на іх свае косьці дзяды і бацькі, і затым клянуць іх дзеці. Ня з песьнямі ўжо ходзяць жнейкі на далёкую паласу, а з праклёнамі ёй. Павод-каю праляцелі бурлівыя гады і многа пакінулі яны дум у галовах старасяльчан. Усе гэтыя думы можна злажыць у адзін магутны вокліч чалавека: „Жыць хачу па-чалавечы, хачу бачыць сьвятло і праклінаю цемру".

Вось з гэтым воклічам і разыходзіліся па хатах сяляне.

Толькі дзед Ахрэм яшчэ застаўся на бярвеньні. Пахкаючы трэцюю люльку, ён чакаў, пакуль выплыве з-за лесу поўнік. Трэба дзеду пабачыць, як выглядае ён.

Прабег вецярок, і над лысінаю дзеда трывожна зашумеў клён.

— Прачнуўся... На дзень пераваліла... Ото-ж мой ягомасьць гучна расьцеш. Ня будзеш жалкаваць па дзеду—грунт ня кепскі. То-бо-то, дзед не пакрыўдзіць. Э, дурню стары, каб у лесе, даўно-б на абадох сапсеў! Што ківаеш чубам? Знацца дзякуеш дзеду? Эт, на-здаровейка спажывай.

Гэта дзед заводзіць гутарку з добрым сваім сябрам, з клёнам. Потым ён пераказвае клёну, як і што мае на мэце заўтра рабіць, ды яшчэ цішкам выкладае яму жальбу сваю на сварлівую нявехну.

— А, дзедку Ахрэм, як жывем!?

Цьмяная постаць наблізілася да бярвеньня.

— Ці ня сын гэта будзеш Парамонаў?

— Ён самы—Антось.

— Кажуць, нібы вучыць дзеці прызначаны ў нас?

— Так, дзеду, будзем вучыць і будаваць новую вёску.

Антось, хоць і ўтаміўся за дарогу, але ў яго столькі было маладога энтузыязму, што ён усё-ж ня мог устрымацца, каб першаму сустрэчнаму не расказаць пра свае пляны. На гэта штурхала яго і романтыка ціхае ночы, з пахамі вуліцы, па якой яшчэ ад вечару праходзілі каровы ды авечкі, губляючы ў паветры пах поту і хлява.

У часе гутаркі Антося, дзед пазіраў на краёк месяца, што выплыў за гумнамі, і паціху ківаў галавою, ня то ў такту словам, ня то сваім уласным думкам.

— То бо-то-ж, сынку, то-бо-то...

IV

Кажуць людзі, што ў Зьмітрака багата зямлі, што ён нібы расьпінаецца адзін на два сэдасы. Ды яшчэ ходзяць чуткі па ваколіцы, нібы Зьміцер і з жонкаю падзяліўся толькі ад людзкога вока. Некаторыя даводзяць, што ён заўсёды прыцемкам бяжыць да яе на хутар і нават начуе там.

Усё гэта, як той назойлівы рой камароў кружыцца вакол Зьмітра, лезе ў яго хату, зьвініць бесьперастанку яму на вуха.

Яно, можа хто і ня скажа яму ў вочы, а падумаць, дык напэўна кожны падумае.

Калі па яго, па Зьмітравым, дык усё гэта, як той кажа, людзкае зайздроснае вока робіць. Бо яно-ж так і адвеку было, што кожны чалавек заўсёды так і віжуе, каб другога зглынуць ды самому ўзбагацець. Але ня дарма-ж Зьмітра завуць пранырaю. Пляваць яму на ўсё. Ён справу сваю выведзе, ажно і вада не пацячэ. Эге, на тое-ж у яго розум.

Ідзе сабе Зьміцер і пасьміхаецца, а ў галаве—пляны-пляны... З жонкаю ён даўно правёў па ўсіх паперах, як мае быць разлуку. У жонкі двое дзяцей, і ў яго—дзьве сям'і: знацца на кожную давай надзел. Ды яшчэ ў яго ёсьць... э, ды тут не пералічыш.

І думкі, як віхор кружацца ў Зьмітравай галаве. Весела ад таго, што яны неяк хітра і штучна чапляюцца адна за другую і малююць, як на паперы, усё яго жыцьцё. Многа ў Зьмітра ёсьць зайздросьнікаў і ворагаў. Усе яны, як адзін, нібы згаварыліся і хочуць яго праглынуць, але ён тымчасам не баіцца іх. Ёсьць у яго і сябры: хутаранец Юхван ды Падбельскі Самусь. З гэтымі людзьмі не прападзеш.

Усё ніжэй да зямлі прыгінаецца невялічкая крыху прыгорбленая постаць. Вострая бародка клінам разрэзвае змрок. І вочы, нібы два вуглі гараць прагнасьцю жыцьця.

Увесь абшар палёў, што дрэмлюць пад змрокам вечару, усё гэта належыць прыгорбленаму, сухому чалавечку. І можа таму, што абшар шырокі, а чалавек, як цёмная кропка ступае па ім, таму так хочацца гэтаму чалавечку войстрымі капцюрамі трымацца за гэтую шырыню. Як той клешч, вякамі ён упіваўся ў гэтую зямлю і хутчэй гатоў памерці, чымся выпусьціць яе з сваіх капцюроў. Ды што, каб можна было, ён бы паставіў вакол гэтае зямлі высокую сьцяну, каб ні чалавечае—варожае вока, ні нават птушка не змаглі заглянуць у асяродак гэтых абшараў.

Пасма за пасмаю ўсё гусьцей павісаў змрок над полем. А над круглым паплаўчуком, між поля, над самаю травою—агромністая сівая барада: нярухома застыў туман. Зьміцер нырнуў у гэтую сівую бараду. Цьмяным вузьляком хутка пераімчаў цераз паплаўчук, вынырнуў з туману і галушкаю пакаціўся па разоры між аўса. На самым абрыве ў лог перад Зьмітрам, як з-пад зямлі выплыла фігура Васіля Канцавога.

— Здароў, Зьміцер!

Гэта як капурам зьверху на худога чалавечка.

Хадзіў, знацца, да твае жонкі. Праціла тое-сёе дапамагчы.

— Хэ-хэ, які ты, Васіль, ўсё-ж дзівак. Дзе яна, скажам, мая жонка. Дзякуй богу, я цяпер сам сабе тубалец.

Васіль адрыўчата чмыхнуў у шчаціністы вус.

— Добра ка-аш, з бабаю кепска, а бяз бабы яшчэ горш. У мяне-то баба яшчэ крыху ліпіць, але вось выгнала, далібог выгнала. Ідзі, кажа, пад чортаву мацеру туды, дзе робіш. Яно, думалася чалавеку, мо, якую залатоўку абаб'еш на баку—хоць бы, скажам, у твае бабы.

— Што ты, Васіль, я заўсёды кажу, ты—чалавек душа.

— О, зьвяліся ўжо такія людзі у наш век.

Зьміцер патаптаўся на адным мейсцы, патурзаў сваю клінаватую бародку.

— Але ты, братка, ня крыўдуй, калі я скажу праўду, дальбог ты нейкі дзівак ды і годзе. Якая яна, скажам, цяпер мая баба. Як той кажа разышліся... Хэ-хэ, гэта я ўспомніў, як яна, брат, адзін раз мяне турзанула... Дальбог чуць жыў... Ты-ж сам, братка, ведаеш, як таго бывала ляманту на ўвесь хутар, пакуль гэты самы падзел.

І можа таму, што Васіль быў значна вышэй ад яго і цень Васілёва падала ў самы ніз абрыву, Зьмітру здаецца, што ён як бы пасьміхаецца і ня верыць у сапраўднасьць яго слоў.

— Дальбог, праўда, братка.

Аглянуўся вакол сябе і дадаў ціхім шэпатам:

— Думаеш, братка, ня ведаю, у якія, знацца, хоць-бы ты, заработкі ходзіш. Хэ-хэ, але мне цяпер, чорт яго бяры... Ой-ой, колькі баб на сьвеце... Абы ахвота..

— Ну то бывай!

Васіль пайшоў у цемень.

Ня ўспеў і дзесяць крокаў ступіць, як каля яго зашуршэў авёс.

— Ты, братка, там ня то, што... скажам так, як-бы ты мяне і ня бачыў... думаеш да яе іду? Не, каб я з гэтага мейсца ня ўстаў, пад чортаву мацеру... яж кажу, баба знойдзецца...

Але Васіль ужо ня слухаў яго і гулка крочыў па цьвёрдай ўтоптанай мяжы. За ім усьлед па аўсох яго доўгая цень.

І сьмешна было тады сухому чалавечку глядзець на ўсё гэта. Трос бародкаю і яшчэ спрытней бег, перакульваючыся па сьцежачцы.

Тонкі серп месяца срэбрам рассыпаўся па аўсох.

— Дзівак Васіль нічога ня знае. Ха-ха... яно, скажам, у мяне жонкі так, як і няма, але яшчэ пабачым, як заскачам.

Сьмяецца чалавек таму, што ён як-бы хітрэй за ўвесь сьвет, і што ніхто ня будзе знаць яго сакрэтнае думкі, а думка надта хітрая і што гэта сам ён яе прыдумаў, а не сказалі яму іншыя.

Старая ліпа ціхутка шапталася над ім, калі ён падкрадаўся да вакна, каб запэўніцца, ці няма каго чужога ў хаце.

Скрып дзьвярэй і ціхі гоман на ганку прымусіў яго прысесьці за ліпаю.

— Пані Зьмітрыха, чаму-б вам, скажам, не прадаць хоць-бы да часу гэтую кароўку. А я чалавек такі—у мяне шыта-крыта.

— Хто-ж яго знае, каб ён быў.

— Ух, які гэта Падбельскага сын пан стаў. Уй-юй-юй...

Зьміцер кашлянуў і праз кусты смуродніку пашыўся на ганак.

— А, пане Зьміцер, як маемся?

— Нешта начамі даяжджаеш ты сюды... Ох, глядзі, каб ня вылупіла Шэвеліха барады.

— Пане Зьміцер, ня сьмейцеся з Шэвеля. Ён патрэбны чалавек... Ух, пан гэты Падбельскага сын стаў... Чысты, белы. Уй-юй-юй... Стары казаў, каб хоць і кулі з неба туды дасталіся—мае сакрэтную справу сказаць... Бывайце, Зьмітрыха... А мо' асьміну картоплі, пане Зьміцер, трэба Шэвэлю ў воз, каб было на чым сесьці?

У Зьмітра з Шевелем адвечныя гішэфты, дык асьміну бульбы для яго ня шкода.

Насыпаючы бульбу, яны паціху шапталіся ўдвох. Ёсьць у іх на мэце сякія-такія гішэфцікі, і калі пойдзецца яно рукою, то нават паў сотню можна будзе закінуць.

Потым дзьве пары ног дружна пакрочылі да хлява. Заскрыпелі вароты, і гучны лёскат калёс шпарка пакаціўся ў цемень у палі.

Ідучы па дварэ Зьміцер узьбіўся на парожнія калёсы і можа ад гэтага, а можа зусім з іншае прычыны яго прашыбла злосьць.

— Калі вока свайго няма, дык робіцца ўсё, як нарокам. Гэць работнікаў знайшла... Васіль ёй работнік! Кожны толькі, каб развалачыць чужое. Не, мы яшчэ пабачым, хто гаспадар. Ня выпушчу кажу з сваіх рук, ня выпушчу... Я гаспадар, я тубалец... Маё і маю права рабіць, што хачу... Няхай зьем, няхай спалю, што каму да гэтага!

— Тата плісоў!

Гэта малая дзяўчынка сустрэла на ганку Зьміцера.

— Маўчаць гавару пра тату, і нікому ані-ні...

— Цаму?

— Таму, што я кажу.

— А цаму так?

Кажу табе, што ня можна, а калі дачуюся,—разьдзяру, як гадзіну, праганю вон і есьці ня дам.

— Я нікому, не казала 'шчэ...

Дзяўчынка адыйшлася ў куток. Пытаньне „цаму" разам з пальцам, які яна ўлажыла ў рот, застыла ў нярухомасьці.

— Нешта мая сярэдзіна баліць... Мо' падвярот.

Гэта жонка засьцілае абрус на стол і як-бы сама сабе гаворыць.

Але Зьмітру здаецца, што гэта закід на яго бок, і таму так спрытна ён забегаў па хаце.

— Ото ж, прыслухайся толькі... Знацца патаміліся ўжо, як ня будзе часу слухаць, то перастане і балець.

— Чужая болька, нікомў ня колка.

Можа таму, што так плытка хадзіла жонка па хаце, ды так нахабна выстаўляла перад Зьмітрам свой акруглены жывот, яшчэ болшая злосьць падхапіла яго.

— К чорту з болькамі сваімі!.. Чуў, чуў ужо гэтыя песьні Годзе... Дзякуй богу пажылі...

Яшчэ шпарчэй забегаў па хаце, трасучы па сьцяне клінаваты цень ад бародкі.

Мо‘ яно і ў Зьмітра што баліць, але пляваць яму на ўсё... Ён ня хоча назаляць. Яму трэба справу весьці. Яму трэба жыць: мо‘ дваццаць, мо‘ сорак, мо‘ сто год... без канца і краю... Сьмешна і думаць, каб калі-небудзь Зьміцер памёр. О, не, у яго справы, справы, ха-ха-ха...

— А жывот у цябе не баліць?

— Чаго сьляпіцаю лезеш, хто прасіў цябе сюды прыходзіць.

— Як прасіў?!.. Куды-ж я прышоў, у чужую клець мо‘?.. Я ў сваю родную дамоўку прышоў.

Мабыць табе яна лішняя, калі пакінуў.

— Бачыш, бачыш, а, онь яно што! Ці не памагатыя гэта на чужы хлеб падсяброўваюцца?.. Ужо мо‘ знайшла?

— Адстань, кажу!

Як-бы назнарок нясе свой акруглены жывот паўз Зьмітра. Пад нагамі парыплая падлога, і голыя лыткі паблісквaюць у хвальбонах.

Плюнуў, затупаў нагамі

Выходзіць, што нібы ён адзін толькі кіпіць агнём вечнага руху. Навокал яго лёд... Нікому нічога ня трэба. І ўсё тое, чым адвеку жыве Зьміцер, як аб халодную сьцяну разьбіваецца аб поўную круглую постаць жонкі. Дык што-ж гэта?... Навокал ворагі. Перагрызу, задушу...

V

Да абеду Антось пайшоў аглядаць бацькаўскую гаспадарку. Усё пастарэла, абсунулася за гэтыя гады. На хлявох вецер паўдзіраў стрэхі, а гумно, як рэшата, сьвяцілася на адных дзірках. Відаць было, што бацька даўно ўжо махнуў рукою на сваю гаспадарку, як і на сваё жыцьцё.

„Ат, жывом як да часу“ былі першыя словы бацькі, калі Антось прышоў да хаты. На хлявох, на гумне, і нават на самай хаце відаць было гэтае жыцьцё, як да часу. На хаце комін даўно ўжо абярнуўся, і замест яго дым, як праз рэшата сачыўся праз дзіравую гонту, а на дзірцы, дзе павінен быць комін, ляжаў абвуглены сажай, яловы луб.

— Трэба было-б цэглы, ды хоць на страху вывесьці. Але ўсё ж, як той кажа, думаешь чалавек: дзень—век, а другі—наддатак.

Пры гэтым бацька нядбайна махнуў рукою, што азначала: каб як дажыць, а там хоць і трава не расьці.

— Нічога, бацька, заблытаўся ты і так з гаспадаркаю. Сілы няма даглядзець і шкода кінуць. Трэба толькі згода,—заснуем колектыў—тады ня будуць так бяспрытульна прападаць людзі—вось так, як ты.

— Эт, плявузгае... Зладзеяў поўнае сяло, а ён згода...

Плюнуў і расьцёр лапцем.

— От, абы як трохі з большага пражыў ды і ліха яго бяры.

Закашляўся і ўсё тым-жа нядбайным узмахам рукі падкрэсьліў сэнс сваіх слоў.

Антось доўга ўглядаўся ў сухую, хваравітую постаць бацькі. Сухі, абымшэлы шэры чалавек. Як праз сон, глядзіць ён на ўсё сваё жыцьцё. І ня толькі на сваё, а і на ўсё, што могуць бачыць яго сінія павольна застылыя вочы. Трудна было паверыць, што гэты чалавек быў калі-небудзь малады, і што прагнасьць жыцьцёвае сілы напаўняла яго.

На двор вышла худая кабылка. Паляпала губамі ў пустым карыце, пастаяла, паглядзела на бацьку, на Антося. Нешта прашамкала адвіслаю губою, ды зноў паклыпала да хлява.

— От, ліха ёй, выхудала... Но, каб цябе ваўкі, клыпай!...

Бацька схапіў ламіну і тарарахнуў па рэбрах кабыле; ад гэтага яна чуць увагнулася і скрывіўшы на бок шыю, нібы ў апраўданьне свае віны, мяльнула языком. Бацька неяк сьмешнавата задыгаў доўгімі нагамі. Схапіў другую поплісу і яшчэ раз швырнуў на кабылу.

У кожным руху бацькі Антось мімаволі прачытаў: жаль і агіду да гэтае нуднае жывёліны і яшчэ падкрэсьленае жаданьне прагнаць яе з вачэй.

Можа затым, што ў вачох жывёліны было тое-ж самае „жывом, як дачасу“, а можа гэта бацька хацеў, каб хаця сын яго ня бачыў гэткае плюгавае каніны.

— То ліха-ж ёй, ня есьць нічога, ды ўсё дохне.

Гэта прагучэла апраўданьнем перад сынам. І скрозь кіслую ўхмылку на худым абветраным твары Антось ясна прачытаў заблытанасьць у жыцьці чалавека і вечную боль духу.

Як і помніць Антось, бацька яго заўсёды жыў непалюдзку. Калі бывала лезе на печ ды стукнецца галавою ў нізкую бэльку, то амаль кожны раз скажа: „От, каб гэта былі грошы, як іх няма, хоць-бы хату паставіў добрую ды печ зрабіў, а то давіся“. Але яго „каб“ так і застаўся вечным „каб“—прышлося век дажываць у старой хаце.

Усе гэтыя ўспаміны і сам знадворны выгляд бацькі-гаспадара, з яго дачасоваю гаспадаркаю, выклікалі ў Антося жаль і абурэньне.

„Вось, яны абломкі старога жыцьця. Чалавек дажывае апошнія гады, а спытай, што ён бачыў у жыцьці? Чаго дамагаўся? Да чаго ішоў? Якая цікавасьць з яго жыцьця? І на ўсе гэтыя пытаньні гэты чалавек нядбайна махне рукой і скажа: „Ат, жыў як дачасу“. Ды горш таго яшчэ, ён напэўна зьдзівіцца, дзеля чаго вы пытаеце і як гэта іначай можна жыць“.

— А як тут сяло? Куды думаюць?

— Меркавалі адразу на хутары, але мабыць ператаўкуцца да дохлі ў сяле. Ат, ё пра што гаварыць...

І ўсё той-жа нядбайны ўзмах рукі, і ўсё тое-ж „дачасу.“

Антосю хацелася разбудзіць у грудзёх бацькі хоць крышку жаданьня ісьці ўперад. Яму хацелася натрапіць хоць адзін вугальчык у гэтым хваравітым, дачасовым чалавеку. Можа тады-б сілаю свайго энтузыязму і энэргіі яму ўдалося-б зьвярнуць да жыцьця гэты жывы труп. Але, чым далей ён пушчаўся ў гутарку, тым ясьней станавілася, што бацька яго акасьцяневў. Па думцы гэтага абымшэлага чалавека выходзіла, што ня толькі ён адзін, але ўсе, хто ёсьць жывы вакол яго і нават цэлы сусьвет, ня жывуць, а таўкуцца ў жыцьці „як дачасу". На ўсе пэрспэктывы і пляны новага жыцьця, якія разгортваў перад ім Антось, ён так-жа махаў рукою, як і на сваё ўласнае жыцьцё.

— Навошта жыць? Навошта звацца чалавекам, калі ня мець перад сабою мэты і ня імкнуцца да яе? Няхай ня дойдзем, упадом на дарозе—другія пойдуць праз твой труп. Але ўсё-ж такі ты ішоў, ты гарэў жыцьцём. А гэта?...

Антось адвярнуўся, каб не глядзець на бацьку. Так мізэрнай паказалася яму гэтая шэрая постаць, так пуста і холадна ў ёй. Ходзіць нібы жывая адвечная пародыя на чалавека. Эх, пракляцьце, нікчэмнасьць!..

Разам з гэтым Антось ясна адчуў, што крыльлі яго залатых мараў, на якіх імчаў учора ўсю дарогу, як-бы аслабелі. Ужо яны ня імкнуць увысь, у бязьмежжа прасторaў, а паціху, ледзь чутна спускаюцца ўніз. І куды?.. У гэту шэрую тхлань, у пустэчу... І як далёкія акорды мімаволі навіваюцца словы:

— Антось, брат, нічога ты ня зробіш. Вакол цябе цёмная восенская ноч, і блудзяць у гэтай начы ледзь прыкметныя шэрыя постаці. Навошта злуеш на бацьку? Ці ня бачыш яго заношанага жыцьцём твару? Куды штурхаеш гнілую калоду—кара можа трэснуць, і калода праваліцца. Пасыплецца тады з калоды гнілая парахня, з брудам і атрутаю, якія зьбіраліся праз век на зямлі, і ёй-жа аддасца, як спадчына, як падарунак дзецям. Не чапай лепш калоды, няхай дагнівае яна сама сабою, а не—спалі яе, бо для новага будынку яна ня варта.

І толькі, калі прышоў да школы,—зноў узмахнуў крыламі. Стаяла школа на ўзгорку за сялом. Сьцены, лаўкі, сталы—усё новыя, толькі з-пад гэбліка. Кругом вокны, сонца, сьвятло... Гостры пах сасны. Сьмелыя крокі гучна адзываліся ў сьценах. Клясы даволі раскошныя, габінэт для настаўніка таксама.

„Эх, Антось, брат, ня спускай галавы, сіла пераможа сілу. Ня мерай ўсіх аршынам свайго бацькі. Гэтыя адыйдуць у нябыт. Табе кінуўся ў вочы адзін бруд жыцьця—не забывай, што ёсьць у ім і жывыя людзі... Вось, тут у гэтай клясе будуць глядзець на цябе дзесяткі шэрых вачэй, запалі ў іх агонь прагнасьці да жыцьця, да агульна-людзкага шчасьця.

А тая моладзь, што вечары праводзіць на вуліцы пад клёнамі ды траціць маладыя сілы на выпіўкі ды бойкі! Гэта людзі, браток; ды аблытаны іх крыльлі шэрым брудам вякоў.

Антось, у табе ад нараджэньня твайго сядзіць чалавек вечнай імклівасьці, а калі ты прымусіш яго стаяць на месцы—ня жыць табе тады".

З гэткімі разважаньнямі стаіць Антось каля вакна. Вочы яго прагна глядзяць удалячынь, за вакно, на поле, і белы завостраны твар прасьвечвае шчырай натхнёнасьцю жыцьцём.

За вакном пярэстасьць загонаў. За школьным агародам пыліць па дарозе хурманка.

Там далей бялее жыта і відаць, як кланяюцца ў постаць белыя, чырвоныя макаўкі—пачалося жніво. Адтуль, ледзь чутна з ветрам плывуць песьні. Антось адчыняе вакно. Відаць сяло: азяроды, шэрыя гумны, грушы-дзічкі ды ліпы з клёнам. І над усім на гэтым:—павольны вецер з песьнямі.

„І ты, нібы рад гэтаму. Ва ўсім у гэтым ты адчуваеш романтычнасьць жыцьця. Ты сядзіш і доўга думаеш. Ты слухаеш пераборы струн псыхікі свае. Ха-ха, няшчасны сьляпы! А ці забыўся ты на тое, што ў гэтай романтыцы людзі праклінаюць жыцьцё і век свой жывуць, як да часу.

Ня ў гэтым і шчасьце, Антось, ня ў гэтым!"

Устаў, прайшоўся па клясе. Падлога ўздыхнула і адазвалася ў такту крокам.

„За справу, брат, за справу!"

VI

Хто ня ведае старога Падбельскага—гэта чалавек паважны і на жыцьцё глядзіць ён крыху з усьмешкаю. Яму ўдалося перахітрыць сьвет. Сына вывеў у людзі, і дачка таксама на паўдарозе. Няхай машкара тады таўчэцца вакол яго. Хоць насы пазрывай адзін другому.— Падбельскаму што! На вяку ён прывык скакаць пад якую хочаш дудку, абы адыйшло за яго. Хіба няпраўда? Паглядзець толькі на сына—лялька чалавек: у гальштуку, чысты, прыбраны. А што галава!.. О, якімі справамі варочае.

Хоць і блытаюцца непаслухмяныя ногі ў старога Падбельскага, але ўсё-ж ён ходзіць важна. І пільчак сёньня на ім белы, сьвяточны. Яшчэ даўнейшага фасону.

— Жонка, то ты-ж мая таўстушка, наконт вішнёвачкі паклаптуй.— Секаном хоць па чарчыне.

— Я-ж кажу, самае галоўнае пад стацьцю падвесьці...

Гэта хутаранец Юхван грыміць тоўстым басам. Пярэстая, напалову пасівелая барада яго тапоршчыцца, як асмаленае памяло. Агром-

ністым кулаком адбівае ў такту словам па стале. Ад гэтага лысенькі папок, пры кожным узмаху кулака ўхмыляецца скрозь прыжмуры маршчынак і часьценька міргае.

Ты, скажам, поп, ну, а я гаспадар... Кожны з нас моліцца ў сваю кішэню—гэта раз.

Попік заморгаў і чуць узьняўся на сваім крэсьле.

— Стой, гавару, не перабівай! Свае песьні ты сьпявай таму, хто справы ня знае... Я, хутаранец Юхван і пляваць мне, за прабачэньнем, за твае песьні. Даўней—справа іншая, а цяпер—няма, брат, з іх карысьці і на капейку... Ну, дык як ты Зьміцер мацуешся?

Юхван грузна павярнуўся ў бок Зьміцера, што ў дачыненьні попіка азначала: „сядзі і ня лезь куды ня сьлед".

У гэты самы момант Мікола Падбельскі прыводзіў у парадак сваю асобу. Пакой, у якім зьмясьціўся Мікола, быў даволі прасторны. І таму ўсе шклянкі ды пляшкі з рознымі расьлінамі былі пастаўлены ў два стройныя рады на знарочыстых услонах.

Мікола пад рыпы чаравікаў прайшсўся між радоў. Уважліва агледзеў кожную расьліну, азначыў вышыню росту за суткі ў графу для кожнага паасобнага экзэмпляру.

Усьміхнуўся, падышоў да люстра. З глыбін зеленаватага шкла выплыла насустрач стройная фігура ў новым чыстым гарнітуры, і зацісты белы лоб адсьвечваў павольную ўзьнятасьць настрою.

Мікола раптам уявіў сябе на справаздачы сваіх навуковых досьледаў. Цэлы рой крылатых думак заварушыўся ў яго галаве. Ён пачаў перад люстрам размахваць рукамі.

— Не, стой, гэты рух фальшывы... Галоўнае—координацыя руху і слова. Гармонія інтонацый і думкі—прамоўцава перамога.

І вось тут, няпрошаным госьцем паўстаў адзін выпадак з яго яшчэ студэнцкага жыцьця:

„Мікола крочыць па тратуары. Цераз вуліцу на другі бок прафэсар ботанікі сухі чалавечак. Мікола хоча знайсьці прычыну, каб падыйсьці і загаварыць з прафэсарам. Яму хацелася заваяваць сымпатыю да сябе ў гэтага замкнутага чалавечка. Колькі разоў перад гэтым пры канцы лекцыі ён падбягаў да яго, задаваў навуковага характару пытаньні, выказваў сваё жаданьне пазнаёміцца шырэй з дадзеным прадметам. Ветлівасьцю сваёй усьмешкі стараўся зрабіць перад ім рэвэранс. І... о, гора студэнту! На ўсё сухі чалавечак даваў сухія адказы, як і кожнаму другому з аўдыторыі. Гэта падымала цэлую буру ў Падбельскім. І што-б там ні было, ён паставіў на тэму дня заваяваць гэтага чалавечка. Куды-б ні пашоў, дзе-б ні павярнуўся, гэты „бог" навукі, Мікола заўсёды сачыў за ім. І вось, як на тое, у бога навукі з кішэні выпадвае белая хусьцінка. „Бог" навукі ня бачыць і памахвае качарэжкаю далей... Падбельскаму прычына... Падбельскі на ўсе лапаткі бяжыць цераз вуліцу па хусьцінку. Адкуль чэрці бяспрытульніка нанесьлі—хваць і папёр... Мікола за ім... У

Міколы змаганьне з самім сабою, але жаданьне аўторытэту перамагае ўсё. Бяспрытульнік атрымлівае дзесяткі штурхачоў і спатырчом ляціць у гразь. Міколу няма справы да гэтага. З хусьцінкаю ў кішэні ён імчыць далей і яшчэ за паўквартала да сухога чалавечка кладзе на твар міну ветлівасьці, а на губах рэвэранс перад „богам“ навукі.

— Ікс Ігрэкавіч, вы загубілі хусьцінку.

Сухі чалавечак цераз акуляры глядзіць сьпярша на Міколу, потым на хусьцінку, потым зноў на Міколу.

— Вы што, студэнт?

— Так-так,—пасьпяшаўся Мікола.—На апошнім курсе. Слухаю вашы лекцыі і вельмі цікаўлюся прадметам.

— Гм, тэкс, нешта ня помню.

— Калі ласка хусьцінку.

Але тут наляцеў аўтобус і абляпіў профэсара гразёю. Сухі чалавечак зачырванеўся, схапіў хусьцінку і швырнуў у гразь.

— Я вас прашу не мазоліць вачэй.

Злосна запырхаў і пусьціўся далей.

— Чорт!

Мікола з кіслай мінаю адышоў у бок ад люстра, як-бы сапраўды яно было прычынай такіх успамінаў. Праз дзьве сьцяны цераз калідор грымелі словы Юхвана. Мікола накіраваўся да дзьвярэй. Яшчэ ў калідоры ён чуў, як бацька шопатам паведамляў: „ідзе, ідзе“.

Калі прачыніў дзьверы,—усе прыціхлі. Попік сьпешна прыпадняўся і працягнуў нават уперад потную руку, але Мікола пачаў з Юхвана і попіку прышлося яшчэ раз сесьці, а потым устаць. Гледзячы, як здароўкаецца з другімі Мікола, ён прасьвечваў свае прыжмураныя маршчынкі наіўнаю радасьцю. Як-бы і сапраўды ў гэтым было вялікае для яго шчасьце. Хоць пад сподам у псыхіцы, ён глыбока быў абражаны тым, што яго лічаць тут як-бы апошнім.

У Зьмітра вочы загарэліся зайздрасьцю.

„Хай-бы гэта мой сын быў такім.“ І ў думках ён цьвёрда рашыў выставіць свайго сына на гэткую самую дарогу.

Стары Падбельскі з гонарам падкручваў вусы, і вышаўшы на кухню, шаптаў на вуха жонцы:

— Не лайдак, твой Самуська, маё яблычка. Бач якога сынка змайстраваў. Хэ-хэ, ажно суседзям зайздросна. Сяк-так, як той кажа, то скокам, то бокам ды ў людзі вывеў.

— От, маўчы дурны, бо‘ шчэ хто пачуе.

Ад жонкі на Падбельскага павеяла потам і кухняю.

— Не падкачала і ты, мая рыбка. На-ж табе пляскачыка за гэта.

Ото-ж, аж дрыхцяць кумпячкі... Адзін пляскачык, два пляскачыкі, тры... цыц, сынок...

За дзьвярамі чуваць былі ясныя акругленыя словы сына. Гаварыў поўнымі і лёгічна закончанымі сказамі. І на слух можна было пазнаць, што ён ня толькі цікавіцца сэнсам, але можа самае галоўнае, формаю выказаных слоў. Былі ў яго некаторыя асабліва любімыя славечкі, якія ён часта паўтараў і заўсёды ў розных інтонацыях.

Стары Падбельскі, на пальчыках азіраючыся і падміргіваючы жонцы, патрос белым пільчаком да дзьвярэй.

— Па закону Дарвіна, вялікага генія сусьвету, у прыродзе вечна адбываецца змаганьне за сваё жыцьцё, за мейсца сваё між тысячамі і мільёнамі роўнапраўных экзэмпляраў.

— І вось, вы, законьнік, прапаведнік паднебнае моралі, чалавек, адсунуты гісторыяй на зады. Вы на сваёй шкуры цяпер бачыце, што жыцьцё—гэта змаганьне за існаваньне. Дзе трэба поўзай—дзе можаш ламі. У гэтым афорызьме ўся філёзофія нашага жыцьця. Вы, кажаце, ідэі? Вера?.. Ды што-ж такое гэтыя пустыя словы, калі не ўвасабленьне таго-ж самага афорызму. Ламі і поўзай—вось яно славечка генія—эмблема жыцьця прыроды, у самым шырокім сэнсе гэтага слова.

Пры кожным вучоным слове попік усьміхаўся скрозь маршчынкі, як-бы нарочна даваў знаць другім, што слова гэта ён добра ведае і ня раз чуў.

Зьміцер церабіў бародку. „Ламі і поўзай“. Гэта аформіла яго пад сьвядомы інстынкт жыцьця. Калі праўду сказаць, то ён усе свае сорак год пражыў строга ў гэтакім кірунку... Эгэ, ды што-ж? Раз ламаць, дык ламаць. Прэч з дарогі Васілішкі, ды розныя там зайздросьнікі— Зьмітру давай ход.

Мікола Падбельскі сам ня ведаў, навошта пачаў ён выказваць свой монолёг... Хутчэй ўсяго гэта было проста жаданьне выліць патэнцыю, якую гадамі затаіўшы насіў у сабе. Такія погляды на жыцьцё ён рэдка каму выказваў.

Пад рыпы чаравік важна адмерваў крокі.

Белы лоб прасьвечваў буру пачуцьця.

— Чалавек—найхітрэйшая жывёла, і для таго, каб жыць, ён мае права на ўсё. Трэба мець сілу волі ламаць. Трэба навучыцца з мінаю шчасьця поўзаць. Калі поўзаеш, ты павінен адчуваць у гэтым вялікую радасьць жыцьця. Мала думаць, мала лічыць богам таго, перад кім поўзаеш. Трэба быць яшчэ і самому шчасьлівым. Той, хто, поўзаючы, будзе псыхолёгічна шчасьлівым—перад тым усе дзьверы расчынены. Поўзаць далёка не лягчэйшая роля, чым ламаць. Хто ня ўмее ні поўзаць, ні ламаць, будзе расьціснуты, як мурашка калясом жыцьця.

Мікола так рапартаваўся, што нават забыў, з кім мае справу. І толькі, калі ўбачыў, што Юхван даўно ўжо дрэмле, а попік заместа таго, каб усьміхацца, аплятае парасяціну, убачыўшы гэта, Мікола крута абарваў прамову і вышаў у свой пакой.

Праз гадзіну Падбельскія крочылі па садзе. Адзін высокі ў гальштуку ступае паважна, парыпвае чаравікамі. Другі шмат ніжэй, няроўна блытаецца нагамі, трасе белым пільчаком.

— Зямлю, бацька, ты павінен здаць усю. Пакінь сабе ня больш дзьвёх дзесяцін. А гэта дзяўчына, адкуль у цябе?

— З старасельцаў.

— Скажы, каб больш ня прыходзіла—разьлічы. Я твой сын, і ты знай, аб чыім жыцьці ідзе рэч. Гаварыў табе даўно, каб жыць, трэба быць політыкам. Ты, гэта разумееш, што нам насёньня выгадна стаць Арцёмам-бабылём?

— Яж-ні...

— Цыц, больш ні слова. Гэтымі днямі мне неабходна ісьці ў „народ“—тады вырашыцца ўсё далейшае.

(*Працяг будзе*)

Т. Кляшторны

С н ы

У нашу эпоху ня мейсца гульні...
Кіруем уперад надзейна...
У нашы вялікія, слаўныя дні—
Нэрвовыя людзі, нэрвовыя дзеі.

Між дзённае працы ня любім прыкрас,—
А ўночы, калі засынаем,
Мы сэрцам прымаем сягоньняшні „ТАСС“,
Мы радыё-хвалі чытаем.

Я так-жа спрасоньня пачаў гаварыць,
Часамі ўзьнімаючы вэрлах...
Штодзённыя дзеі да раньняй зары
Іграюць на струджаных нэрвах.

Мне сьніцца надзейная воля брыгад,
Комбайны і трактары сьняцца...
Я трызьню скрозь морак, нібыта вар'ят,
Аж сорамна неяк прызнацца.

Хаця я ад вёскі далёка даўно,—
Яна-ж паўстае, як жывая...
І вера, і побыт, межы дзядоў
Апошнія дні дажываюць.

Жывое імкнецца па-новаму жыць,
Дзе рухнулі вежы старыя,
Дзе колісь на кожнай сялянскай мяжы
Паставіў аўтограф Сталыпін.

Яго вартаваў там учорашні раб,
Стаіўшы у сэрцы праклёны...
І гэты сталыпінскі рошчарк пяра
Трымаў пад загадам мільёны.

А сёньня да новай, да творчай вясны
Вяслуюць мільённыя вёслы...
Нязломны, магутны, як сьвет, рулявы
Кіруе Кастрычнікам вёскі.

І тое, што колісь жаданьнем было,—
Сягоньня, як сонца, рэальна...
Сьцірае адвечную плесьню балот
Магутная песьня комбайнаў.

Таму вось штодня правяраем сябе
І дома і ў творчых майстэрнях...
За кожны учынак, за кожны прабел
Адказнасьць нясем перад эрай.

Таму вось ня любім ніякіх прыкрас,
І нават, калі засынаем,
Мы сэрцам прымаем сягоньняшні „ТАСС“,—
Мы радыё-хвалі чытаем.

У нашу эпоху ня мейсца гульні...
Кіруем уперад надзейна...
У нашы вялікія, слаўныя дні—
Нэрвовыя людзі, нэрвовыя дзеі.

I

Зоранька ясная,
Ветлая,
Пачакай за вокнамі шалясьцець!
Нэрвы працай струджаны...
Зморанасьць!..
Сон ня йдзе.

—•—

У люстры хістаецца месяц,
А зоры прыстылі да шкла...
Мне сьняцца вясковыя далі
І шумныя сходы сялян.

Сьпяваюць чацьвёртыя пеўні,
Ды вёска чамусьці ня сьпіць...
Пад сіняй заслонай махоркі
Хаваюць учорашні дзень.

Хаваюць там даўнія межы,
Хаваюць царкву і званы...
Хаваюць там дзедаўскі побыт
І кола зганьбованых дзей.

II

Даўніх меж
І даўніх тэмпаў больш няма!
Гром падзей душу ускалыхнуў...
Адбудуем
„Волат-сельгасмаш“
У Растове,
У Растове-на-Дану.
Гэй дружней!..
Мацней ударым там і тут!

Адбудуем!..
Абсталюем
На Украйне „Трактарбуд".
Шле нам трактары Масква і Ленінград,
Не адстане такжа Сталінград.
Каб жыцьцё інакш перарабіць—
Дасьць комбайны нам Новасібірск.
Каб сваёй магутнасьцю зарэць,
Каб краіну вольтамі сагрэць,—
Дык шпарчэй уперад
Там і тут!..
Адбудуем слаўны Асінбуд.
Хай бягуць у далечы дарог
Міліёны сіл па правадох.
Даўніх меж
І даўніх тэмпаў больш няма!..
Гром падзей душу ускалыхнуў!..
Адбудуем
„Волат-сельгасмаш"
У Растове,
У Растове-на-Дану.

III

Так плыве за гадзінай гадзіна...
Сьняцца дзеі жыцьця бяз прыкрас...
Гэты сон дзесь губляецца, гіне,—
Пачынаецца новы сэанс.

Засьпявалі у полі дзяўчаты...
У бязьмежжы іх сьпеў замірaў,
Дзе туліўся туман сіняваты
Пад зарою вясны загараць.

Гэта песьня машыннага рытму,
Гэта дзень нашу моц вылічаў...
Гэта сьпеў без паганскага міту
І трагічных трывог палачан.

Так выразна ад кожнае гаммы
Веяў творчы парыў маладых...
Адчуваўся запал нястрыманы
І магутны, як сталь, колектыў.

IV

Сьпевы дзяўчат.

Блудзіць месяц над гаямі,
А гаі паснулі...
Трактарысту васількамі

Вышыю кашулю.
Для Іларавай кашулі
Нават мяты пашкадую.

На твае Ілары плечы
Я мяшок адзену...
Крапівою,
Ды пякучай
Вышыю каўнерык.

Каб рахманы быў надзіва,
Каб ня вешаў галавы,—
У падол нашыю дзідаў,
Дзеразы у рукавы.

Ходзяць зоры над гаямі,
А гаі паснулі...
Трактарысту васількамі
Вышыю кашулю.

V

Каля ветлых кляновых прысад
Раптам сьціхлі прыпеўкі дзяўчат.
На вазёрах кавур зарыдаў...
Хтосьці скрыпку мне моўчкі падаў...

І маўляла мне скрыпка тады:
— Вось прыпомні былыя гады,
Калі быў у пажары сусьвет,
Калі жыў твой калішні сусед,
І напэўна пазнаеш мяне?

— Быў ён слаўны музыка, якіх
Больш ня знойдзеш між вёсак глухіх.

— Я кранала, як ружу агонь,
І душу і пачуцьці яго.

— Ды пакінуў музыка мяне,—
Многа часу была на сьцяне...

— Грамадзянін музыку сказаў:
— Вось вінтоўка, ідзі партызань!..

— Чым вялікі Кастрычнік аддаць,
Лепш магілу у полі прыдбаць.

— Эх, музыка!.. Ня знойдзеш такіх,
Ды сканаў ад бандыцкай рукі.

— З тых часоў між імшараў глухіх
Я іграю хаўтуры,

Для іх,
Для паноў,
І для катаў былых.

— Я іду ў гарады і палі
Рэволюцыяй сьвет запаліць.
— Хай адчуе працоўных душа,
Што мацнее компартыі штаб...

— Нездарма між лафэтаў гармат
Фашыстоўскі шалее урад.

VI

..Калёны жандараў...
...Калёны салдат...
...Вуліца апусьцела...
...Шыбеніцы...
...Вясёлы кат...
...Уздрыгвае нейчае цела...
..Трывожная ноч...
..Сьвісткі...
...Шумяць і жывуць рэстораны...
.. Замоўклі гудкі...
Ня клічуць гудкі...
...Чорная здань на экране...
...Істэрыка...
...Рогат...
...Шум...
...Звонкі сьвіст гільотыны...
...Катуюць цела,
Крыжуюць душу
Па новаму стылю...
Ды ярка працоўных паходні гараць...
На вуліцах барыкады...
Рашучая бойка...
І будзе скончана гра
Фашыстоўскага ураду.

VII

Цішэй ад змрочнасьці,
Цішэй
Ад вокамгненнае маркоты,
Нібыта ў шыбы стукаў Швейк, [1])

---

[1]) Швейк—гэта гэрой твору чэскага пісьменьніка Гашэка. „Похождение бравого солдата Швейка". Твор гэты мае некалькі частак. У аднэй частцы аўтар падае Швейка ў расійскім палоне. Вось загэтым не бязгрунтоўна Швейк у маім творы гаворыць аб былой Расеі.

Згубіўшы маршавую роту.
— Так што, дазвольце далажыць,
Ніхто пусьціць ня хоча ў хату...
О, то-ж становішча, скажы,
Нібыта з нашым фэльдкуратам [1]).

— Любіў ён колісьці мяне,
Хоць і прайграў пасьля другому, [2])
І вось прапіўшы ўсё, што меў,
Ён папрасіў аванс пад бога.

— А хто пад бога дасьць аванс?
Усім апрыкраў гандаль гэты...
Гандлююць ім па гэты час
Уладары старога сьвету.

— У „Поўнай чашы“ [3]) ёсьць усё,
Там многа рознага народу...
Напіўся наш вайсковы ксёндз,
Ды перад самым новым годам.

— Пасьля, як цень, пайшоў блудзіць.
У шыбы стукаць несьвядома...
Ніхто у хату ня пусьціў—
Пакуль ня трапіў да знаёмых.

— Назаўтра бачыць:
— Што за чорт!?...
І не чакаў такой прыгоды:
Глядзіць са сьценкі новы год,
А ён-жа лёг у старым годзе.

— Цяпер і я вось так зблудзіў,
Згубіўшы прыстані былыя...
Так што, дазвольце заявіць—
Не пазнаю зусім Расіі!

— Іду, ня ведаю і сам
Куды ісьці... Нібыта злодзей...
Мне ўсё здаецца, што праспаў
Я дзесьці цэлае стагодзьдзе.

— Дзе ад зары і да зары
Спрадвеку турмы муравалі,
Там вялічэзныя муры,
Муры індустрыі паўсталі.

---

[1]) Фэльдкурат—вайсковы ксёндз.
[2]) Гашэк падае фэльдкурата, як п'яніцу і карцёжніка. Калі Швейк быў дзяньшчыком у гэтага фэльдкурата, то гэта духоўная асоба прайграла свайго дзяньшчыка ў карты паручыку Лукашу.
[3]) „Поўная чаша“—назва піўной у Празе, аб якой часта ўспамінаў Швей

— Дзе вокны хатак урасьлі
У межы цемры і праклёнаў,—
Па тэй сталыпінскай Русі
Праходзяць трактараў колёны.

— У тэй пакінутай царкве
Тугу вякоў замкнулі мабыць?
А дзе-ж колега мой цяпер
Агульна-рускага маштабу?

— Яго даўным ужо даўно,
Напэўна, буры пахавалі...
А вось калішніх Балуноў [1])
Я напаткаў і тут ня мала.

— Нібы асьвістаны лясун,
Адзеўшы Юдаўскую сьвітку,
За кожнай вёскаю Балун
Схаваў халодную „бандытку“. [2])

— На ім адыграная гра
Згубіла хворыя дакоры...
Ён сам, як рошчарак пяра
Былой сталыпінскай рэформы.

Цішэй ад змрочнасьці,
Цішэй,
Чым нават цені пералесіц,
Пашоў нячутна бравы Швейк,
Ды затрымцеў халодны месяц.

Гусьцелі моракі палёў...
І што за ліха?!.. Гэткім часам
Балун звар'ёвана панёс
Агонь і порах да калгасу.

— Трымайце злодзея!...
... Хутчэй!.....
.....

.... Балун!... Злачынца!....
.... Стой на месцы!...
.... Трымай!... Трымай!...
.... Не уцячэ!...
.... Хутчэй!... Хутчэй!...
.... Пабег да весьніц!...

---

[1]) Балун— гэрой таго-ж твору. Тыповы кулак. Меў фізычны недахоп—многа есьці. Часта зьядаў порцыю свайго паручыка, за што нёс кару.

[2]) Бандыткай завуць абрэз.

— Які Балун?!.....
Які пажар?!.....
Ачніся!. . Годзе хваляваццa!..
Прабіла восем.... і пара
На працу, мабыць, сабірацца?

* *
*

У нашу эпоху ня месца гульні....
Кіруем уперад надзейна ...
У нашы вялікія, слаўныя дні—
Нэрвовыя людзі, нэрвовыя дзеі.

Як шчасьце, сьпяшым спатыкаць новы дзень
За працай у творчых майстэрнях...
Вялікае кола сусьветных падзей
Дае нам натхненьне і веру.

Затое на даўняй мяжы не стаім...
Няма у нас тэмпаў павольных...
Мы дбаем аб кожным рыштунку сваім
У гмаху вялікай будоўлі.

Жывое імкнецца па-новаму жыць,
Дзе рухнулі вежы старыя,
Дзе колісь на кожнай сялянскай мяжы
Паставіў аўтограф Сталыпін.

Мы з боем наўчыліся крэпасьці браць,
Таму вось ня дзіва, ня цуда,
Што казачным тэмпам у рытмах жыцьця
Растуць карпусы трактарбудаў.

У нашу эпоху ня месца гульні...
Кіруем уперад упарта...
У нашы вялікія, слаўныя дні
Ня сойдзем з грамадзкае варты.

Між дзённае працы ня любім прыкрас,
А ў ночы, калі засынаем,—
Мы сэрцам прымаем сягоньняшні „ТАСС“
Мы радыё-хвалі чытаем.

Ці я над яськямі сумую...

(*Конская элегія*).

Ці я над яськямі сумую,
Ці йду гуляць на паплавы,—
Аднэй вось думкі не ўтаймую,
Яе ня выгнаць з галавы.

Ці дзе заржэ мне жарабіца,
Я думаю: апошній раз;
Нам больш ня прыдзецца любіцца—
Мой гаспадар ідзе ў калгас.

Ці параконны плуг сустрэну—
На сэрца сум наводзіць ён:
Не дачакацца мне на зьмену
Сталёвых трактарных колён.

Ці лёгкі ветрык ледзь павене—
Тугу нагоніць шэптам лес:
Мне не вазіць на рум бярвеньня—
Мяне рыхтуюць на зарэз.

І хоць аблупленаму мясу
Ўсёроўна, дзе ні дагніваць,
Бліжэй да роднага калгасу
Я ўсё-ж хацеў бы спачываць;

Гаспадару застацца другам
І ўзьвесяліць свой конскі дух,
Як гэты друг мой саматугам
Пацягне двухлямешны плуг.

Цяпер-жа мне не дапаможа
Ні мора выплаканых сьлёз,
Ні стан здаровы ды прыгожы—
Адзін мяне чакае лёс:

Галавацяпы заўтра здуру
Тут пагуляць дадуць нажу,
І за сваю гнядую скуру
Апошні раз я задрыжу.

Я галавой кіўну з магілы,
Калі ўжо буду няжывы:
Скурсындыкат, жыві, мой мілы!
Хоць цяжка жыць без галавы.

Вагон табакі

Каласіцца на палетку
Жыта ды пшаніца;
Так на ўзьмежку добра ўлетку
Пад іх шэпты сьніцца.

Аграном сьніць сон прыгожы,
Але тэй парою
Наваліліся на збожжа
Чэрві з машкарою.

Збожжа буйна зелянела,
Ды пасьля пасохла;
Машкара, што збожжа ела,
З маразоў падохла.

Ветры ў коміне скуголяць,
Ліст пажоўклы круцяць;
Аграном Гавака ў поле
Шкоднікаў патруціць.

Хоць ты шуплем сьнег адгортай,
Зьмёрз—дрыжыць сабака;
Вось вагон табакі цёртай
Выпісаў Гавака.

Сьпіць прырода няжывая
Пад абрусам мяккім;
Сам Гавака спажывае
Той вагон табакі.

Рэзкі сівер падыхае,
Да касьцей праймае;
Аграном Гавака чхае
І турбот ня мае.
Так з Гавакавай вось ласкі
Знойдзен спосаб новы:
Чхае ён на абавязкі
І на пастановы.

Так жыла між імі згода

Раскажу я тут пра тое,
Як каморнік землю мераў:
Меў ён справу з беднатою,
А ў кулачкі меў кватэру.

На калгас зямлі нястача,
А ў кулачкі нават лішкі,

Толькі ён таго ня ўбачыў
Праз яечню ды кілішкі.

На спатканьне ласка ласцы:
Ён кулацкага—ні пядзі;
Толькі дзівяцца калгасцы,
Як каморнік з бабай ладзіць.

„Што-ж ён, сволач, не абрэжа?!
І зважаць на нас ня хоча!!
Хіба так пітво ды ежа
Засланіла яму вочы?!“

А каморніку тут ясна,
Што—„дарэмна ў вочы лезуць:
У жанчыны, у няшчаснай—
Што-ж ты знойдзеш тут абрэзаць?“

У сваёй сумленнай працы
Ня крывіў ён ані крышкі:
Скрозь абмераў і абмацаў,—
Не знайшоў ніякай лішкі.

Тэрмін досыць не кароткі
Так жыла між імі згода:
Ля кулацкай цёплай цёткі
Аціраўся ён паўгода.

Ад густой кулацкай пары
Хлопцу вочы засьляпіла,
Толькі, кажуць, акуляры
РСІ яму купіла.

Два каханьні

Жыў на вёсцы кулачок,
А ў яго—каровы.
У саўгасе ж быў бычок
Завадзкі, здаровы.

Яшчэ ёсьць у кулачка
Шмат чаго багата:
У яго была й дачка
Гладкая Агата.

Закахаўся у дачку
Кіраўнік саўгасу.
А чаго-ж глядзець бычку?
Ён ня траціць часу:

Покуль кляўся кіраўнік
У каханьні шчырым,
Дык кароў кулацкіх бык
Адкахаў з чатыры.

Ён ніколі ня пытаў
Бедна ці багата,
І заўсёды сам гатоў,
Як цялячы тата.

Пахаджае па дварэ
Маладзец рагаты;
Ён за працу не бярэ
Аніякай платы.

Задаволена раве
Рызыкант-асілак,—
У рагатай галаве
Ня шукаць памылак.

У глузды яму ня ўбіць
Аніякай сілай,
Што й з каровай нарабіць
Можна шмат ухілаў.

Хай працуе, ён здароў
Хоць у дзесяць столак,
Хай кахае больш кароў
Ды цнатлівых цёлак.

Вось наконт кіраўніка
Погляд болей строгі:
Ён—ці сябар кулака,
Ці, мо', бык бязрогі.

Што кулацкі цягне воз,
Дый не разумее.
Хай накруцяць яму хвост,
Хто круціць умее.

А. Кастэлянскі

Сёньняшні дзень выяўленчага мастацтва БССР

Глыбінныя процэсы, што адбываюцца цяпер у нашай краіне, ставяць перад намі задачу выкарыстоўваньня усіх нашых культурных рэсурсаў з мэтаю прыстасаваньня іх да рэконструкцыйнага пэрыоду, што перажываецца намі.

Выяўленчае мастацтва, зьвязанае тысячаю ручаінаў з тым, што атачае нас на кожным кроку, заклікана зрабіць самае моцнае ўзьдзеяньне на перавыхаваньне псыхоіодэлёгіі шырокіх працоўных мас.

З гэтай прычыны мы лічым вельмі насьпелай пастаноўку некаторых проблем выяўленчага мастацтва БССР і завастрэньне на іх шырокае ўвагі нашай грамадзкасьці.

I

На станкавым мастацтве мне давядзецца спыніцца коратка, бо ў гэтым годзе мы яшчэ ня мелі выстаўкі — агляду нашае выяўленчае продукцыі.

На падставе перагледжанага ў майстэрнях мастакоў БССР у Менску, Гомелі, Маскве ды Ленінградзе можна канстатаваць, што ў іх настроях адбыўся глыбокі і рашучы пералом, і што большасьць мастакоў зьвязвае цяпер свой падыход да рачаіснасьці з тымі вялічэзнымі задачамі, што ставіць перад намі рэконструкцыйны пэрыод нашае прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Нацыянал-дэмократычныя і нацыонал-шовіністычныя тэндэнцыі, якія на гэтым вучастку культуры былі асабліва закасьцянелымі, цяпер канчаткова разьбіты.

Калі яшчэ ў мінулым годзе мастаку, што намаляваў нагога нявольніка-паўстанца, давялося абуць яго ў лапці, каб паказаць яго беларускае паходжаньне, дык сёлета гэта здаецца ўжо анахронізмам.

Наша выяўленчае мастацтва паступова адмаўляецца ад консэрваваньня этнографічных формаў і ад захоўваньня „мясцовага“ колёрыту.

Калі раней мастакі, што хацелі адлюстраваць наш быт, накіроўваліся ў хутары ды мястэчкі, ідэалізавалі часта „уходящих“ людзей, дык цяпер яны шчыльна падыходзяць да тых процэсаў, што адбываюцца ў нашым жыцьці.

Так здарылася з Аксельродам і Горшманам, якія ад тэмы яўрэйскага мястэчка перайшлі да колектыву, гэтак было і з Філіповічам, які ад селяніна на рынку перайшоў да селяніна на трактары.

На апошніх дыплёмных выстаўках нашы студэнты вышэйшага мастацка-тэатральнага інстытуту (вхутэінаўцы), якія не адышлі, праўда,

яшчэ цалком ад руссезанізму, што шчапляўся ім на працягу гадоў, усё-ж бліскуча паказалі новую соцыяльную тэму.

Тэма соцыяльнае навальніцы, перанесенае Беларусьсю ў час польскае окупацыі, з вялікаю праўдзівасьцю і ўмельствам перададзена Аксельродам у карціне, зробленай ім на заказ Музэю Рэволюцыі БССР.

Праўда, у лубкох, якія былі заказаны Белдзяржвыдавецтвам нашым жывапісцам, ня былі цалком ускрыты соцыяльныя процэсы, што адбываюцца ў нашай краіне, мала таксама паказана яшчэ індустрыялізацыя нашае рэспублікі.

Мы, аднак, маем падставу чакаць, што бліжэйшая выстаўка нам пакажа шмат сьпелага ў гэтым кірунку, і ня толькі ў сэнсе выбару сюжэту, але і ў сэнсе шуканьня новае композыцыйнае і стылявое ўстаноўкі

II

Будаваньне соцыялістычнага грамадзтва шырока ставіць перад намі проблему прасяканьня мастацтва ва ўсе галіны нашае культуры і быту, пачынаючы ад нашае індустрыі, з архітэктуры, клюбаў і канчаючы афармленьнем нашае кніжкі, нашага хатняга быту, нашых сьвяткаваньняў і г. д.

Адсутнасьць органічнае ўвязкі паміж тэхнічным разьвіцьцём краіны і афармленьнем продукцыі прамысловасьці, шырока разгорнутае жыльлёвае будаўніцтва, што ажыцьцяўляецца ў стылі старое бясьсільнае архітэктуры; перабудова нашага быту пры яго афармленьні пад старыя мяшчанскія густы—гэты разрыў паміж пастаўленаю задачаю і формаю яе ажыцьцяўленьня, пагражае агульнаму разьвіцьцю нашае соцыялістычнае культуры.

Пачнем з нашае архітэктуры: процэс шырока разгорнутага будаўніцтва захапіў нас зусім неспадзеўкі.

У нас няма ні жывога кадру архітэктараў, якія-б плянавалі усё наша будаўніцтва, ні арганізованага грамадзкага суджэньня па пытаньнях патрэбных нам пабудоў, іх стылю і г. д.

Будаваньне нашае першай Усебеларускае сельска-гаспадарчае выстаўкі, што мае для нас такое вялізарнае значэньне, праводзіцца бяз жаднага архітэктурнага пляну. Шмат якія з яе аддзелаў і павільёнаў будуюцца рэакцыйнымі адсталымі архітэктарамі.

Як прыклад, можна паказаць, што калі прадстаўлены проект пабудовы аркі галоўнага уваходу, зроблены зусім ня гэтак, як вымагаюць прынцыпы новае архітэктуры, з шмат якімі дадатковымі элемэнтамі „аздабленьня“, па сутнасьці, глыбока бязгустоўнымі, быў забракован групаю перадавых мастакоў ды архітэктараў, ён усё-ж такі быў пасьля прыняты комісіяй, у якую ўваходзілі спачувальнікі непатрэбнага „аздабленьня“. І гэта ў той самы час, калі тут-жа быў прадстаўлен проэкт, у пляне конструкцыйнае архітэктуры, каторая, не зьяўляючыся яшчэ пролетарскай, як яе назваў,—перастараўшыся, адзін

мастацтвазнаўца [1]), ўсё-ж больш блізкая нам сваімі шуканьнямі новага соцыяльнага тыпу будынку, у якім прасторавыя проблемы і абыймо разьвязаны ў сувязі з яго утылітарнаю сутнасьцю.

Таксама стаіць справа і з мастацкім афармленьнем выстаўкі. Да работы ня прыцягнута знадворку ніводная буйная мастацкая фігура, знаёмая з гэтаю справаю, ня ўцягнута і нашая мастацкая моладзь, у якое больш сьвежы падыход да рэчаў.

Вакол выстаўкі кешкаецца ўся наша дамаслая мастацкая сіла на чале з мастаком, выхаваным у стылі „Модэрн", які дапасоўвае гэты стыль да „навейшага" мастацтва.

Можаце ўявіць, які провінцыялізм і адсталы выгляд будзе мець гэтая выстаўка ў сваім надворным афармленьні. Мы ілюстравалі палажэньне адным прыкладам сельска-гаспадарчае выстаўкі. Можна яшчэ паказаць на шэраг толькі-што пабудованых клюбаў, як, напрыклад, клюб мэталістых, які мае вельмі нікчэмны і непрэзэнтабельны выгляд.

Ня лепш у нас стаіць справа з унутраным афармленьнем клюбаў, чырвоных куткоў і г. д. З першага клюбу, які вы наведаеце, на вас павее няпрытульнасьцю ды казёншчынай.

Характэрным зьяўляецца наступны факт: УЦСПС наладжвае ў маі гэтага году ў Парыжы выстаўку „выяўленчае мастацтва ў клюбах СССР". На гэтай выстаўцы будзе прадстаўлена як самадзейная праца клюбаў, так і праца мастакоў-прафэсіяналаў па афармленьню клюбаў.

Намер УЦСПС паказаць афармленьне клюбаў у цэнтры мастацкае культуры заходняе Эўропы паказвае, што ў нас вялікія дасягненьні ў гэтай галіне.

Аднак, БССР, якая таксама запрошана да ўдзелу на гэтай выстаўцы, зусім няма чаго экспонаваць, бо нашы клюбы могуць пахваліцца поўнаю адсутнасьцю выяўленчага афармленьня.

Паказальным зьяўляецца, аднак, і другі факт.

Калі цэнтральнаму Дому Селяніна былі зроблены па яго заказу для ілюстрацыі перавагі колектыўнае гаспадаркі, панно у якіх мастак здолеў спалучыць мастацкасьць выкананьня з навочнасьцю і яснасьцю пастаўленай пропагандыцкае задачы, дык гэтыя панно ня былі прыняты, таму што ў іх „ненатуральныя фарбы". Адначасна былі з захапленьнем прыняты антымастацкія малюнкі на тую-ж тэму. І гэта факт не адзіночны. Паняцьці, што склаліся ў шмат якіх клюбных працаўнікоў пра прыгожае і няпрыгожае, глыбока абывацельскія і адсталыя.

Гэтая-ж адсталасьць праяўляецца ў нас у пытаньнях афармленьня продукцыі прамысловасьці і рэчаў масавага ўжываньня.

Возьмем, як прыклад, нашую мэблявую вытворчасьць, дзе пануе дагодлівасьць густам і запатрабаваньням паабывацельску настроенага спажыўца, які патрабуе выкрунтасаў на гзымсе ды іншае пошласьці.

---

[1]) М. Шчакаціхін.—„Новы Менск". Чырвоная Беларусь № 2.

Шмат гаварылася ў нас пра фабрыку „Адраджэньне“, якая выпрацоўвае аляпаватыя і мішурныя цацкі, накшталт опэрных цыганоў і да г. п.

Наогул усе галіны нашае прамысловасьці падпарадкуюцца толькі законам попыту і прапановы, выпрабляючы чужыя і шкодныя нам па аформленьню рэчы.

Гэтая варожая нам, мяшчанска-абывательская эстэтыка прасякае і тую галіну прамысловасьці, якая пачала ўжо ісьці наперад, у нашую паліграфічную вытворчасьць.

Вельмі часта ў нас і ў галіне аформленьня кніжкі ды яе ілюстрацый пануе густ абываталя. У гэтай галіне, праўда, часта выкарыстоўваюцца аўтэнтыкі лепшых мастакоў Саюзу, але гэта ў пераважнай большасьці робіцца няўмела, што толькі псуе справу, уносячы ў аформленьне кніжкі элемэнты эклектызму і сьляпога пераймальніцтва.

Зьявіліся і асобы, якія, карыстаючыся непадрыхтаванасьцю грамадзкае думкі, пачалі выдаваць нягустоўныя, пошлыя і няўмелыя рысункі за новае слова ў мастацтве.

Патрэбна плянамерная праца па популярызаваньню мастацтва, як элемэнту быту ды культуры, патрэбна жорсткае змаганьне з мяшчанскім мастацтвам і падрыхтаваньне найбольш сьвядомай часткі пралетарыяту да ўспрыйманьня сапраўднага мастацтва. Але тут мы спатыкаем дзьве надзвычайна вострыя проблемы: пытаньне пра нашыя музэі ды выстаўкі і пытаньне пра новыя мастацкія кадры.

III.

Мастацкі аддзел беларускага музэю пачаў складацца з сабранае яшчэ на пачатку рэволюцыі ў панскіх маёнтках рознае рознасьці.

Тут былі і портрэты польскіх ды літоўскіх маёнткаў, аздобленыя гэрбамі роду, і мэбля з інкрустацыяй, і дарагі парцалян французскіх і рускіх заводаў. Папаўненьні з музэйных фондаў Масквы і Ленінграду далі другарадныя карціны, пачынаючы ад самых нудных прадстаўнікоў расійскае акадэміі часоў заняпаду і канчаючы некаторымі пэйзажыстымі канца XIX стагодзьдзя. Была яшчэ прадстаўлена даволі значная колькасьць дрэнных копіяў старых майстроў, пераважна голяндцаў.

Пад уплывам „летапісцаў“ нашага мастацтва, якія бедавалі пра тое, што Расія адабрала ад Беларусі Дастаеўскага (!!!) у галіне літаратуры, Бялыніцкага-Бірулю і Крыжыцкага (невялікая страта) у галіне жывапісі, пачалі адшукваццa працы мастакоў, беларусаў па паходжэньню. Тагды-ж на сьценах музэю знайшоў сабе прытулак славуты абшарнік—лібэрал Вайсенгоф.

Апошнім часам у гэтым музэі адчыніўся пакой новага беларускага мастацтва. У гэтым пакоі поруч з мастацкімі працамі вісяць і антымастацкія, але на якіх старанна выпісаны этнографічныя гарнітуры.

Ці-ж можа гэты музэй, пры поўнай адсутнасьці сыстэмы і якой-бы там ні было растлумачальнай працы вакол яго матар'ялаў, і пры адсутнасьці аддзелаў новага быту і культуры, служыць месцам маса-вага эстэтычнага перавыхаваньня.

Для таго, каб зрабіць музэй ня мертваю скарбніцай, а месцам жывога паказу, трэба выкінуць з яго шмат завалі і наладзіць пляна-васьць у яго працы.

Няма жаднае плянавасьці і ў нашых мастацкіх выстаўках. Ужо праведзена тры усебеларускія выстаўкі, але ўсе яны мелі выключна парадны, казённы характар.

Рабочыя мала наведвалі гэтыя выстаўкі, а калі-б і наведвалі, дык у гэтай рознароднасьці кірункаў, у гэтым разнабоі, які так характэран для нашага маладога мастацкага руху, яны мала-б атрымалі. Бязу-моўна мэтазгодней наладжваць выстаўкі па групах, складзеных з асоб блізкіх адзін аднаму па ідэолёгічна-формальнаму сьветапогляду, што надало-б выстаўкам больш прынцыповы і адказны характар.

Гэта аніяк не перашкодзіць консолідацыі мастацкіх сіл, якая пойдзе па іншай лініі, і процэс якое павінен пачацца.

Для таго, каб прасунуць нагэтулькі высьпелае перамяшчэньне цэнтру цяжару нашага выяўленчага мастацтва у бок мастацкага аформленьня быту, трэба наладжваць таксама выстаўкі бытавога мастацтва.

Апрача гэтага, трэба шырока паставіць пытаньне пра паказ нашага мастацтва беларускай провінцыі. Працоўнае насельніцтва Віцебску, Гомлю, Магілеву і, па магчымасьці раёнаў суцэльнае колектывізацыі, павінна бачыць нашы дасягненьні ў галіне выяўленчага мастацтва і атрымаць на іх вядомую эстэтычную зарадку.

IV.

Нашаму выяўленчаму мастацтву патрэбна, як і іншым галінам культуры, папаўненьне і зьіначаньне за лік пролетарскіх элемэнтаў, патрэбна свая кадравая база.

Толькі новыя кадры здолеюць уліць новы дух у наша выяўлен-чае мастацтва і зьвязаць яго цалком з запатрабаваньнямі рэконструк-цыйнага пэрыоду.

У нас пытаньне пра кадры стаіць пад небясьпекаю. З аднаго боку, у нас зусім адсутнічае падлік тых сіл, якія канчаюць мастацкія ВНУ у Маскве і Ленінградзе і якія на тры чвэрткі застаюцца ў гэтых сталіцах.

Пры індустрыяльным і тэхнічным росьце нашай рэспублікі гэта пагражае нам тым, што нашая прамысловасьць застанецца бяз сіл мастацкага абслугоўваньня.

Наш мастацкі тэхнікум зусім ня можа даць нам тае жывое сілы, якая патрэбна нам для аднаўленьня нашага выяўленчага мастацтва.

Гэты тэхнікум бяз стырна і ветразяй, ня маючы жаднае ўстаноўкі і аніякага пляну. Група маладых мастакоў, што скончылі гэты тэхнікум, не разьвеяла сьвежачым подыхам задушнае атмосфэры выкладаньня ў нашай сямігодцы і ні ў якай галіне вытворчасьці. Як мы даведваемся з пастановы апошняе акадэмконфэрэнцыі гэтага тэхнікуму—гэта таму, што ў іх ня было выкладчыка... па псыхолёгіі.

Як бы там ні было, у гэтым тэхнікуме патрэбна глыбокая пераорганізацыя і прыстасаваньне яго да тых галін прамысловасьці, якія ў нас разьвіты.

Яшчэ горай у нас стаіць справа з тымі мастацкімі кадрамі, каторыя выходзяць з самае працоўнае гушчы, з самадзейных мастацкіх груп, якія працуюць у клюбах або вакол газэт.

У БССР няма амаль ні ў водным клюбе гурткоў выяўленчага мастацтва. Гэта адлюстроўваецца з аднаго боку, на афармленьні саміх клюбаў, а з другога—на росьце таго пролетарскага маладняка, з якога здолеў-бы комплектавацца наш тэхнікум і ў далейшым наша мастацкая ВНУ.

Адсутнасьць новых кадраў перашкаджае плянамернай рабоце па пераабсталяваньню быту пры ўдзеле выяўленчага мастацтва.

Патрэба ў мастацкім перавыхаваньні шырокіх мас, у мастацкім перааформленьні быту і ў стварэньні новых пролетарскіх кадраў мастакоў насьпела. Яе нельга ні адтэрміноўваць, ні замазваць.

Наша грамадзкасьць павінна шырока рушыцца насустрач гэтаму вучастку фронту.

Аднэю з найбольш важных перадумоў у гэтым пытаньні зьяўляецца політыка плянаваньня Наркомасьветы і яго органу Галоўмастацтва ў галіне выяўленчага мастацтва, політыка, якая цяпер амаль адсутнічае.

КНІГАПІС

Роман вялікага пераломy

(Бузько „Чайка“ Д. В. У. 1928 г. Бал. 232. Ціна 1 руб. 80 *коп.).*

1.

На Ўкраіне мелася пэўная глеба для таго, каб даць контррэволюцыі магчымасьць змагацца ня толькі пад выразна рэакцыйнай шыльдай, але і пад шыльдамі нацыянальнага вызваленьня, як. напрыклад, „Украінська Держава“, Ўкраінська „Директория“, УНР, УС.-Д., УС.-Р. і г. д. і г. д. Усе гэтыя організацыі ці ўрады імкнуліся аб‘яднаць украінскі народ пад шыльдай монархіі (гетьман) ці рэспублікі (УНР і інш.) такім чынам, каб галоўную ўладу перадаць заходня-эўропейскаму капіталу. Вядома, што для такога аб‘яднаньня, папершае, трэба было затушоўваць клясавае змаганьне, каб паны маглі вольна гаспадарыць у „сваіх“ маёнтках, а капіталістыя—на заводах і фабрыках, і каб гэткім чынам рабочыя і бяднейшая частка сялянства атрымалі сіло, здабытае ўласнымі рукамі.

Пусканьне патрыотычнага пылу ў вочы шырокім пластом рабочых, бядняцкіх і серадняцкіх мас дало магчымасьць пэўнай частцы гэтых мас далучыцца часова да ўкраінскіх „вызваленцаў“, пакуль яны ня ўбачылі іх сапраўднага твару. У романе „Чайка“ надзвычай колёрытна паказана паступовае разбурэньне буржуазных „урадаў на гадзіну“ і зьмена псыхолёгіі іх арміі, узьнятых спачатку настроем псэўдопатрыотызму. Першая „украінская“ улада, яскрава абмалёваная аўтарам, гэта гэтманшчына. Хістаньні гэтай улады паміж Нямеччынай і Антантай, пошукі орыентацыі, газэты, якія выдаюцца пад „Matin“, „цо хтось великий стоїть за спиною“, рабская паслужлівасьць перад чужаземцамі (інцыдэнт з аптэкарам, якога лічылі нібы за прадстаўніка Францыі)—усё гэтае малюе аблічча гэтай „дзяржавы“. Гэтманшчына, кажа аўтар, зрабіла Кіеў лягерам добраркіі і дала гэтым магчымасьць узьняцца вялікаму процігэтманскаму руху. На зьмену гэтманшчыне прыходзяць паўстанцкія атрады, аб‘яднаныя ідэямі „лепшай будучыны“. Бо „надвечір... посунулі повстаньски полки... Хто міг подумати, що прийде така імпозантна, така грізна сила? Ось—селянскі; один за одним, в кожухах, шинелях, ідуть струнками лавами. І в кожного червона стрічка на кожусі, на свитині, на шапці... Чайці хотілося сміятися з радости, він ледве стримував сльози щастя“ (160). Але разбурэньне пачалося ў наступную раніцу. „На ранок мав прийти кінец національній визвольній боротьбі й початок нової—горної, зрадницкої сторінки в історіі національного руху на Україні“ (160).

Зьяўляючыся найбольш моцнай з украінскіх нацыяналістычных груповак, пятлюраўшчына і разбуралася даўжэй за іншыя групоўкі. Сапраўдны твар пятлюраўшчыны выявіўся таксама, калі галоўнымі ўладарамі на Ўкраіне сталі чужаземныя арміі, і калі ўкраінскі патрыотызм з шыльды новай і прыгожай зрабіўся шыльдай праплёванай, запэцканай, абарванай і прададзенай Антанце. Бесканечныя эшалёны ўцекачоў, растрэлы работнікаў-бальшавікоў, спэкуляцыя начальства, цягнік УНР, які ўяляў з сябе пасьля ўсю яе тэрыторыю і па-над усім гаспадарскае вока чужаземцаў—вось тое, што паказвае аўтар у часы распаду пятлюраўшчыны.

Аўтар сочыць у сваім романе за распадам ўкраінскага „патрыётызму“ да поўнага яго зьніштажэньня. У той час, як у Савецкім Саюзе ідзе ўжо шпаркае будаўніцтва, украінскія „патрыоты“ адыгрываюць ролю шпіёнаў заходня-эўропейскіх дзяржаў. Пры відзе сапраўдна-страшнага ворага—пралетарыяту, яны забываюць свае адзнакі па партыях і нацыянальнасьцях. Украінцы блёкуюцца за межамі з вялікадзяржаўнікамі (Оксана, Талочка—кузэн Вольдэмар) і разам змагаюцца з пролетарскай рэволюцыяй. Пры гэтым яны змагаюцпа ўжо нават не за свае „ідэі на хвіліну, а выконваючы волю сваіх гаспадараў—заходня-эўропейскага капіталізму. Маска нацыяналіз-

му скінута поўнасьцю; застаецца самае карэннае—клясавыя супярэчнасьці, у якіх псэўдо-патрыёты адыгрываюць ролю лёкаяў міжнароднага капіталу ў змаганьні яго з першай краінай пролетарыяту.

2.

Разьвязаньне сюжэту ідзе па дзьвюх лініях—Чайкі і Цімона. Нібы дзьве істужкі віюцца гэтыя дзьве асобы на працягу ўсяго роману, то зьліваючыся разам то, разыходзячыся. Разьбягаюцца жыцьці Цімона і Чайкі, набліжаюцца раптоўна, ізноў уніякаюць адно аднаго і г. д. і г. д. І нібыта недарэчна гэта, але варта толькі ўважліва прыгледзецца, і стануць зразумелымі тыя прычыны клясавага і соцыяльнага парадку, якія кіруюць гэтымі рэйкамі—жыцьцямі і іх рухам.

Чайка—украінскі інтэлігент, папаўшы за свае палітычныя выступленьні на катаргу, ён ўцякае адтуль за межы, дзе і жыве да лютаўскай рэволюцыі. Будучы сынам настаўніка, Чайка вядзе рэволюцыйную пропаганду ў вёсцы, дзе мае вернага дапаможніка ў асобе сялянскага хлапчука Цімона. Чайку пасылаюць на катаргу, а Цімон бярэцца за гаспадарку. Іх жыцьці разыходзяцца, але маленькі хлопчык носіць у сабе мары аб былым настаўніку. Спатыкаюцца яны пасьля лютаўскай рэволюцыі на сходзе. Яны абодвы захапляюцца рэвоцыйным змаганьнем. Але тут моцна адчуваецца іх клясавая нятожсамасьць. З гэтага моманту мы лічым патрэбным прасачыць іх жыцьцё паасобку, каб даць па магчымасьці поўны аналіз аднаго і другога тыпу.

Чайка ня мае сталых поглядаў на рэволюцыю. Ён разумее яе па кнігах і кажа, што ў часы абвостранага клясавага змаганьня пасьля лютаўскай рэволюцыі ён больш за ўсё хацеў бы закапацца ў соцыяльныя навукі ў публічнай бібліотэцы. Ён хоча ў той час „читати й читати—всі газеты, що зараз „посипалися", всі книжки, що можуть допомогти розібратися в цій каші..." (73). Ён ня любіць рашучых дзей. Вайна выклікае ў яго жах, але ён ня думае аб тым, каб вайну нацыянальную ператварыць у грамадзянскую. Нават калі набліжаўся Кастрычнік, дык „Чайці робилося моторошно, коли він уявів собі майбут море криві" (100). Чайка зьяўляецца эсэрам. У хуткім часе пасьля лютаўскай рэволюцыі ён убачыў прадажнасьць эсэраўскай партыі. Гэта неакрэсьленасьць поглядаў і нерашучасьць і зьяўляецца бліжэйшай прычынай далейшых паводзін Чайкі. Так ён кажа, што „треба або зовсім ад всього усунутися, або бути з тими, кого цькують" (104). І з гэтага вынікае, што ён ідзе з украінскімі нацыяналістымі, якія на самай рэчы толькі спэкулюць імем „вільної України". У нацыянальным пытаньні Чайка канчаткова заблытаўся. Яму крыўдна за ўкраінскую мову, якую хочуць зьнішчыць, бо ён сам лічыць сябе ўкраінцам. „Час од часу в ньому прокидалася й національная сьвідомість" (85). Аднак замест таго, каб прааналізаваць гэту сьвядомасьць, „він старанно душив ці почуття. Й без них тяжко було в собі розібратися" (85). У яго вырываецца лаянка. „Й чому я не народився великоросом? Все було-б так ясно, так просто"... (120). З гэтых поглядаў вынікае і тое, што ён актыўна працуе на гэтманшчыну, на пятлюраўшчыну. Аўтарская рэмарка аб гэтым кажа, што „заплутавшися остаточно у виру подій, він беспорадно віддався на волю свойго найближчого оточення—одеського „українського громадянства" (125).

Яго інтымнае жыцьцё прыводзіць яго таксама да шмат якіх „ляпсусаў", дзякуючы яго непарушным і ў той-жа час вельмі спрэчным прынцыпам. Ён пакутуе чатыры гады з прычыны таго, што хацеў быць „щирим" і мець дзіця, якое ва ўмовах эміграцыі было надта не да-рэчы. Ён жэніцца ў другі раз з жанчынаю, з якой ён ня мае нічога супольнага ў поглядах. Будуючы мары аб жонцы, якая была-б яго таварышам у жыцьці і працы, ён кажа, аднак, што „такий юнацький омріяний шлюб є майже неможливий випадок цілковитої взаємної припасованости, так фізіологічної, як і психічної. Що чекати на такий випадок можна ціле життя марно. Отже—на практиці трэба миритися з тим, що трапиться, йти на компроміс, роблячы з нього по змозі щось подібно до мрії"[1]) (122). Гэтыя некалькі радкоў зьяўляюцца поўным выражэньнем ідэолёгіі Чайкі, бо ўсё, куды ён ні пападаў, усё хацеў зрабіць ён „подобним до мрії". У гэтым прычына захапленьня Чайкі лютаўскай рэволюцыяй, у гэтым-

[1]) Курсыў наш А. Ц.

жа прычына захапленьня яго пятлюраўшчынай і наўмысьля заплюшчваньне вачэй на яе разлажэньне. Нерашучасьць—галоўная адзнака Чайчынага характару, заблытанасьць—галоўная адзнака яго сьветапогляду. Адзначыўшы гэты комплекс псыхолёгічных зьяў Чайкі, як індывідууму, ня цяжка зразумець і соцыяльную сутнасьць Чайкі, як тыпу. Бясспрэчна, што гэта—інтэлігент, які ня мае сталай сувязі ні з воднай клясай. Роман яскрава малюе ператварэньне псыхолёгіі заблытанага ў падзеях Чайкі ў псыхолёгію сапраўды рэволюцыйную.

Побач і паралельна з тыпам Чайкі ў романе фігуруе тып Цімона, тып досыць акрэсьлены. Цімон—бедны вясковы хлопец, політычны вучань Чайкі. На гэтых двох тыпах—Чайкі і Цімона—можна яскрава прасачыць усьведамленьне рэволюцыі рознымі клясавымі прапласта ваньнямі насельніцтва. Ужо з лютаўскай рэволюцыі пачынаецца разыходжаньне Цімона са сваім настаўнікам. Лінія Цімона компромісаў ня ведае. Для яго на першым месцы стаіць клясавае вызначэньне. Калі ў пачатку рэволюцыі ён хістаецца на фронце, якую заняць позыцыю, бо баіцца здрадзіць, дык у далейшым пад уплывам рэволюцыйных хваляў ён перастае хістацца і слухае свайго клясавага пачуцьця якое загадвае яму йсьці з бальшавікамі. Калі Чайка кажа яму аб сваіх марах пра рэволюцыю (тады яшчэ лютаўскую), дык Цімон дае зусім правільную ацэнку яе. Мы бачым яго ў падпольнай бальшавіцкай організацыі, у паўстанцкім атрадзе і г. д. Галоўныя мары Цімона, што да жыцьця, блізкага да яго, гэта організаваць комуну ў вёсцы. Ён ня можа толькі ўвязаць сваё інтымнае жыцьцё, а менавіта свае дачыненьні да жанчыны, з рэволюцыйнай і грамадзкай працай. Гэта прыводзіць яго ў далейшым да шмат якіх памылак. Характарызуючы Цімона агулам, трэба заўважыць, што гэта тып вельмі каштоўны для рэволюцыі і для сучаснасьці, а менавіта чалавек з надзвычай моцным клясавым чуцьцём, з моцным усьведамленьнем свае клясавае існасьці і ролі ў жыцьці.

Два гэтыя тыпы, пераплятаючыся паміж сабой у жыцьці, даюць яскрава-конкрэтнае ўяўленьне аб тым, як здаровая пролетарская ідэолёгія перамагае інтэлігенцкую ідэолёгію, заблытаную і неакрэсьленую, падпарадкуючы яе ідэалам пролетарыяту.

3.

Аўтар выказвае надзвычайную ўпэўненасьць у канчатковай перамозе пролетарыяту. Вынікам гэтага оптымізму зьяўляецца той бясконца каштоўны, тыпова ўкраінскі гумар, які можна бачыць на працягу ўсяго роману.

Роман Бузька разьвязвае ў літаратуры адну з найактуальнейшых проблем—адносіны інтэлігенцыі да рэволюцыі. Вядома, што поступ рэволюцыі раскалоў інтэлігенцыю на часткі—якая ідзе з рэволюцыяй і якая ідзе супроць яе. Кажучы больш падрабязна—на частку, якая адкрыта перайшла ў лягер буржуазіі, і частку, якая пад кіраўніцтвам пролетарыяту будуе разам з ім першую краіну соцыялізму. Аднак вялікая частка інтэлігенцыі засталася на „сярэдніх позыцыях“, не паказваючы свайго ідэёвага аблічча. Можна было думаць з аднолькавым посьпехам, што яна спачувае рэволюцыі, і гэтаксама, што яна тоіць у душы думкі аб хутчэйшым аднаўленьні старога парадку. Бузько ў сваім романе зрывае маску з гэтакай інтэлігенцыі і паказвае адзін пласт яе (Чайка), які, дзякуючы заблытанасьці поглядаў, часова скочваецца да пятлюраўшчыны, які „заминив фарватер подій й хвилею його прибило до берега, де він загруз у трясовині“ (178), але які можа і хоча ўсё-ж ісьці нага ў нагу з пролетарыятам, і другую частку яе, якая па істоце сваёй ніколі ня можа ўсьвядоміць і прыняць рэволюцыі (Харченко, Вольдэмар, Оксана і інш.). Роман люструе пералом лепшай часткі інтэлігенцыі, якая пад уплывам пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва ўпэўнена і сьвядома далучаецца да пролетарыяту. **Ал. Цітоў.**

Рэдагуе **Рэдколегія** *Выдае* **„Узвышша“**

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1930 ГОД

НА ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І КРЫТЫКІ

УЗВЫШША

„УЗВЫШША“ друкуе мастацкую творчасьць беларускіх ды іншакраёвых пісьменьнікаў, шырока высьвятляе пытаньні поэзіі і наогул усіх галін мастацтва, адгукваецца на выдатнейшыя праявы літаратурнага, кніжнага і мастацкага жыцьця.

„УЗВЫШША“—лепшы дапаможнік настаўніку беларуск. літаратуры.

„УЗВЫШША“ мае сваімі супрацоўнікамі выдатных профэсароў і тэорэтыкаў мастацтва, як беларускіх, гэтак і іншакраёвых.

Ва „УЗВЫШШЫ“ за 1930 год будуць зьмешчаны романы, аповесьці, апавяданьні, п'есы: Бядулі З., Вайскопфа Ф., Гарэцкага М., Гушчы Т. (Якуб Колас), Калюгі Л., Крапівы, Лужаніна М., Мрыя А., Пратасэвіча І., Чорнага К., Шашалевіча В. і іншых.

Ва „УЗВЫШШЫ“ за 1930 год будуць зьмешчаны поэмы, вершы, сатыры: Глебкі П., Дарожнага С., Дубоўкі Ўл., Жылкі Ўл., Кляшторнага Т., Крапівы, Лужаніна М., Маракова В., Пушчы Яз., Трыкліні Т., Хадыкі Ўл. і інш.

Ва „УЗВЫШШЫ“ за 1930 год будуць зьмешчаны крытычныя досьледы, артыкулы, манографіі: Адамовіча Ант., Атраховіча К., Бабарэкі А., Барычэўскага А. І., проф., Бярозкі Ю., Вазьнясенскага А. Н., проф., Васілені А., Вольскага Віт., Дзяржынскага Ўл., Дубоўкі Ўл., Замоціна І. І., проф., Іпалітава-Іванава М., проф. (Масква), Каладзе К. (Грузія), Кудзера Я., Кундзіша К. (Масква), Купцэвіча Ф., Лёсіка Я., Мачульскага В., Ордзубадзкага М. С. (Азарбаджан), Плашчынскага Яз., Плашчынскага Ізыдара. Пушкарэвіча К. (Ленінград), Пэрго Ф. (Фінляндыя), Равенскага М. (Масква), Сааруні Ц. (Масква), Скрыблюкаса І. (Масква), Сьнежкі З., Тайзарашвілі Г. (Масква), Трыера Л., Тураўскага Т., Туянца В., Хлябцэвіча Аўг. (Масква), Чарэнца (Армэнія), Шлюбскага А., Шынклера Хв., Яра, Г. Яруш і інш.

УМОВЫ ПАДПІСКІ НА ЧАСОПІСЬ „УЗВЫШША“ У 1930 Г.

I	абонэмэнт—часопісь на	1930 г. (10 кніг)	5 р. — к.
II	„ „ „	½ 1930 г. (5 кніг)	3 р. — к.
III	„ „ „	1 месяц 1930 г. (1 кніга)	— р. 70 к.
IV	„ „ „	1930 г. і комплект за 1929 г. (20 кніг)	9 р. — к.
V	„ „ „	1930 г. і комплект за 1928 г. (16 кніг)	8 р. — к.
VI	„ „ „	1930 г. і комплект за 1927 г. (16 кніг)	7 р. — к.
VII	„	комплект часопісі за 1929 г. (10 кніг)	5 р. — к.
VIII	„ „ „ „	1928 г. (6 кніг)	4 р. — к.
IX	„ „ „ „	1927 г. (6 кніг)	2 р. — к.
X	„	часопісь на 1930 г. і комплект за 1927 г., 1928 г. і 1929 г. (32 кнігі)	13 р. — к.

ДАЕЦЦА ТАКАЯ РАСТЭРМІНОЎКА:

1) па абонэмэнтах I, II, VII, VIII, IX—задатак 2 рублі і штомесячна па 1 рублю;

2) па абонэмэнтах IV, V, VI—задатак 3 рублі і штомесячна па 1 руб.;

3) па абонэмэнту X—задатак 5 рублёў і штомесячна па 1 рублю.